№ 29 (579) 7 жніўня 2008

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## 1000-ы нумар «НН»: 1906–2008

Юлія Дарашкевіч, Павал Севярынец, Наста Азарка, Андрэй Хадановіч, Марыя Роўда, Андрэй Павач, Віталь Тарас, Алег Дзярновіч, Андрусь Храпавіцкі, Тацяна Барысік, Аляксей Чубат, Павал Касьцюкевіч, Алесь Белы, Франц Сіўко, Вольга Бабкова, Адам Глобус, Аляксандар Фядута, Раман Мамчыц, Руслан Равяка, Наталка Бабіна, Алесь Кудрыцкі, Андрэй Лянкевіч, Зьміцер Панкавец, Сямён Печанко, Андрэй Расінскі, Лёлік Ушкін...


### У НУМАРЫ

**Вылезла ўсё**

Сацыял-дэмакраты зьнялі палітвязьня Аляксандра Казуліна з пасады старшыні партыі і адсунулі Вольгу Казуліну і Ігара Рынкевіча ад кіраўніцтва. На чале БСДП(Г) умацавалася група старых партыйцаў. **Старонка 3.**

**Алімпіяда ў «Птушыным гнязьдзе»**

Ад Масквы-1980 і Лос-Анжэлеса-1984 ніводная іншая Алімпіяда не выклікала такой неадназначнай рэакцыі. **Старонка 6.**

**Дыктатура ў тэлеэфіры**

BBC і Аль-Джазіра зьнялі грунтоўныя рэпартажы пра Беларусь. **Старонка 11.**

**Лунінецкі Эдып**

і іншыя навіны рубрыкі «Аб усім патроху». **Старонка 21.**

**Дыярыуш Азаркі**

Упартасьцю адной дзяўчыны малы горад усьведамляе абсурднасьць існага парадку. Пра сваё цікавае пакліканьне піша Наста Азарка зь Нясьвіжу. **Старонка 8.**

**Падарожжа на Радзіму герояў**

Тут гадаваліся Гадлеўскі і Каліноўскі. Піша Андрэй Павач. **Старонка 12.**

**Некалькі пушчанскіх гісторый, запісаных у Івенцы**

Піша Алесь Белы. **Старонка 17.**


# Па сьлядах аднаго міфу

Распаўсюджаны міф пра тое, што апазыцыя страшна адарваная ад народу, цалкам аспрэчвае сваім прыкладам глыбачанін Яраслаў Берніковіч. Ужо за першыя тры дні працы ініцыятыўная група лідэра нацыянальнага кола з Глыбокага сабрала тысячу подпісаў. Уся кампанія праходзіць выключна на беларускай мове.

«Для мяне самога такі пасьпяховы пачатак кампаніі быў шокам, — дзеліцца ўражаньнямі Яраслаў. — Згадваю, што нават падчас прэзыдэнцкіх выбараў мы зьбіралі за Домаша і Мілінкевіча ў лепшым выпадку 1300—1500 подпісаў за месяц. А сёлета вось такая актыўнасьць».

У ініцыятыўную групу Яраслава Берніковіча ўваходзяць 28 чалавек, хаця, па прызнаньні самога актывіста, подпісы зьбіраюць далёка ня ўсе. Дый з трох раённых цэнтраў выбарчае акругі — Глыбокага, Докшыц, Вушачы — актыўная праца вядзецца толькі ў Глыбокім.

У Вушачу пасьля шостай вечара прыяжджаюць сябры ініцыятыўнай групы з Наваполацку. Хочуць выставіць пікет і ў Докшыцах. На сёньняшні дзень за патэнцыйнага кандыдата на мандат у Палаце прадстаўнікоў сабрана каля 3600 подпісаў — найлепшы вынік у краіне. Кандыдаты-лукашэнкаўцы далёка адстаюць.

«Гэта ўжо ня першая мая выбарчая кампанія, але такая зычлівасьць

**Яраслаў Берніковіч**

нарадзіўся ў 1966 годзе ў вёсцы Варанцы (Глыбоччына). Скончыў Бабруйскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Служыў на Далёкім Усходзе (1987—1993). Працаваў на розных пасадах у Глыбокім. У Партыі БНФ ад 1999 году.



Дзеўчына з Глыбокага падпісваецца за кандыдата ад апазыцыі.

і спагада з боку людзей назіраецца ўпершыню. Падчас абыходу кватэр амаль кожны імкнецца выказаць сваю падтрымку», — праціргвае Я.Берніковіч.

Актывіст ужо балятаваўся на парлямэнцкіх выбарах у 2004 годзе. Першапачаткова яго кандыдатуру ЦВК не зарэгістраваў, бо Берніковіч не пазначыў ганарару за публікацыю ў часопісе ў памеры 2 тысяч рублёў. На гэтым кандыдат ад Дэмакратычных сілаў рук ня склаў, і дамогся такі рэгістрацыі. Паводле ярмошынскіх зьвестак, Берніковіч на тых выбарах набраў каля 10% галасоў і заняў другое месца, саступіўшы Васілю Хролу.

Сёлета ў Яраслава Берніковіча супернік на выбарах ад улады — старшыня Віцебскага аблвыканкаму Віктар Андрэйчанка. «У мяне часта пытаюцца, чаму Андрэйчанка ідзе менавіта па Глыбоцкай акрузе? Адказваю на гэта, што мне шукалі годнага канкурэнта», — жартуе Берніковіч.

Пры канцы пытаюся, ці ёсьць спадзяваньні, што можа перамагчы ў акрузе. «Усякае бывае. Каб не спадзяваўся, то і не ішоў бы», — адказвае Яраслаў.

**Зьміцер Панкавец**

**Чым гэта пахне?**

Піша Павал Севярынец. Старонка 5.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# БАТЭ
## крочыць далей!

БАТЭ—«Андэрлехт» 2:2. Да групавога турніру Лігі чэмпіёнаў засталося ўсяго два крокі.

Напэўна, ніколі яшчэ як сёлета беларусы ня мелі такіх шанцаў трапіць у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. Пра гэта неяк усе стараюцца маўчаць, каб не сурочыць, але ўсе спадзяюцца і верацъ у цуд. БАТЭ другі год запар радуе нас сваёй пчырай гульнёй у эўракубках.

Каманда з Барысава атрымала на розных франтах 13 перамог запар. Дзесяць былі дасягнутыя ў рамках чэмпіянату краіны, а яшчэ тры — у Лізе чэмпіёнаў. У тое, што БАТЭ пройдзе ісьляндзкі «Валюр» сумневаў амаль не было. А ў перамогу нашых хлопцаў у Брусэлі над славутым «Андэрлехтам» верылася слаба. Але: 2:1. А дома ўжо і сьцены дапамагалі.

Лік адкрыў Генадзь Блізьнюк, а калі бэльгійцы адыгралізя, Віталік Радзівонаў зноў вывеў каманду — 2:1. Удзельнік Эўра-2008 чэх Ян Полак лік адыграў. Дзесяць апошніх хвілін былі вельмі нэрвовымі, аднак наша каманда выстаяла. «Андэрлехт» яшчэ ніколі не заварашаў эўракубкі так рана.

БАТЭ выходзіць у трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў, дзе яго супернікам будзе абсалютна адэкватны па моцы баўгарскі «Леўскі». Да групавога турніру Лігі чэмпіёнаў засталося ўсяго два крокі.

Подзьвігі БАТЭ не засталіся незаўважанымі. Міжнародная фэдэрацыя прызнала наш клюб найлепшым у сьвеце ў ліпені! Яшчэ ніколі беларуская каманда не даб'івалася такога ганаровага званьня. Ды і зірніце, якія клюбы мелі такі тытул сёлета — «Рома» (Італія), «Баварыя» (Германія), «Рывэр Плэйт» (Аргентына), «Ліён» (Францыя). Ужо трапіць у такую кампанію больш чым ганарова.

**ЗП**

**Слоўнік мовы «Нашай Нівы». Новы том**

У выдавецтве «Тэхналёгія» выйшаў новы, другі па ліку, том «Слоўніка мовы «Нашай Нівы». У ім зьмясьціліся ўжываньня ў першай беларускай газэце ў 1906—1915 г. лексічныя адзінкі — ад слова «Дэкляраваць» да слова «Народ».

**Слоўнік мовы «Нашай Нівы».** — Менск: Тэхналёгія, 2008.

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Па сьлядах аднаго міфу

За тыдзень збору ініцыятыўная група па вылучэньні Яраслава Берніковіча ў дэпутаты сабрала каля 4000 подпісаў у ягоную падтрымку.

Берніковіч, лідэр нацыянальнага кола ў Глыбокім, вылучаны ў парлямэнт па Глыбоцкай акрузе №22. У яе ўваходзяць Глыбоцкі і Вушацкі раёны — самая глыбінка. Ад лукашэнкаўцаў па гэтай акрузе балятуецца старшыня Віцебскага аблвыканкаму Ўладзімер Андрэйчанка. Перадпэнсійнага веку доўгажыхар вэртыкалі (працуе на сваёй пасадзе ад 1994 году), ён заплянаваў атрымаць сынэкуру ў сталіцы.

Які толк ад збору подпісаў, калі свабодных выбараў усё адно няма, скажаце вы? Апазыцыйных кандыдатаў звальняюць — як Меха зь "Белтрансгазу" ў Кобрыне — каб пасьля сказаць, глядзіце: яны ж усе беспрацоўныя, за кошт чаго яны жывуць? Апазыцыйных кандыдатаў выклікаюць — усіх да аднаго — у Камітэт фінансавых расьсьледаваньняў. Ад пазаўчора Камітэт стаў патрабаваць дэкляарацыі пра даходы і маёмасьць і ад родных прэтэндэнтаў — бацькоў, братоў, сясьцёр ды жанок. Назіральнікаў ад тых кандыдатаў не ўключаюць у выбарчыя камісіі, каб ніхто ня мог прасачыць, хто там і што лічыць. СМІ прамываюць мазгі. Пры гэтым паводле нейкага разьліку — хіба каб стварыць бачнасьць выбару — тым самым кандыдатам, беспрацоўным, аточаным, дазволілі свабодна зьбіраць подпісы. Гэта ўсё фарс, вядома, а не дэмакратыя. Ніхто не зьбіраецца дзяліцца ўладай.

Але досыць было пары дзён адносна свабоднага збору подпісаў, каб рассыпаўся міф аб эліце, нязадольнай ахвяравацца, апазыцыі, нездатнай арганізавацца, аб інтэлігенцыі, далёкай ад народу, і народзе, якому ня трэба дэмакратыі. Міф, у якога кароткія ногі, але ў які самі яго ахвяры гатовыя былі паверыць. Чатыры тысячы подпісаў за тыдзень у Глыбокім і Докшыцах — гэта праява, сыгнал, факт. Дай больш свабоды, і пачнуцца зьмены ў розумах.

Берніковіч не ўнікальны: столькі ж за тыдзень назьбіралі прадпрымальнік Гарбачоў у Барысаве, фэльчар-чарнобылец Ваўчанін у Жодзіне.

Беларуская агітацыя, дэмакратычная агітацыя вядуцца толькі там, дзе ёсьць свае Берніковічы. Народ вакол іх гуртуецца. Толькі там захоўваюцца беларускамоўныя клясы, утвараюцца садкі, перакладаюцца мультфільмы, выходзяць незалежныя газэты. Сустракаецца інтэлігенцыя, людзі разьняволіваюцца. Ствараюцца повязі, зьяўляюцца месцы для сустрэчаў. І другое ж дарогі да пераменаў няма, акрамя як такая вось доўгая ўпартая дзейнасьць.




СЯМЁН ПЕЧАНКО

## Не дае спакою

Камунальныя службы Савецкага раёну Менску запатрабавалі ад Партыі БНФ зьняць з фасаду будынку, дзе разьмяшчаецца партыйны офіс, бел-чырвона-белы сьцяг.

У адваротным выпадку з Партыяй БНФ можа быць разарваная дамова аб арэндзе памяшканьня. Кіраўніцтва БНФ лічыць, што патрабаваньне камунальнікаў парушае артыкул 21 «Закону аб палітычных партыях», у адпаведнасьці зь якім партыя мае права прапагандаваць свае ідэі.

«Цяперашняя сытуацыя — спроба адцягнуць увагу партыі ад парлямэнцкай кампаніі, калі ў нас хапае іншых справаў», — кажа старшыня Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі.

Улады і раней усяляк дамагаліся зьняцьця сьцяга. Дзейнічалі часам і падступам — сьпілівалі дзержакі. Тым ня менш, Народны Фронт сьцяг захоўваў.

**ЗП**

## 8 і 92

Апытаньні, праведзеныя Службай Гэлапа, паказваюць, што ў былых савецкіх рэспубліках расьце цікавасьць да вывучэньня расейскай мовы. У той жа час толькі рэспандэнты ў Беларусі, Украіне і Казахстане для адказаў на пытаньне ў пераважнай большасьці выбралі расейскую мову (Беларусь — 92% расейскую і 8% беларускую; Украіна — 83% расейскую і 17% украінскую; Казахстан — 68% расейскую і 32% казахскую). У астатніх краінах нацыянальныя мовы выразна дамінуюць.

## Таня з вачыма лялькі

Тэлеканал Fashion TV выпусьціў у эфір прамацыйны відэаролік 16-гадовай беларускай мадэлькі Тані Дзягілевай. Да гонару рэдактараў тэлеканалу варта адзначыць, што яны нарэшце навучыліся адрозьніваць нашую краіну ад Расеі, і называюць Таню менавіта «мадэлькай зь Беларусі». Больш за тое: у тытрах імя Тані пададзена ў беларускай транскрыпцыі — Tanya Dziahileva, акурат як у пашпарце.

«Цяжка не заўважыць Таню — такія ў яе вялікія вочы, нібы ў лялькі, ды доўгія-доўгія залатыя валасы», — хваліць дыктарка маладую беларуску. Але ж і худзенькая Таня, нібы тая чараціна! Здаецца, вецер падзьме — і захістаецца… Нічога, прыедзе на канікулы да бацькоў — адкормяць.



# Тысяча нумароў «НН»

Вы трымаеце ў руках тысячны нумар «Нашай Нівы». Сучасная нумарацыя выданьня вядзецца ад траўня 1991 г., калі «Нашу Ніву» адрадзілі ў Вільні. Паводле гэтага адліку нумар 579-ы. Калі ж палічыць усе нумары, што зьявіліся ад заснаваньня «Нашай Нівы» — ад 1906 году, — то выходзіць, што агулам іх роўна тысяча.

1906 год — 7 нумароў. 1907 год — 36 нумароў. 1908 год — 26 нумароў. 1909 год — 52 нумары. 1910 год — 52 нумары. 1911 год — 52 нумары. 1912 год — 52 нумары. 1913 год — 52 нумары. 1914 год — 52 нумары. 1915 год — 31 нумар. 1920 год — 9 нумароў.

«Нашу Ніву» за 1906, 1907, 1908, 1909, 1910 і 1911 гады можна знайсьці ў факсымільных выданьнях. Падшыўкі за 1912 і 1913 гады (праўда, няпоўныя — да 44 нумару за 1912 год і да 46 нумару за 1913 год) ёсьць у аддзеле рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі. Падшыўка за 1914 год — у Архіве-музэі беларускай літаратуры і мастацтва. «Наша Ніва» ж 1915 і 1920 гадоў захоўваецца за межамі краіны.

**Падрыхтавала НХ**

# БАТЭ — найлепшы футбольны клюб сьвету ў ліпені

Найлепшым футбольным клюбам сьвету ў ліпені названы барысаўскі БАТЭ. З 173-га месца каманда ўзьнялася адразу на 93-е! Пра гэта сьведчыць сусьветны рэйтынг футбольных клюбаў, які быў абноўлены Міжнароднай фэдэрацыяй футбольнай гісторыі і статыстыкі.

Нагадаем, такому посьпеху барысаўцаў паспрыялі іх тры перамогі ў кваліфікацыйных гульнях Лігі чэмпіёнаў, асабліва апошняя — над знакамітым бэльгійскім «Андэрлехтам» на полі суперніка. Пакрыўджаны барысаўскай камандай бэльгійскі клюб па выніках ліпеня застаўся на 35-м месцы.

Першая дзясятка найлепшых футбольных клюбаў сьвету ў ліпені 2008 году выглядае наступным чынам: 1 (1) Манчэстэр Юнайтэд (Англія), 2 (4) Глазга Рэйнджэрз (Шатляндыя), 3 (2) Чэлсі (Англія), 4 (3) Баварыя (Нямеччына), 5 (5) Барсэлёна (Гішпанія), 6 (6) Рома (Італія), 7 (7) Лівэрпуль (Англія), 8 (8) Арсэнал (Англія), 9 (9) Бока Хуніёрс (Аргентына), 10 (10) Інтэр (Італія).

**СП, паводле Эўрарадыё**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная. Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз т.:
(017) 284-73-29, (029) 260-78-32,
(029) 618-54-84

СЬЦІСЛА

### «Мужчына каля пакета» сам зьявіўся ў міліцыю

Вызначаны асноўны пакуль сьведка па справе пра выбух 4 ліпеня. Міліцыя зьвярнулася з просьбай патэлефанаваць да ўсіх, хто быў на пляцы распаўсюджаных раней здымках зь месца выбуху. Адгукнуліся ўсе, апроч аднаго. І вось у панядзелак той чалавек, сфатаграфаваны каля пакета, сам зьявіўся ў міліцыю. Яго праверылі на дэтэктары хлусьні і адпусьцілі.

### А кажуць: санкцыі, санкцыі...

Амэрыканскія бізнэсоўцы суправаджалі А.Лукашэнку ў паездцы на жніво. Іх прыезд зьвязаны з праектам павелічэньня паставак беларускіх калійных угнаеньняў у ЗША да 800 тыс. тон. Раней іх аб'ём складаў ад 500 да 700 тыс. т. Група бізнэсмэнаў суправаджала кіраўніка дзяржавы ў паездцы ў Дзяржынскі (Койданаўскі) раён.

### Хворы не ўцячэ

Функцыі па аказаньні першаснай мэдычнай дапамогі будуць падзеленыя між хуткай і неадкладнай службамі. Такая сыстэма пачне працаваць да канца году. Хуткая будзе зьяўляцца па выкліку ў экстраных выпадках цягам 15 хвілін — прычынай можа стаць ДТЗ, траўмы, атручаньні, роды, непрытомнасьць, сутаргі ці крывацёк. Служба неадкладнай дапамогі будзе выяжджаць на выклік цягам гадзіны.

### Закон «Аб СМІ» падпісаны

А.Лукашэнка падпісаў закон «Аб СМІ». Пасьля яго афіцыйнага апублікаваньня пачнецца адлік паўгадавога тэрміну, па сканчэньні якога закон набудзе моц. Заклікі грамадзкасьці і міжнародных арганізацый устрымацца ад прыняцьця гэтага дакумэнтаў у цяперашнім выглядзе былі праігнараваныя. З крытыкай закону выступілі прадстаўнік па свабодзе СМІ АБСЭ Міклаш Харашці, дакладчык па Беларусі Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Андрэа Рыгоні, Міжнародная фэдэрацыя журналістаў, Міжнародная кампанія з свабоду слова «Article19», «Рэпарцёры бязь межаў», Нарвэскі саюз журналістаў, Нарвэскі ПЭН-цэнтар, Дацкі Саюз журналістаў і іншыя арганізацыі.

### Адкрыецца новая беларускамоўная гімназія

1 верасьня ў Менску адкрыецца новая беларускамоўная гімназія. Такі статус набудзе беларускамоўная школа №2, што ў Серабранцы. Віншуем вучняў, пэдагогаў і дырэктарку Ромуальду Машук.

### Беларусь прадавала зброю ў Судан, Армэнію і Эрытрэю

У Рэгістры ААН па звычайных узбраеньнях зьявіліся зьвесткі аб зьдзелках Беларусі на збраёвым рынку ў 2007 г. Згодна зь імі, летась Беларусь зброі не купляла. Прадавала зброю ў Судан, Армэнію і Эрытрэю. Уся зброя — вытворчасьці Расеі (СССР).

**МБ; СП**

# Вылезла ўсё

Сацыял-дэмакраты зьнялі палітвязьня Аляксандра Казуліна з пасады старшыні партыі і адсунулі Вольгу Казуліну і Ігара Рынкевіча ад кіраўніцтва. На чале партыі ўмацавалася група старых партыйцаў.

Перадвыбарныя зьезды апазыцыйных партыяў тояць больш інтрыгі, чым справаздачна-выбарчыя. Не памылімся, калі скажам, што 9 жніўня жарсьці будуць кіпець на зьезьдзе партыі БНФ. А тым часам 3 жніўня Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя зьмяніла лідэра. Замест палітвязьня Аляксандра Казуліна на гэтую пасаду абраны ягоны намесьнік Анатоль Ляўковіч.

Ад самага пачатку зьезд разглядаўся як тэхнічны, на якім трэба было вылучыць усяго некалькі кандыдатаў ад сацдэкаў на парлямэнцкія выбары.

Аднак досыць нечакана большасьць дэлегатаў запатрабавала ўключыць у парадак дня пытаньне аб пераабраньні кіраўніцтва. На пасаду старшыні БСДП былі вылучаныя чатыры чалавекі: старшыня ТБМ Алег Трусаў, былы сьпікер Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб, а таксама Анатоль Ляўковіч і Аляксандар Казулін. Першыя двое ўзялі самаадвод, таму засталіся толькі дзьве кандыдатуры. Вынік: 53 дэлегаты прагаласавалі за Ляўковіча, 22 — супраць. Аляксандра Казуліна абвясьцілі ганаровым старшынём партыі.

Было разгледжанае пытаньне і з намесьнікамі старшыні. Тут адбыліся мінімальныя зьмены — замест былога адваката Казуліна Ігара Рынкевіча намесьніцкі фатэль заняў берасьцеец Ігар Маслоўскі. Іншыя засталіся бязь зьменаў — Анатоль Сідарэвіч, Іван Анташкевіч і Валеры Фралоў.

Партыйны крызіс у БСДП насьпяваў досыць даўно. Паводле прызнаньня Анатоля Сідарэвіча, Казулін «так і ня зжыўся з партыяй».

«Ён ніколі не асацыяваў сябе з партыяй. Казулін казаў на партыйцаў «вы», нібыта абмяжоўваючыся ад іх. Нават падчас лютаўскага кароткачасовага выхаду з калёніі на пахаваньне жонкі, калі Казулін праводзіў пленум партыі, то ён заявіў: «Я вам дапамагаць з турмы ня буду». Ён не пацікавіўся справамі партыйцаў, якіх праз палітычную дзейнасьць выкінулі з працы, адлічылі з унівэрсытэтаў. Навошта? Казулін не прывёў у партыю ніводнага чалавека, апроч сваёй дачкі. Пытаньне зьмены Казуліна насьпела яшчэ таму, што ён ініцыяваў раскол у партыі, які, на шчасьце, не адбыўся. Атрымалася ўнікальная сытуацыя, калі лідэр партыі падтрымаў фракцыю, якая знаходзіцца ў меншасьці», — кажа А.Сідарэвіч.

Тут маецца на ўвазе стварэньне фракцыі «За ўнутрыпартыйную дэмакратыю», ініцыятарамі якой выступілі Вольга Казуліна, Ігар Рынкевіч, прадпрымальнік Віктар Крываль, частка рэгіянальных актывістаў. Стварэньне фракцыі падтрымаў і Казулін. Экс-кандыдат на пасаду прэзыдэнта некалькі разоў з турмы перадаваў звароты з патрабаваньнем зьмены кіраўніцтва партыі. Але, як высьветлілася, пазыцыі былога рэктара БДУ ў БСДП аказаліся ня самыя трывалыя — замест зьмены Ляўковіча зьмянілі самога Казуліна.

«У партыі адбыўся пераварот, — кажа ўжо былы намесьнік БСДП Ігар Рынкевіч. — Абсалютна падступным і вераломным чынам было пастаўленае пытаньне аб зьмене кіраўніцтва. Зробленая вялікая памылка, затое зьбылася запаветная мара сп.Ляўковіча. Зрэшты, ён не адзіны, хто сплянаваў гэты пераварот. Галоўнымі яго рэжысёрамі былі — Анатоль Сідарэвіч, Мечыслаў Грыб і Іван Анташкевіч, я хачу, каб гэтыя прозьвішчы прагучалі. Сёньня ўва ўсім сьвеце задаюцца пытаньнем, а хто такі Ляўковіч? Яго спрабуюць параўнаць з Казуліным. Прабачце за параўнаньне, але гэта як месяц і сонца. Так часам здараецца, што невялікі спадарожнік можа засланіць сабой вялікую плянэту. Але гэта кароткачасовая зьява. Дзеяньні сп.Ляўковіча ў дачыненьні да Казуліна падобныя да дзеяньняў уладаў. Не выключаю, што такім чынам ён можа заслужыць дэпутацкі мандат у палаце прадстаўнікоў. Выходзіць з партыі не зьбіраюся, бо я ішоў у яе да прафэсара Ткачова, і ніякія дацэнты не прымусяць мяне зь яе выйсьці».



WWW.SVABODA.ORG

**«Казулін у турме, а таму ня можа эфэктыўна рэагаваць на палітычнае жыцьцё», — заявіў Анатоль Ляўковіч.**

Анатоль Ляўковіч прызнаецца, што Казулін увесь час зьяўляўся, фактычна, фіктыўным кіраўніком партыі, які ніколі не заглыбляўся ў справы БСДП. «Зьмена кіраўніцтва даўно стаяла ў павестцы дня. Зьезд пры вялікай падтрымцы дэлегатаў прыняў рашэньне аб новым кіраўніцтве. Я лічу, што гэтае рашэньне адэкватнае сытуацыі. Казулін у турме, а таму ня можа эфэктыўна рэагаваць на палітычнае жыцьцё. Зрэшты, Аляксандар Уладзіслававіч ніколі і не займаўся партыйнымі справамі. Спачатку ў яго была прэзыдэнцкая кампанія, пасьля ён трапіў у турму. Фактычна, я зьяўляўся старшынём партыі ад 2005 году», — кажа А.Ляўковіч.

«Ляўковіч падставіў ня толькі сябе, але ўсю партыю. Цяпер БСДП будзе лічыцца на міжнароднай арэне ізгоем, ніхто не захоча мець справаў з такімі людзьмі. Зьезд ад самага пачатку быў сплянаваны па сцэнары Ляўковіча. Нічога дзіўнага тут няма», — кажа дачка палітвязьня Вольга Казуліна.

Вольга таксама не зьбіраецца выходзіць з партыі, і заклікае не рабіць гэтага ўсіх прыхільнікаў А.Казуліна. Яна ўпэўненая, што «бацька хутка выйдзе на свабоду, а пасьля ўсё можа зьмяніцца».

Скандалы ў сацыял-дэмакратычным руху за апошнія дзесяцігодзьдзе сталі нормай для палітычнага жыцьця краіны. Ня кожны заангажаваны ў апазыцыйнае жыцьцё чалавек можа з дакладнасьцю сказаць, колькі ж на сёньняшні дзень у Беларусі партыяў сацыял-дэмакратычнага кірунку. Ды што паспалітыя людзі, нават Міністэрства юстыцыі летась вынесла папярэджаньне партыі Казуліна, хаця мелася на ўвазе БСДГ Станіслава Шушкевіча.

Прыход Аляксандра Казуліна ў БСДП адбываўся напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, палітыку трэба было заручыцца падтрымкай нейкай палітычнай сілы. Вось і выплыў варыянт з БСДП. Для сацдэкаў такі варыянт таксама аказаўся прымальным — з дапамогай былога рэктара БДУ яны хацелі вырашыць фінансавыя праблемы. Напачатку такі кансэнсус задавальняў усіх.

З арыштам Аляксандра Казуліна сытуацыя стала менш адназначная. Спынілася фінансаваньне партыі, праз гэта на пэўны пэрыяд быў страчаны нават цэнтральны офіс БСДП. Сацыял-дэмакраты старога прызыву, што пацьвярджаюць словы Сідарэвіча і Рынкевіча, так і не прызналі Казуліна за свайго, таму сярод іх і насьпела патрэба ў зьмене лідэра. Зьезд жа паказаў, хай і з абвінавачваньнямі ў несправядлівасьці скліканьня дэлегатаў, што ўзровень даверу да Казуліна ўнутры партыі мінімальны.

Зьвяртае ўвагу, што «новае» кіраўніцтва з БСДП складаецца амаль спрэс з пэнсіянэраў. Цяжка сказаць, ці змогуць яны прынесьці нешта новае ў палітычнае жыцьцё. Зрэшты, казулінцы ў любым выпадку зьбіраюцца змагацца за старшынства ў БСДП.

**Зьміцер Панкавец**

### Не зразумелі

Навіна аб зьняцьці Аляксандра Казуліна з пасады старшыні БСДП выклікала нэгатыўную рэакцыю ў многіх палітыкаў і грамадзкіх дзеячоў.

Найперш аб непрызнаньні старшынства ў БСДП Анатоля Ляўковіча заявіў «Малады фронт». Потым быў распаўсюджаны адкрыты ліст былых палітвязьняў М.Аўтуховіча, З.Дашкевіча, Ц.Дранчука, З.Касьпяровіча, Ю/Лявонава, М.Марыніча, М.Маркевіча, П.Севярынца, С.Скрабца, М.Статкевіча і А.Фінькевіча, у якім быў выказаны рашучы пратэст дзеяньням А.Ляўковіча і ягонай каманды. «Іх дзеяньні амаральныя і здрадніцкія», — гаворыцца ў заяве.

Не застаўся ўбаку і Аляксандар Мілінкевіч. У ягонай заяве адзначаецца: «Мне цяжка зразумець лёгіку дэлегатаў зьезду, што прагаласавалі за перавыбары старшыні партыі ў сытуацыі, калі дэмакратычная грамадзкасьць Беларусі і салідарная зь ёй міжнародная супольнасьць змагаюцца за яго вызваленьне з турмы».

З крытыкай рашэньня зьезду выступіў і пісьменьнік Уладзімер Някляеў: «Жыцьцё, канечне, рэч складаная. Але усё ж не настолькі, каб не заўважыць падрыхтаваны падман, пасьля якога кіраўніцтву партыі можна было б выказаць недавер. Новым старшынём партыі абіраецца Анатоль Ляўковіч. Былога старшыні Аляксандра Казуліна намесьнік. Ягоны партыйны, так бы мовіць, таварыш. «Сытуацыя ў партыі стабільная», — заяўляе пасьля зьезду абраны старшыня. І зь ім цяжка не пагадзіцца, бо дзе стабільна знаходзіцца старшыня скінуты?.. Там, дзе ён знаходзіцца ўжо два гады. У турме. Таму на зьезьдзе не выступаў і яму не пляскалі… Калі гэта ў межах маралі, дык дзе пралягаюць межы?..»

Ніякай рэакцыі не было з боку Аб'яднаных дэмакратычных сілаў — кааліцыі, куды ўваходзяць і сацыял-дэмакраты.

**ЗП**

# Канкурэнцыя ў рамках сыстэмы

Працягваецца збор подпісаў па вылучэньні кандыдатаў у дэпутаты палаты прадстаўнікоў.

Сярод тых, хто зьбірае подпісы роўна 100 ініцыятыўных групаў вылучэнцаў Аб'яднаных дэмакратычных сілаў.

Тым часам ужо дакладна вядома, што склад парлямэнту абновіцца як мінімум на 60%. Як заявіла ў аўторак на прэс-канфэрэнцыі старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына, толькі 42 цяперашніх парлямэнтары вылучаюцца ў якасьці кандыдатаў у дэпутаты наступнага скліканьня шляхам збору подпісаў, а 2 вылучаныя працоўнымі калектывамі.

У прыватнасьці, атрымаць новы дэпутацкі мандат маюць намер Сяргей Касьцян, Міхаіл Русы, Тацяна Голубева, Міхаіл Арда, Вольга Абрамава, Генадзь Давыдзька і інш.

Улады ў гэты раз пачалі практыкаваць канкурэнцыю за дэпутацкі мандат унутры рэжыму. Радыкал Сяргей Касьцян будзе схіляць на свой бок жыхароў Мазыршчыны. У суперніках Касьцяна ня толькі прадстаўнік АДС, сябар АГП Леанід Арлоў, але і старшыня Ельскага райвыканкаму Сяргей Канопліч. Хто выйграе? Раней заўжды перамагаў той, хто быў у «прэзыдэнцкіх сьпісах».

У дэпутата Ўладзімера Здановіча, які курыраваў прыняцьце закону аб праваписе, у Днепрабугскай выбарчай акрузе супернікі на любы густ — і праўладныя, і апазыцыйны (Уладзімер Казека ад БНФ).

Канкурэнцыя існуе ня толькі між прадстаўнікамі ўлады, але і апазыцыі. Лідэр ПКБ Сяргей Калякін пракамэнтаваў рашэньне Міколы Статкевіч ісьці зь ім па адной акрузе: «Мне цяжка зразумець, навошта ён гэта робіць. Чалавека нічога ня зьвязвае з гэтай акругай, у яго няма там партыйнай структуры. І яшчэ адзін момант — Мікола Статкевіч ня мае права балятавацца на гэтых выбарах, бо зь яго ня зьнятая судзімасьць. Чаму ягоную ініцыятыўную групу зарэгістравалі — таксама загадка. У мяне тут дзьве вэрсіі: альбо Статкевіч агент, альбо дурань. Аднак і ў першы, і ў другім варыянце з чалавекам дамаўляцца немагчыма». Статкевіч такія абвінавачаньні рэзка адкідае: я іду, каб агітаваць за далучэньне да Эўрасаюзу, кажа ён.

А ў ЛДП на адзін дзень сем перамен. Здаецца, толькі што партыя заявіла пра няўдзел у выбарнай кампаніі, як зьезд прымае адваротнае рашэньне. У парлямэнцкіх выбарах ад Лібэральна-дэмакратычнай партыі будуць удзельнічаць сем чалавек. Са словаў лідэра партыі Сяргея Гайдукевіча, зьезд зацьвердзіў кандыдатаў у дэпутаты па ўсіх абласьцях Беларусі і Менску.

Сярод апазыцыйных кандыдатаў лідэрам па зборы подпісаў стаў сябар БНФ з Глыбокага Яраслаў Берніковіч, за якога расьпісаліся 3500 чалавек. Ня надта адстаюць і два сябры АГП з Барысава і Жодзіна Віктар Гарбачоў і Аляксандар Ваўчанін — абодва сабралі больш за 2 тысячы подпісаў.

Цэнтравыбаркам прагназуе, што сярэдняя колькасьць кандыдатаў у дэпутаты на акругу складзе 4 чалавекі. А найбольшая колькасьць кандыдатаў вылучаныя ў сталічных Партызанскай і Купалаўскай акругах.

**ЗП**

# Расейцам прапанавалі МАЗ, «Нафтан» і «Палімір»

1 жніўня першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка быў шчодры на прызнаньні.

У часе прэс-канфэрэнцыі, зладжанай у рамках прэс-туру расейскіх журналістаў, найбольш частымі былі пытаньні наконт прыватызацыі дзяржмаёмасьці.

Журналісты даведаліся пра адзін з варыянтаў кааперацыі Менскага аўтазаводу з расейскім ГАЗам, пра продаж «Нафтану» і «Паліміру» (найхутчэй «Лукойлу», рэпрэзэнтаванаму ў Беларусі Ўралам Латыпавым).

Кажучы пра пэрспэктывы МАЗу, Уладзімер Сямашка падкрэсьліў, што для ўпэўненага разьвіцьця прадпрыемству неабходна выпускаць 80-100 тыс. аўто штогод, а такія задачы для заводу выканальныя толькі ва ўмовах супрацы з расейцамі. Чыноўнік распавёў, што адпаведныя перамовы вядуцца з канцэрнам расейскага алігарха Дзерыпаскі. Гаворкі пра выкуп МАЗу не вядзецца, падкрэсьліў віцэ-прэм'ер. Мяркуецца, што прадпрыемствы ўтвораць СП пры пасярэдніцтве аднаго з заходніх інвэстыцыйных банкаў, які атрымае сваю долю актываў. Сямашка запэўніў, што МАЗ здольны і без староньняй дапамогі падвоіць выпуск прадукцыі ў рамках праграмы разьвіцьця прадпрыемства, разьлічанай да 2013 году, аднак інвэстыцыі маглі б паскорыць гэты працэс.

Як і заяўлялася яшчэ ў траўні, «Нафтан» і «Палімір» найхутчэй прададуць адным гаспадарчым пакетам. Асноўны варыянт угоды — продаж 50% актываў. У. Сямашка нагадаў галоўныя крытэры прыватызацыі: наяўнасьць сродкаў ня толькі для набыцьця актываў прадпрыемства, але й інвэстыцыяў у ягонае разьвіцьцё, а таксама неабходны аб'ём сыравіны для загрузкі прадпрыемстваў ды рынкі збыту прадукцыі. Патэнцыйных пакупнікоў «Нафтану» і «Паліміру» найхутчэй будуць выбіраць паміж «Лукойлам» і «Роснафтай», якія ў бліжэйшы час прадставяць на разгляд свае тэхніка-эканамічныя абгрунтаваньні. Патэнцыйным інвэстарам нагадалі, што ў выпадку невыкананьня згаданых патрабаваньняў урад выкарыстае пэўныя меры і мэханізмы, каб выправіць сытуацыю.

Нагадаем, што згодна з плянамі ўраду цягам трох бліжэйшых гадоў мяркуецца акцыянаваць 519 прадпрыемстваў. Як піша эканамічны тыднёвік «Белорусы и рынок», акцыянаваньне дзяржаўнага прадпрыемства не азначае яго аўтаматычнай прыватызацыі. У прыклад прыводзяцца бабруйская «Белшына» і гомельскі «Гомсельмаш», чые 100% актываў знаходзяцца ў валоданьні дзяржавы ўжо некалькі гадоў.

**Сямён Печанко**

# З пагрозаў і абяцаньняў

Пачаўся чарговы этап перамоваў з Расеяй па газавым пытаньні.




У мінулую пятніцу першы віцэ-прэм'ер Беларусі Ўладзімер Сямашка заявіў, што ў зьвязку са зьменай абставінаў — рэзкага падаражаньня нафты, — Беларусь і Расея павінны або разарваць ранейшую дамову аб пастаўках расейскага газу, або зрабіць нейкія дапаўненьні да дамовы, каб прыйсьці да нармальнага цывілізаванага рашэньня. Такі варыянт прадугледжваюць артыкулы грамадзянскіх кодэксаў Беларусі і Расеі. Па словах чыноўніка, 31 сьнежня 2007 году бакі пагадзіліся з формулай цэнаўтварэньня, прывязанай да нафтавага эквіваленту. Пры гэтым, у сваіх разьліках беларускі бок абапіраўся на расейскі прагноз, які абяцаў зьніжэньне цаны нафты — да $61 за барэль. Адпаведна з зацьверджанай формулай у першым квартале гэтага году цана на газ склала $119 даляраў. У выніку ж скачка цэнаў на нафту да $120 за барэль у другім квартале Беларусь перайшла на $127,9 за тысячу кубамэтраў газу — упершыню афіцыйна прызнаў сёньняшнюю цану на газ Сямашка.

Першы віцэ-прэм'ер прыгадаў пра рашэньне Расеі прыйсьці да прынцыпу роўнапрыбытковасьці, то бок увядзеньня новых цэнаў і на ўнутраным рынку. Раней гэта меркавалася зрабіць ужо ў 2011 годзе, але ў чэрвені «Газпром» заявіў пра адтэрміноўку да 2018 году. На думку чыноўніка, Беларусь таксама мае права на такі крок.

У сваю чаргу, у «Газпроме» мяркуюць, што цана газу для Беларусі і так разьлічваецца паводле «самай камфортнай формулы ў пастаўках манаполіяй газу ў краіны СНД ды Эўропы». Па розных падліках расейскіх экспэртаў, да канца 2009 году цана газу для Беларусі мае вырасьці да $200-240.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### На базе МТЗ прамысловая карпарацыя

Праграма інавацыйнага разьвіцьця МТЗ прадугледжвае выхад прадпрыемства на вытворчасьць 105-110 тыс. трактароў у год. Будуць створаныя заводы-спадарожнікі ў Бабруйску (10 тыс. трактароў у год), Мазыры (5-6 тыс.) і Смаргоні (6-7 тыс.). На рэалізацыю праграмы да 2013 г. накіруюць $1,2-1,3 млрд. інвэстыцыяў.

### Падвысілі пэнсіі

На 11,2% вырасьлі ад 1 жніўня памеры працоўных пэнсій па ўзросьце. Сярэдняя працоўная пэнсія па ўзросьце складзе Br408,1 тыс.

### Падвысяць падатак на незапатрабаваную нерухомасьць

Падатак на нерухомасьць і зямлю, што неэфэктыўна выкарыстоўваюцца, вырасьце ўдвая. Праект ўказу падрыхтаваў Дзяржкамітэт па маёмасьці.

### Украінцы могуць купіць Гомельскі вагонарамонтны

Гомельскі вагонарамонтны завод (ГВЗ) рэалізуе сумесны пяцігадовы праект па пабудове 125 пасажырскіх вагонаў з буйной украінскай кампаніяй — Крукаўскім вагонабудаўнічым заводам (КВБЗ). У плянах КВБЗ — удзел у прыватызацыі Гомельскага заводу. Цікавасьць інвэстараў выклікаюць Менскі, Асіповіцкі і Магілёўскі рамонтныя заводы.

### Індыя выпускае ноўтбукі коштам $100

Мэтавая група карыстальнікаў — студэнты ВНУ. Распрацоўкай займаюцца Індыйскі інстытут тэхналёгіяў у Бангалоры і навуковы інстытут у Чэнаі. Звыштанныя ноўтбукі («нэтбукі», «субноўтбукі») — сэгмэнт кампутарнай індустрыі, што найбольш імкліва разьвіваецца. Іх продажы вырастуць ад 9 да 40 млн адзінак да 2012 г.

### Рост МСБ

З 1 жніўня ўстаноўлены новы памер мінімальнага спажывецкага бюджэту (МСБ). МСБ сям'і з чатырох чалавек павялічыўся на 6,7%, да 1 кастрычніка 2008 г. складзе 345 760 руб.

**Сямён Печанко; паводле БЕЛТА, Дело, kommersant.ua**

# «Небясьпечныя сувязі» беларускай эканомікі

Аб беларускім фондавым рынку ў праекцыі на сусьветны піша **Раман Мамчыц**.

Сусьветны эканамічны крызіс, ня мог не закрануць Беларусі. Трэба заўважыць, што вынікі беларускай эканомікі за першае паўгодзьдзе на агульным фоне выглядаюць дастаткова аптымістычна.

Напрыклад, фондавы рынак, у параўнаньні з рынкам суседняй Украіны, выглядае менш рызыкоўным. Цікава, ад якіх вонкавых фактараў залежыць гэтае люстэрка нацыянальнай эканомікі — дынаміка фондавага рынку.

Калі прааналізаваць карэляцыю дынамікі беларускага рынку каштоўных папер з аналягічнымі рынкамі іншых краін, высьвятляюцца некаторыя нечаканыя факты.

Карацей, чыстая арыфмэтыка, і нічога асабістага. Каб прааналізаваць вонкавыя сувязі і залежнасьці беларускага фондавага рынку, мною былі ўзятыя і апрацаваныя дадзеныя за першае паўгодзьдзе 2008 году па індэксах найбуйнейшых сусьветных біржаў, а таксама па фондавых індэксах суседзяў па СНД — Расеі і Ўкраіны. У якасьці беларускага фондавага індэксу выкарыстоўваўся індэкс дзяржаўных каштоўных папер БВФБ (афіцыйная расейскамоўная назва — индекс ГЦБ/КО). Гэты індэкс зьяўляецца афіцыйным і, фактычна, адзіным індыкатарам айчыннага фондавага рынку, нягледзячы на тое, што ён разглядае толькі нізкарызыкоўныя дзяржаўныя інструмэнты. У табліцы прадстаўлены рэйтынг фондавых індэксаў іншых краін сьвету паводле ступені карэляцыі з індэксам ГЦБ/КО.

Як мы бачым, беларускі фондавы рынак найбольш карэлюе з фондавым рынкам Інданэзіі. Далей ідуць Украіна, Кітай і Малдова. «Ворагаў» у Беларусі больш, чым «сяброў»: адмоўная карэляцыя назіраецца ў Беларусі з Сынгапурам, далей (па зьмяншэньні) знаходзяцца Мэксыка, Паўднёвая Карэя, Канада, Тайвань, Нарвэгія, Аўстрыя, Нідэрлянды, Расея і Бразылія. Найцікавейшае ня тое, што на першым месцы па адмоўнай карэляцыі знаходзіцца Сынгапур (гэта ня дзіўна, бо ў «азіяцкіх тыграў» зусім іншая мадэль эканомікі, на тое яны і тыгры), а тое, што ў «чырвоны сьпіс» трапіла «братэрская» Расея. Тады як Украіна і Малдова выяўляюць сярэднюю карэляцыю зь беларускім фондавым рынкам, хутчэй за ўсё, зьвязаную з тым, што яны таксама церпяць эканамічны ўціск з боку Расеі. Што да Інданэзіі, дык можна канстатаваць толькі падабенства дзяржаўных мэханізмаў рэгуляваньня эканомікі зь Беларусьсю.

Характэрна, што галоўнае апірышча сусьветнага глябалізму і «ворагі сінявокай Беларусі» — ЗША і Бэльгія, дзе знаходзіцца штаб-кватэра НАТО, — наогул не выяўляюць карэляцыі зь беларускім фондавым рынкам — ані станоўчай, ані адмоўнай.

| Індэкс | Краіна | Каэфіцыент карэляцыі |
|---|---|---|
| **Composite Index (Jakarta)** | **Інданэзія** | **0,700356252** |
| **ПФТС** | **Украіна** | **0,605306324** |
| **SSE Composite Index (000001.SS)** | **Кітай** | **0,585923314** |
| **CNVM** | **Малдова** | **0,530489835** |
| Composite Index (Kuala Lumpur) | Малайзія | 0,348224024 |
| BSE SENSEX | Індыя | 0,234607917 |
| NZX 50 INDEX GROSS (NZSE) | Новая Зэляндыя | 0,104527468 |
| MIBTEL (Milan) | Італія | 0,094706636 |
| TEL-AV TASE-100 IND (Tel Aviv) | Ізраіль | 0,076497687 |
| SMI (VTX) | Швайцарыя | 0,028506895 |
| DAX (XETRA) | Нямеччына | -0,065939736 |
| ALL ORDINARIES IDX (ASX) | Аўстралія | -0,115213815 |
| EURONEXT BEL-20 (Brussels) | Бэльгія | -0,168753357 |
| CAC 40 (Paris) | Францыя | -0,190205992 |
| OMXS ALL SHARE INDX (Stockholm) | Швэцыя | -0,201131393 |
| EGYPT CMA GENL INDX (Cairo) | Егіпэт | -0,230829931 |
| Merval Buenos Aires | Аргентына | -0,288756583 |
| IGBM (Madrid) | Гішпанія | -0,310047393 |
| NIKKEI 225 | Японія | -0,32763303 |
| FTSE 100 (FTSE) | Брытанія | -0,329959703 |
| S&P 500 INDEX | ЗША | -0,36325423 |
| HANG SENG INDEX | Ганконг | -0,37368025 |
| **Ibovespa Sao Paulo** | **Бразылія** | **-0,412026846** |
| **PTC** | **Расея** | **-0,440322343** |
| **AEX amsterdam** | **Нідэрлянды** | **-0,460153005** |
| **ATX (Vienna)** | **Аўстрыя** | **-0,477975793** |
| **OSLO EXCH ALL SHARE** | **Нарвэгія** | **-0,49110475** |
| **TSEC weighted index (Taiwan)** | **Тайвань** | **-0,494183389** |
| **S&P/TSX Composite index (Interi — Toronto)** | **Канада** | **-0,514092973** |
| **KOSPI Composite Index (KSE)** | **Паўднёвая Карэя** | **-0,610455613** |
| **IPC (Mexico)** | **Мэксыка** | **-0,657730786** |
| **STRAITS TIMES INDEX (SES)** | **Сынгапур** | **-0,663891484** |

# Чым гэта пахне

Піша **Павал Севярынец**.



СТЭВАН ЛЮСЭРА. ДЫЛЕМА СЬЛЯЧАГА.

Не, гаворка не пра тое, чым гэта тхнула ў Менску ў мінулыя выходныя. Вецер з птушкафабрыкі, адмыслоўцы ўжо вызначылі. Хаця й сымбалічна.

Бо гаворка пра застой.

Маючы ў кішэні паўтузіна пасьведчаньняў сябра ініцыятыўных групаў хрысьціянскіх дэмакратаў — у Менску, Віцебску, Гомелі, Магілёве — грукаесься ў дзьверы. Так, выбараў няма, але мы ходзім. Размаўляем зь людам па-беларуску. Кажам, што перамены насьпелі і што трэба верыць. Кажам пра Беларусь і Бога.

Кажаш, кажаш, кажаш, глядзіш у паўпустыя вочы насупраць, і раптам адчуваеш: нейкі забыты зь дзяцінства пах. Чым гэта пахне… фарба з рамонту… салат аліўе… цыгарэтны дым зь перагарам… шматгадовы кватэрны быт…

«Мы ўжо нікому ня верым». «Усё роўна вы нічога не даб'яцеся». «Знаеце што, а нам бяз розьніцы». Не, гэта ня бел-чырвона-белая краіна. І нават не чырвона-зялёная. Сёньняшняя Беларусь глыбока й насычана фіялетавая.

Адзін мой суразмоўнік, былы чыноўнік, на маё «Дык колькі ж можна цярпець?» пасьміхнуўся: «Гэта вы *церпіце*. А людзі *жывуць*, пакуль можна».

Так, беларусы сыпяшаюцца жыць. Есьці, піць, купляць, гуляць, будаваць, грашыць, крэсьліць «ваша лато», глядзець кітайскую Алімпіяду. І няхай няма праўды, свабоды ды справядлівасьці, няхай трацінa мужыкоў ужо алькаголікі, няхай на 1000 шлюбаў у нас 721 развод, няхай Беларусь ужо першая ў сьвеце па самагубствах — жыць.

18-гадовы Кастусь, каталік з Глыбоччыны, што прыехаў у Менск паступаць на гістфак (і, між іншага, адзін з чатырох у цэлай краіне атрымаў на тэсьце 100 балаў), пытаецца: «Вось у 1970—1980-я таксама ж была стабільнасьць. У нас распавядаюць, жылі нармальна. Як жа тады Савецкі Саюз рухнуў?»

Будучаму гісторыку цікава.

Так, быў хлеб. Былі відовішчы. Была і дарагая нафта, і Алімпіяда, і «Спортлато». Елі, пілі, куплялі, гулялі, будавалі, грашылі… І тэлевізійная хлусьня была, і страх, і КГБ, і міліцыя. Ды не чырвоная з зоркаю была тады Беларусь — такая самая, як і цяпер, фіялетавая.

Але праз колькі гадоў эсэсэр рухнуў. Таму што застой пахне ня толькі кухняй ды прыбіральняй. Менавіта ў часы застою тыя, хто прынюхваецца, адчуваюць подых гніеньня — і намацваюць расколіны ў каменных склепах ды ключы ў дзьверах, каб вырвацца. Эпохамі застою Госпад шчодра ўгнойвае глебу для імклівага росту тых дзівосных яскравых асобаў, якія, высьпеўшы, зьмяняць сьвет.

Сто гадоў таму цуд Адраджэньня таксама гадаваўся сярод усталяванага рэжымам задушлівага «супакаеньня». «Наша Ніва», заснаваная ў 1906-м, усё наступнае цьмянае дзесяцігодзьдзе кшталтавала вобразы будучае Беларусі. Купала, Багдановіч, Гарэцкі, Арсеньнева, браты Луцкевічы, Станкевіч і Гадлеўскі — гэта таксама былі *дзеці застою*.

Чым пахне сучасная беларуская абыякавасьць?

Пылам, які падымецца над руінамі рэжыму.

Таму мы будзем грукацца да хаты да беларусаў. Будзем выпрукваць пустоты й лініі расколінаў ў каменных сьценах і жалезных дзьверах. Да таго часу, пакуль не пачуем водару сьвежага паветра.

Грукайцеся — і адчыняць вам, напісана ў Эвангельлі.

# Усебеларуская вадамерызацыя

Наступствы Дырэктывы №3 яшчэ дадуцца ў знакі беларусам. Згодна зь ёй усе жыхары краіны мусяць на пачатку 2009 году мець у хаце лічыльнікі халоднай і грачай вады. Піша **Руслан Равяка**.

Напачатку ў Баранавічах праводзілася тлумачальная агітацыя на старонках мясцовых газэтаў. Водаканалы і ЖКГ прапануюць за «невялікую» аплату паставіць вам у кватэры вадамеры. Пасьля апісваюцца ўсялякія выгоды накшталт «Хопіць плаціць за суседа».

Аднак такія меры, відаць, ня мелі вялікага ўплыву на простых грамадзянаў. Тады водаканал распачаў акцыю «ад дзьвярэй да дзьвярэй». Жыхароў шматпавярховікаў супрацоўнікі водаканалу абыходзілі й расказвалі тое, пра што пісалі ў газэтах. Да таго ж гарвыканкамам была дазволеная новая льгота. Крэдыт. Цяперака ня трэба плаціць усе грошы адразу. Выплату за ўсталяваньне вадамераў магчыма расьцягнуць на паўгоду. Існуе яшчэ і 20%-ая зьніжка за ваду на некалькі гадоў, для тых, хто далучыцца да «акцыі» сёлета.

Гэткія льготы мелі свой вынік — народ паціху пачаў ўсталёўваць вадамеры. Сантэхнікі жыльлёва-камунальных гаспадарак і водаканалу працуюць напоўніцу. Штотыдзень на маім пад'езьдзе зьяўляюцца абвесткі пра адключэньне вады з 8.30 да 16.30 — засаўкі не трымаюць і дзеля адной кватэры адключаюць пад'езд, калі ня цалкам дом. Зрэшты, пра засаўкі ў дырэктыве ж нічога не напісана.

Зьявіліся й першыя ахвяры вадамерызацыі. У некага вадамеры пачапілі наўпрост на шлангі, каб гойдаліся, бо трубы гнілыя, а мяняць няма калі — яшчэ шмат кватэраў трэба перавесьці ў рэжым эканоміі. Знаёмая ўжо колькі месяцаў дабіваецца праўды, карыстаючыся «адным акном» і, як яна кажа, сямю дзьвярыма. Падчас пастаноўкі вадамера ў прыбіральні, зварщчык сапсаваў новую кафлю. Кіраўніцтва таго ЖКГ сваёй віны не прызнала, маўляў, трэба было гаспадарам прадугледзець зварныя работы і прыкрыць кафлю. У выканкаме парaілі зьвяртацца ў суд. Шмат каму паставілі танныя расейскія лічыльнікі, якія, са словаў саміх водаканальшчыкаў, не працуюць больш за год. Нехта, ведаючы нядбайнасьць і хібы камунальшчыкаў, зрабіў усё сам, але, як высьветлілася пры плямбаваньні, мусіць усё адно заплаціць напоўніцу.

Пра санітарныя нормы таксама ніхто не ўспамінае — пасьля зварных работ на водаправодзе мусіць праводзіцца хлараваньне трубаў. Але дзе ж ты возьмеш гэтулькі хлёркі й вольнага часу. Санстанцыя пакуль робіць выгляд, што ўсё добра.

Нягледзячы на гэткія акцыі і рэклямную кампанію, яшчэ знаходзяцца асобы, што ігнаруюць дырэктыву прэзыдэнта. У іх ліку пэнсіянэры, якія і радыя б выканаць па звычцы ўсе рашэньні партыі, але ня маюць на тое сродкаў, нягледзячы на зьніжкі.

Як тлумачыў мне адзін чалавек, шмат хто чакае, што вадзяныя лічыльнікі ім паставяць пры канцы году задарма. Як электралічыльнікі. Проста яны будуць лічыцца ня ўласнасьцю жыхара кватэры, а камунальшчыкаў.

Зрэшты, я таксама пакуль не «завёў» сабе лічыльнікаў. Не лічыце мяне цемрашалам. Проста эканамічна, пры такіх цэнах на ваду, мне тое нявыгадна.

Аднапакаёўка (маласямейкай празваная ў народзе), збудаваная на пачатку 1980-х, што я здымаю, мае дзьве асобныя ўрэзкі — на кухні і ў ванным пакоі. Гаспадар кватэры, вадамерызавацца адмаўляецца, прапанаваў мне, пры вялікім жаданьні, паставіць іх самому. Усталяваньне чатырох вадамераў будзе каштаваць блізу 400 тысячаў. Кажучь, што дзякуючы зьніжкам я буду плаціць у месяц недзе 2000 рублёў за ваду. Пакуль без лічыльнікаў я аплочваю прыкладна 7500. Каб толькі акупіць лічыльнікі патрэбна больш за 6 гадоў. За тыя гады дзе Бог дасьць мне жыць, хто яго ведае…

На тым тыдні на дзьвярах майго пад'езду зьявілася абвестка, што згодна з дырэктываю ўсе жыхары каменіцы ПАВІННЫЯ ўсталяваць вадамеры ў прызначаны дзень. На прадпрыемствы Баранавічаў прыходзяць лісты з водаканалу са сьпісамі тых, хто ўхіліўся ад грамадзянскага абавязку. Водаканал просіць дырэктарат паўплываць на сваіх несьвядомых супрацоўнікаў і прымусіць выконваць заканадаўства. Кіраўніцтва водаканалу ў прыватных гутарках палохае адключэньнем вады для сабатоўцаў вадамерызацыі. Зьявіліся плёткі, што ў Гомелі ўжо пачалі адключаць ваду тым, хто ня мае лічыльнікаў.

Ціск падвышаецца. Падаецца, што пры канцы году камунальшчыкі любымі сродкамі хочуць мець 99,9% вадамерызаваных жыхароў гораду. Каб адчытацца перад уладамі аб дасягнутых посьпехах. А пасьля… а пасьля, як заўсёды, усе забудуцца на тыя вадамеры. І возьмуцца за газа- ці цеплалічыльнікі.

*Баранавічы*

# Алімпіяда ў «Птушыным гнязьдзе»

8 жніўня, у пятніцу, у Пэкіне пачнуцца 29-я Летнія Алімпійскія гульні. Напэўна, ад Масквы-1980 і Лос-Анджэлеса-1984, якія байкатавалі прадстаўнікі капіталістычнага і сацыялістычнага блёкаў адпаведна, ніводная іншая Алімпіяда не выклікала такой неадназначнай рэакцыі.

### Тыбэцкая праблема

Нельга ж параўнаць сытуацыю чатырохгадовай даўніны, калі частка канадзкіх спартоўцаў абяцала не прыехаць на Гульні ў знак пратэсту супраць зьнішчэньня муніцыпалітэтам Афінаў бадзяжных жывёлаў, і сёлетнюю кітайскую Алімпіяду, байкот якой абмяркоўваўся ў вядучых краінах сьвету, ад Амэрыкі пачынаючы.

Асабліва вострa такія галасы загучалі сёлета ў сакавіку, калі кітайскія ўлады жорстка задушылі ў Лхасе выступы прыхільнікаў незалежнасьці Тыбэту. Дарэчы, тыбэтцы, якія больш за паўстагодзьдзя пазбаўленыя незалежнасьці, прасочвалі ўвесь шлях перамяшчэньня па сьвеце алімпійскага агню. Спроба загасіць агонь рабіліся ў Лёндане, Парыжы, Сан-Францыска. Часта графік руху агню даводзілася трымаць у сакрэце.

У інтэрнэце ж пачалася акцыя «Запалі сьвечку за Тыбэт». Яе ініцыятары заклікаюць выказаць салідарнасьць з Тыбэтам, запаліўшы сьвечку 7 жніўня а 21.00 (па мясцовым часе). За дзень да пачатку Гульняў.

«Мы просім усіх ахвотных далучыцца да нас, — пішуць ініцыятары праекту www.candle4tibet.org. — У дзень адкрыцьця Алімпіяды запаліце сьвечку ў сваім доме, на працы ці ў іншым грамадзкім месцы. Пастаўце сьвечку на падваконьне, на стол... туды, дзе іншыя змогуць пабачыць яе зьзяньне. Нашая акцыя — гэта не пратэст супраць Алімпіяды, гэта падтрымка свабоды!»

8 жніўня арганізатары акцыі накіруюць лісты кіраўнікам дзяржаваў сьвету з падрабязнай інфармацыяй пра тое, колькі жыхароў іхнай краіны хочуць, каб Тыбэт стаў вольным.

Зрэшты, праблема Тыбэту не адзіная. Да байкоту Гульняў таксама падштурхоўвалі пастаянны ўціск правоў чалавека ў азіяцкай краіне, наступ на свабоду слова, падтрымка ўрадам Кітаю адыёзных дыктатураў па ўсім сьвеце — КНДР, М'янмы, Зымбабвэ, Судану, Беларусі.

За байкот выступілі Amnesty International, «Рэпарцёры бязь межаў», старшыня Эўрапарляманту Ганс-Герт Пётэрынг, некаторыя зоркі Галівуду.

Зрэшты, уявіць у сёньняшнім сьвеце байкот Алімпіяды досыць складана. Многія спартоўцы мэтаскіравана рыхтуюцца ўсе чатыры гады менавіта да гэтага старту. Тут варта пачытаць выказваньні трохразовага Алімпійскага чэмпіёна ў веславаньні, палітыка Ўладзімера Парфяновіча, які сёньня вельмі шкадуе, што праз палітыку дзяржавы ня змог трапіць у Лос-Анджэлес.

Урэшце, байкоту ня будзе. Нават Джордж Буш пацьвердзіў, што будзе 8 жніўня ў Пэкіне. «Я магу гаварыць кітайскаму кіраўніцтву пра свабоду да Алімпіяды, падчас Алімпіяды, пасьля Алімпіяды — што я і раблю. Мне не патрэбная Алімпіяда, каб данесьці да кітайскага ўраду сваю пазыцыю», — растлумачыў Буш.

Плянуецца, што Пэкін наведае і Аляксандар Лукашэнка.

### Афінскія паралелі

На гэты раз перад беларускімі фэдэрацыямі ня ставілі мэдальных плянаў. Нагадаем, што перад Афінамі Міністэрства спорту ўзяло расьпіску па мэдалях у кожным відзе спорту. Усяго было заплянавана 25 мэдалёў. Адзіным, хто адмовіўся падпісваць «плян» быў старшыня фэдэрацыі боксу Грыгараў. І, наўзьдзіў, баксёры замест аднаго мэдаля, які ставілі ў задачу, прывезьлі два. А сам Грыгараў стаў міністрам спорту, замяніўшы на пасадзе Юр'я Сівакова.

Сёлета Грыгараў кажа пра больш сьціплыя задачы — 17 мэдалёў і месца ў дваццатцы наймацнейшых краінаў сьвету. Калі так будзе насамрэч, то гэта будзе вялізны посьпех. Чатыры гады таму Беларусь з 15 мэдалямі размясьцілася на 26-м радку.

У Грэцыі ў нашай каманды было дзьве залатыя ўзнагароды — сэнсацыйная Юлія Несьцярэнка выйграла стомэтроўку, а ў дзюдо перамог Ігар Макараў, які стаў першым беларускім мужчынам, які выйграў золата Алімпіяды ў сувэрэннай беларускай гісторыі. Макараў у Кітай не адабраўся ўвогуле, разьлічваць на новыя подзьвігі ад Несьцярэнкі таксама не выпадае. На што ж тады разьлічваць беларусам?

### Беларускія шанцы

Многія сыходзяцца ў меркаваньні, што тры першыя радкі нам ужо забясьпечаныя. Тут найчасьцей называюцца прозьвішчы кідальніка молата Івана Ціхана (які можа давесьці да інфаркту нават Лукашэнку, як выказаўся кіраўнік дзяржавы на праводах каманды ў Пэкін), цяжкаатлета і рэкардсмэна сьвету Андрэя Рыбакова (дарэчы, роднага брата былога кіраўніка Белтэлерадыёкампаніі Ягора Рыбакова), а таксама вечна маладой Кацярыны Карстэн у акадэмічным веславаньні (яна ўжо выйграва на Алімпіядах двойчы — у Атлянце і Сыднэі).

Сапраўды, уявіць сытуацыю, што нехта з гэтай тройкі застанецца без мэдалёў, фактычна немагчыма. А ў Ціхана ёсьць яшчэ не абы-які напарнік — Вадзім Дзевятоўскі, які ў любы момант можа зьмяніць Івана на верхняй пасьці п'едэсталу.

Як заўсёды, найбольшая колькасьць узнагародаў будзе разыгрывацца ў лёгкай атлетыцы. Шанцы беларусаў там таксама ня кепскія. Найперш гэта зьвязана кідальнікамі і штурхальнікамі. Апроч мужчынскага молата, пра які мы ўжо казалі, асабліва добрыя пазыцыя выглядаюць у жаночым ядры, дзе нашую краіну прадстаўяць Надзея Астапчук, Натальля Харанека і Яніна Карольчык. Дарэчы, алімпійская чэмпіёнка Сыднэю Карольчык ускочыла ў апошні вагон пасьля дыскваліфікацыі Юліі Леанцюк. Іронія заключаецца ў тым, што сама Карольчык некалі была вымушаная сысьці з спорту праз допінгавы скандал.

Андрэй Міхневіч (муж Натальлі Харанекі) і Юры Бялоў павінныя годна прадставіць Беларусь у штурханьні ядра, а Эліна Зьверава і Ірына Ятчанка — у кіданьні дыску. Ёсьць асьцярожныя надзеі на жаночыя эстафэты 4 па 100 і 4 па 400. Відавочна, што не павінен застацца ўбаку ад мэдальных разборак і дзесяціборац Андрэй Краўчанка. У ягоным выпадку галоўнае, каб не падвялі нэрвы.

У цяжкай атлетыцы добрыя пэкінскія пэрспэктывы адкрываюцца перад юным барысаўцам Андрэем Арамнавым. Мо мэдаль зачэпіць нехта і зь дзяўчатаў.

У вэляспорце спадзяваньні найперш на нашую прыму Натальлю Цылінскую, якая яшчэ ні разу і не была алімпійскай чэмпіёнкай. Хаця ёсьць яшчэ таленавіты Васіль Кірыенка, які выступіць у гонцы па пунктах.

Зусім кепскія справы ў некалі беларускім відзе — спартовай гімнастыцы, дзе на мэдаль прэтэндуе толькі Дзьмітры Касьпяровіч (ня блытаць з былым палітвязьнем) у апорным скачку. У мастацкай гімнастыцы за бронзу можна будзе зачапіцца толькі ў камандных спаборніцтвах.

Асаблівыя надзеі будуць зьвязаныя ў нас з мужчынскай шпагай, хлопцы ўпершыню прабіліся ў гэты від камандай. Упершыню на Алімпіядзе сыграюць і нашыя баскетбалісткі. Іхны турнір увогуле павінен стаць галоўным упрыгожваньнем пэкінскіх Гульняў для Беларусі.

Хочацца верыць, што Валодзя Самсонаў нарэшце зможа зламаць супраціў кітайцаў у настольным тэнісе, а Віцы Азаранцы хопіць сілаў у тэнісе вялікім.

Зусім мізэрныя шанцы ў нашых у водных відах спорту. Хіба што Герасіменя ці Хахлова прынясуць сюрпрыз у плаваньні ці Дар'я Роменская — у скачках з трампліну.

У вольнай і грэка-рымкай барацьбе нашую краіну прадстаўяць фактычна толькі выхадцы з Каўказу, але можа, нехта выстраліць і зь іх. У боксе надзея на Віктара Зуева, які ў Афінах заваяваў срэбра.

Зрэшты, як той Піліп з канапель можа выскачыць і нехта з тых атлетаў, каго не адносяць да фаварытаў. Гэта ж Алімпіяда, а на ёй розныя цуды ўзьведзеныя ў ранг нармальнай зьявы.

### «Чыстае» паветра і блякаваныя сайты

Плянуецца, што алімпійскі агонь на галоўнай арэне Гульняў загарыцца 08.08.2008 а восьмай вечара ў восем хвілінаў і восем сэкундаў, а калі пашанцуе, то і ў восем дзясятых сэкунды. Такая вось магія лічбаў.

Ужо сёньня вядома, што пэкінская Алімпіяда стане самай дарагой у гісторыі. На яе было выдаткавана 40,5 мільярда даляраў.

Мала хто сумняецца, што ЗША будуць вымушаны аддаць верхні радок мэдальнай табліцы гаспадарам. Занадта ўжо магутна выглядае кітайская зборная, у якой фактычна няма слабых месцаў.

Цырымонію адкрыцьця Алімпіяды на стадыёне «Птушынае гняздо» наведаюць каля 160 тысячаў чалавек.

Пайшлі кітайцы на саступкі і ў інтэрнэт-сфэры, хаця яшчэ за месяц да пачатку ніякіх зрухаў у гэтым пытаньні не было. Пасьля доўгіх перамоваў прадстаўнікоў НАКу і кітайскіх уладаў, было прынятае рашэньне, што журналісты змогуць карыстацца сусьветнай павуцінай без абмежаваньняў. Блякавацца будуць

# Апошнія кітайскія папярэджаньні

Камісія па пытаньнях духоўнага разьвіўцця гораду Пэкіну разаслала ўсім жыхарам 15-мільённага гораду строгія ўказіўкі наконт формы вопраткі і паводзінаў у часе Алімпіяды. У дакумэнце расьпісваецца, як належыць расстаўляць ногі, якія шкарпэткі насіць і якой даўжыні мусяць быць спадніцы.

Кітай падрыхтаваўся да Алімпіяды па поўнай праграме. У Пэкіне спынілі працу заводы і будоўлі – каб спартоўцы ня нюхалі таго паветра, якім дыхае кітайскі народ. А паветра тое забруджанае...

Цэлыя два гады доўжылася кампанія па адвучваньні пэкінцаў пляваць сабе пад ногі — якя знаёмая беларусам практыка. Таксама жыхароў сталіцы Паднябеснай вучылі правільна стаяць у чэргах, не штурхацца, ня лезьці рогам. «Узровень ветлівасьці ва ўсім горадзе значна павысіўся, а таксама было створанае здаровае культурнае і грамадзкае асяродзьдзе для Алімпійскіх гульняў», — паведаміла Камісія па пытаньнях духоўнага разьвіўцця гораду Пэкіну.

То былі доўгатэрміновыя праекты, а напярэдадні Алімпіяды пэкінскі гарвыканкам выпусьціў тыражом 4 мільёны экзэмпляраў, для кожнай пэкінскай сям'і, адмысловыя буклеты з строга расьпісанымі правіламі добрага тону. Яны абдымаюць 36 розных сфэраў жыцьця і займаюць на афіцыйным сайце 9 старонак.

Можа, насельнікі Пэкіну думаюць, што яны яшчэ могуць выйсьці ранкам з хаты нягаленымі, не памыўшыся ў душы? О, не. Паліцыя нораваў ужо патрулюе вуліцы сталіцы.

А і пагаліўшыся, не памыўшыся, трэба яшчэ і апрануцца. Белыя шкарпэткі з чорнымі чаравікамі не насіць, скураныя спадніцы не паложаны, сьветлы лак для пазногцяў — аўт, і каб ніякага буйства колераў.

Парадпік утрымлівае таксама рэкамэндацыі, як правільна цісяць руку (не даўжэй за тры сэкунды), як карыстацца палачкамі для ежы на банкетах і прыватных сустрэчах. Як стрыгчыся: «У мужчын валасы ня мусяць даходзіць да брывоў, вушэй ці каўняра. Жанчыны мусяць мець прычоску адпаведную веку, занятку, сытуацыі». Мужчыны му-



толькі тыя сайты, якія «арыентаваныя супраць нацыянальных інтарэсаў Кітаю».

Стала чысьцейшым і пэкінскае паветра. Гэта адбылося пасьля таго, як арганізатары Алімпіяды прынялі рашэньне аб часовым закрыцьці ў кітайскай сталіцы будоўляў і фабрыкаў. Таксама адбылася рэарганізацыя дарожнага руху. У пэўныя дні на трасы Пэкіну могуць выяжджаць толькі машыны з цотнымі нумарамі, у іншыя — зь няцотнымі. За парушэньне такой пастановы чакаюцца досыць адчувальныя пакараньні. Хаця спартоўцы ЗША і Новай Зэляндыі ўсё адно носяць у Пэкіне адмысловыя маскі, якія абараняюць дыханьне ад атрутных рэчываў.

Алімпіяда — гэта ня толькі галы, пункты, сэкунды. Часта гэта перамогі над самім сабой. Чаго толькі варты дэбют 60-гадовага аўстралійца Лоры Левэра на Гульнях у конным спорце.

Не забываемся таксама, што адразу пасьля сканчэньня асноўных Алімпійскіх гульняў пачынаецца Параалімпіяда. Спаборніцтвы людзей, моцных духам, якія не скарыліся хваробе і не засталіся зь ёй сам-насам, а сталі рабіць сапраўдныя подзьвігі.

Ад 8 да 24 жніўня нас чакае тры тыдні бескампраміснай барацьбы, якую мы пабачым на дзяржаўных тэлеканалах, а таксама «Эўраспорце».

У Старажытнай Грэцыі была традыцыя, калі падчас правядзеньня Гульняў спыняліся ўсе войны і канфлікты. Як бы файна было, каб такая традыцыя адрадзілася і сёньня, бо Гульні ж сапраўды аб'ядноўваюць нацыі і кантынэнты.

**Зьміцер Панкавец**

---

сяць галіцца штодня, жанчыны мусяць карыстацца касмэтыкай умеру, мужчыны і жанчыны абавязаныя чысьціць зубы.

Таму Правілы загадваюць таксістам не захапляцца часныком — а кітайцы часнычок любяць.

Не рэкамэндуецца выяўляць цёплыя пачуцьці на публіцы. Стаяць трэба, крыху разьвёўшы ногі, літарай «V», але не нага за нагу. Цісьнуць руку можна не даўжэй за 3 сэкунды. Цалавацца ў Кітаі на вуліцах ня надта і цалуюцца, а вось вечарком у парках парачкі абдымаюцца сабе...

Што датычыць жаночых строяў, буклет ня раіць апранацца так, каб спалучаліся больш як тры групы колераў, а таксама рэкамэндуе жанчынам пазьбягаць негарманічных колераў. Не дай бог падкасаць штаны — народ тут так часта робіць улетку ў трамваі, на самалёце і нават афіцыйных сустрэчах.

Можна дастаць прачуханца за расхрыстаныя ці падкасаныя кашулі, — кітайскія мужчыны любяць падкруціць кашулі аж пад грудзі, каб летні ветрык жывот халадзіў.

Жанчыны ўсіх узростаў мусяць пераважна апранацца ў аблягаючыя сукенкі, але ў каго ногі таўставатыя, тым раяць выбіраць цямнейшыя панчохі. «Маладым можна насіць сукенкі 3—6 см вышэйшыя за калена — але ня больш. Для жанчын сярэдняга і старэйшага ўзросту сукенка мусіць быць прынамсі на 3 см ніжэйшая за калена».

Скураныя спадніцы і празрыстая вопратка не рэкамэндуюцца. «Вопратка ня мусіць быць замалой, інакш людзі будуць думаць, што вы ненадзейны чалавек». А людзям зь лішняй вагой варта пазьбягаць гарызантальных палосак.

Забарона на пляваньне — падмацаваная істотнымі штрафамі — была ўведзеная ў 2006 г. Аднак мала хто на яе зважае: ходнікі спрэс запляваныя, харкаюць прылюдна.

Кампаніі выхаваньня этыкету ладзяцца цяпер у школах, унівэрах і дзяржустановах. У некаторых раёнах студэнтаў заахвочваюць наведваць сельскія мясцовасьці і падымаць этыкет сярод тамтэйшага насельніцтва.

Некаторыя парады выглядаюць культурнай экзотыкай: не прымушайце суседа піць на банкеце; не купляйце змусам білетаў на прыезд другому чалавеку. Усё гэта мае вялікае значэньне для таго, каб знаёмства было пасьпяховым.

Як у часы эўрапейскага асьвечанага абсалютызму, кітайскія ўлады хочуць сілком «зрабіць народ культурным». Як і тыя папярэднія, яны хацелі б прасьвяціць свой люд, не вызваліўшы яго з палітычнай і эканамічнай залежнасьці. Выглядае гэта на пачатку XXI стагодзьдзя трохі камічна, а трохі жаласна, але адначзначна менш гламурна, чым 250 гадоў таму. Кацярына II цешылася пацёмкінскімі вёскамі. Правадыры партыі кітайскага пралетарыяту хочуць самі сябе падмануць наконт культурнага ўзроўню ўласных грамадзянаў. Па сутнасьці сьветачы «кітайскай мадэлі» мала розьняцца ад кіруючых элітаў эўрапейскіх аўтакратый дадэмакратычнага пэрыяду.

## Каб быць харошым

**Уводзіцца як абавязак:**

— мужчыны мусяць галіцца штодня

— стаяць трэба, паставіўшы ногі на шырыню плечаў, літарай «V»

— жанчыны мусяць красіцца ўмеру

— мець прычоску адпаведную гадам, занятку, сытуацыі

— калі ногі таўсьцейшыя, сьлед выбіраць цямнейшыя панчохі

— даўжыня спадніцы мусіць адпавядаць узросту; маладым жанчынам дазваляецца насіць спадніцы на 3—6 см вышэйшыя за калена

— усім жыхарам належыць абмяжоўваць спажываньне часныку і чысьціць рот

**Забараняецца:**

— мужчынам адпускаць валасы да брывей, вушэй ці каўняра

— выходзіць на двор у піжаме ці трусах

— закасваць штаны

— хадзіць расхрыстаным

— насіць белыя шкарпэткі з чорнымі чаравікамі

— насіць кашулі з высокім каўняром, калі шыя кароткая

— жанчынам насіць скураныя спадніцы, празрыстую вопратку, насіць вопратку негарманічных колераў ці больш як трох колераў за раз

— мілавацца на людзях

— сілаваць іншага чалавека піць на банкеце

— купляць змусам білеты на прыезд другому чалавеку

**Мікола Бугай, Раман Маладзяшын паводле http://www.timesonline.co.uk/tol/sport/olympics/article4439538.ece**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Дыярыюш Азаркі

Сьцягі, улёткі, налепкі. Міліцыянты, кадэбісты, ідэолягі. Кайданкі, асфальт і адарваныя пагоны. Містэр Бін адпачывае... Упартасьцю адной дзяўчыны малы горад усьведамляе абсурднасьць існага парадку. Пра сваё ціхае пакліканьне піша **Наста Азарка** зь Нясьвіжу.

## I

Мой начальнік жартаваў, што водпуск мне дасьць на ўсе 15 сутак. Міліцыянты дык і ўвогуле запрашэньне зрабілі: маўляў, калі ласка, будзеш у водпуску, заходзь да нас, падвальчык заўсёды для цябе падрыхтаваны, сардэчна запрашаем.

І вось я ў адпуску...

**3 ліпеня.** У сярэдзіне дня нашае самабытнае творчае аб'яднаньне «Валошкі» прэзэнтавала свой першы зборнік вершаў «Букет валошак». Сярод слухачоў заўважаю шмат міліцыянтаў — прыйшлі паслухаць мае вершы. Таму я вырашыла ўсё астатняе адкласьці на вечар.

Вакол людзі танчаць, музыка грыміць, міліцыянты, каб не прыцягваць залішняе ўвагі да разборкі, зацягнулі мяне ў кінатэатар... Кожны раз, калі на плошчы штосьць адбываецца масавае й мяне вылоўліваюць з натоўпу, міліцыянты заўсёды спрабуюць мяне зацягнуць у кінатэатар, каб мірна разысьціся... звычайна гэта ўсё сканчаецца пастарункам, бо я не згаджаюся, і ім даводзіцца выклікаць «мошку». За намі пайшлі два хлапцы-ахоўнікі, але на іхнае пытаньне, навошта міліцыянт завалок сюды дзяўчыну, мы ў адзін голас папрасілі іх супакоіцца й не перашкаджаць. Капітан доўга мяне ўгаворваў аддаць яму сьцяг — ён бы тады мяне адпусьціў, мне трэба было так і зрабіць — у сумцы быў яшчэ адзін, але кожны сьцяг для мяне на вагу золата. Дастаць тканіну, пашыць уручную сьцяг ды яшчэ хаваць усё ад дамашніх, таму што ўсё сканфіскоўваецца — гэта займае сродкаў і часу. Таму за кожнае палотнішча я літаральна гатовая горла грызьці, нават калі яно ня ўласна маё. Сьвятыню не гандлююць і не разьменьваюць.

У кінатэатры былі яшчэ некалькі цётак, працаўніцаў гэнае ўстановы. І калі афіцэр пачаў мне выкручваць рукі, каб забраць сьцяг, яны пасьпяшылі на дапамогу... толькі ня ведаю каму. «Штовыробіцця-адпусьціцядзяўчыну» зьмянілася «супакойсябудзьхарошаюдзевачкай». Кажу ім, каб не перашкаджалі, мы тут самі разьбярэмся. Мішка дакруціў усётакі рукі й забраў сьцяг, выштурхаў мяне да ўваходу, ахоўнікі адчынілі дзьверы, і я сышла.

Недалёка. На замак не было ўжо сэнсу ісьці, хай нават сабе й можна было зрабіць «сюрпрыз» на раніцу, але мне патрэбны былі людзі. Замак абгароджаны ровам, з аднаго боку насып перакрываў гэную канаву й даходзіў аж да сьцяжынкі. Можна было так залезьці ў двор замка цераз высакаватую агароджу — мне ці прывыкаць скакаць? Але патрэбен быў хаця б адзін чалавек, таму што хоць там усё перарыта-перакапана, у гэныя сьцены ўначы адной мне нейк страшнавата. Удзень зьнянацку хтосьць быў падвярнуўся пад руку, ды потым чалавек недзе зьнік...

Таму я аддала сьцяг у рукі статуіфантану, каторую летась паставілі за мае штрафы. Гэтыя зёберы ледзь усё не сапсавалі... Хто ня ведае, зёберы — гэта такая тутэйшая моладзевая субкультура аматараў бырла. Я ж кажу — як пабухаць, дык гэта адразу. А памахаць маім сьцягам — пасьля заўсёды калі ласка. Ледзь уратавала. Толькі прыладжваю да статуі — зь цемры выныривае хтосьць. Я ў цемры яшчэ нічога ня бачу, адныя абрысы. Здаецца, хлапец у міліцэйскай форме, а разабрацца, хто — не магу, хоць трэсьні. Мусіць, форму яму крыху сапсавала, бо ў мяне была перавага — я ня бачыла, што гэта міліцыянт, я мела поўнае права пусьціць у ход кулакі, ён абмежаваўся тым, што запрасіў на раніцу ў аддзел. Здрасьце, я прыйшла здавацца, так хіба?

Ну й не пайшла. Вяртаюся дадому. Сочнікі тут як тут. Заўсёды, калі я ні выйду на якія свае справы, яны круцяцца на сваёй машынцы побач, катаюцца сьлед у сьлед, яшчэ й праважаюць мяне дахаты да самага пад'езду. Заўсёды адна й тая машына. Далей ужо каталіся. Калі не хаваюцца ў сочцы, дык хай бы ўжо падвозілі. Бо іду вось дадому, а яны гойсаюць тут, ці ня зьдзекуюцца — пад'едуць наперад, стануць і чакаюць, покуль я набліжуся, крыху прапусьцяць наперад і пераганяюць, потым зноў чакаюць. І так да самага майго пад'езду.

Дачакалася ночы на Івана Купалу. Дзе ж там. Лепей за ўсё працаваць у звычайныя дні, калі міліцыя не ў баявым стане. Бо не далі нічога ўвогуле, я адно падышла да інфармацыйнае тумбы. А яны мяне за шкірку і ў «мошку» сваю. Літаральна вось так, як я й сказала. Забралі заплечнік, зьдзёршы яго з плячэй. Яшчэ й гыркнулі, што непадпарадкаваньне ўкляпаюць.

Едзем у пастарунак, па дарозе страчаем нашага прапара. Той да мяне — дзе яшчэ вешала? Я кажу, што толькі там, дзе затрымалі, болей нідзе й зьбіралася толькі на тумбах.

— Добра, — кажа. — Но ты ж мяне знаеш, ты знаеш маё атнашэньне к цібе, хай толькі дзе ішчэ убачу...

Ня ўбачыў. У пастарунку перайтрэсьлі заплечнік. Падмахнулі пратакол. Пакінулі на ноч. Халера на вас. Мухін і Пынько. Але ці таму, што іх было ўдвох, ці таму, што ноч была сьвяточнаю (багатаю на здарэньні, накшталт розных няшчасных выпадкаў з п'янюгамі, каторых у п'яным угары цераз вогнішча ня могуць пераскочыць), мяне не чапалі. Дзесь толькі пад раніцу дазволілі мне ісьці дахаты: разборак ужо ні ў кога не было жаданьня пачынаць, бо ўвесь аддзел зажыгаў ноч. Трэба ж адпачыць пасьля тыдня сьвяточнага!

Праз колькі дзён запрасілі ў КДБ на размову. Ну як запрасілі... Прапанавалі сустрэцца, а я ўжо вырашыла, каб сустрэча адбылася на іхнай тэрыторыі. КДБшнік пацікавіўся, трымаючы ў руках копію аплочанага квіточка, які я напярэдадні занесла ў выканкам, дзе я знайшла грошы на аплату штрафу. Немаленькага. А чаго мне хавацца? Вядома ж, такія грошы ў мяне проста так не валяюцца. Крэдыт я таксама не магу ўзяць, таму што нашае прадпрыемства — амаль банкрот, і банк забараніў нам набліжацца да яго з гэным пытаньнем бліжай, чым на сто мэтраў. Акрамя таго, у мяне судзімасьць — а гэта яшчэ адна перашкода. Мала, што за палітычны артыкул — судзімая й усё на гэтым. Дык я яму й кажу — пазычыла ў сяброў. Як кажуць, па нітцы са сьвету — кашуля выйдзе. Дык і я гэтак. Таму што быць павіннаю сябрам — гэта нашмат лепей, чым быць павіннаю дзяржаве. Дзе пяць рублёў, дзе дзесяць, дзе дваццаць — вось і назьбірала. А разьлічвацца можна й пазьней, і пароznaму, сябрам свае даўгі я магу й прабачыць, урэшце.

Пра тое, дзе я была 3 ліпеня, — службовец ведаў і без праверкі, таму ў тлумачэньнях наконт майго алібі ў сувязі з выбухам не было патрэбы. Адно пацікавіўся, ці ня ведаю я хоць штосьць пра гэта, ці ня чула, ці ня бачыла. Зайшоў ягоны супрацоўнік, ці то выпадкова, ці то спэцыяльна, убачыў мяне, паказаў фатаробата. Ну й урод жа там намаляваны! Морда, адным словам. А што пра гэта людзі кажуць? Дык і кажуць, што гэта прошукі аднае канторы, ня будзем стукаць у дзьверы. Ізноў ва ўсім вінаваты КДБ? — сьмяюцца. На жаль, на жаль... Разьвіталіся.

Раніцою мне дахаты тэлефануе кіраўніца нашага літаратурнага аб'яднаньня з жахліваю навіною: таму што мяне бачылі на плошчы са сьцягам, зборнік не пускаюць у людзі, у бібліятэцы вялізныя праблемы, яе самую выганяюць з працы. Тваю ць! Жанчына столькі намаганьняў прыклала, будучы цяжарнаю, цяпер на руках з малою, а за спадніцу трымаюцца яшчэ тры жаўтароцікі, і вось такая я ёй... Трэба штосьці рабіць і рабіць тэрмінова. Гэты ідэоляг — я ня думала, што ён будзе такім помсьлівым. Я не вінаватая, што ён так балюча й жорстка рэагуе на крытыку. Але тое, што ён робіць, — гэта не па-чалавечы. Вось так вось, праз іншых людзей, б'ючы па сумленьні, гэта нізка, подла, жудасна. Уся мая праблема ў тым, што я тут сама сабе арганізатар-выканаўца-пасобнік. Я сама сабе вырашаю, што рабіць, але я больш просты салдат, чым камандзір, фігуральна выказваючыся, я часьцей спачатку страляю, а потым думаю. Гэта мая вінаватасьць, я дапусьціла промах, праз мяне пацярпелі людзі, шмат людзей, гэта на ўзроўні таго самага выбуху, толькі ў Менску гэта было фізычна, а таму тое можна перажыць. А тут усё на маральным узроўні... Недахоп юрыстаў. Вось дзе ўвесь цьвік, на які я ўвесь час спатыкаюся. Дакладней, не недахоп, а ўвогуле адсутнасьць іх. Што рабіць? Так проста гэтая праблема не рассасецца, і пакуль я а 7-й гадзіне раніцы спрабавала дастукацца хоць да кагось, хто б даў мне якую параду ў дзеяньнях, вырашэньне прыйшло само сабою. Я сама пайду ў выканкам і запатрабую тлумачэньняў. Я вінавата — карайце мяне, але не чапайце нявінных людзей! Гэта нячэсна. Гэта няправільна. Так нельга! Другою думкаю прыйшло тое, што я магу яшчэ больш пашкодзіць жанчынам, калі на эмоцыях прыйду ў выканкам. Тым болей адна. Яшчэ раз паўтаруся — былі б тут юрысты... але іх тут няма. Мне патрэбна было параіцца з чалавекам, які б мог насамрэч дапамагчы на хадзе спыніць машыну. Я ніколі ня думала, што мне давядзецца шукаць дапамогі ў чалавека з таго боку барыкадаў, але тут справа датычылася не аднае мяне. Усё вырашылася за паўдня. Валечка мне потым яшчэ раз затэлефанавала й супакоіла, што ўжо ўсё нармальна. І нават паведаміла мне прозьвішча чалавека, каторы замуціў усё гэта. Ну і людзі. Бач ты, адной фіфе не спадабалася тое, што яе нават не запрасілі ў нашае аб'яднаньне — такую знакамітую, такую таленавітую, і ў зборнік, суадносна, не ўзялі ніводнага ейнага верша, а нейкай там апазыцыянэрцы дапамаглі ня тое, што надрукавацца, але й прачытацца.

Гара з плячэй звалілася. А з ідэолягам я яшчэ пагутару, калі злаўлю такую магчымасьць. Таму што насамрэч, што мне застаецца рабіць, акрамя як вывешваць сьцягі й ляпіць налепкі, калі мяне тут заціснулі гэтак, што й іншым людзям побач проста няма чым дыхаць. Сядзеў, разумееш, сабе гэткім шэранькім кардынальчыкам, нацкоўваў, грузіў, і захацелася яму пагутарыць раптам... я была б ня супраць мець зь ім справу, але пасьля вось такога — нізавошта! Калі вайна — значыць вайна. Усё.

## II

**...У ноч на 16 ліпеня** дзяжурылі мае даражэнькія Мухін і Пынько. Пасьля нашае апошняе сустрэчы не прайшло й двох тыдняў, і яны мне тады паабяцалі, што калі я яшчэ раз патраплюся да іх у дзяжурку, то мне будзе вельмі і вельмі весела. Колькі ж ужо можна?.. Таму я вырашыла свой прамэнад перанесьці на наступную ноч. Выйшла. Ну і людзі, ужо кроку ступіць немагчыма. Машына пакруцілася, паграззіла, што выклікае міліцыю, і паехала. Я пасьпела адысьціся на добрыя паўкілямэтра, як з-за паварота вынырвае «мошка», нясецца ў тым кірунку, адкуль я сышла, але, угледзеўшы мяне, рэзка дае па тармазах і падлятае да мяне. Турба, наш самы круты даішнік. Ад такога не ўцячэш нават на гоначным балідзе, ня тое, што пешым. Турба на хадзе адчыняе дзьверцы й загадвае садзіцца ў «мошку». Здрасьце, прыехалі. Навошта? Адмаўляюся, крочу сабе далей. Турба вылазіць сам, даганяе мяне. Не прад'яўляе мне нічога, мяне за руку не схапілі, чаго ад мяне яны хочуць — ня ведаю. Спрабую вырвацца. Капітан заграбастаў мяне ў ахапак і запіхнуў у машыну. У аддзеле яшчэ й сьведкаў прывялі, што яны бачылі, як я малявала й як адбівалася ад даішніка. Насьмяшыла тое, што заяўнікі мяне прынялі за 15-гадовую дзевачку. Выглядаю так? Вялікі дзякуй за камплімэнт — захавалася, значыць, нядрэнна! Склалі пратаколы — акрамя непадпарадкаваньня яшчэ ўкляпалі пашкоджаньне дарогі і хуліганку. Добра, буду чакаць, што з гэтага вылезецца. Дзяжурныя не захацелі мяне трымаць да раніцы, бо падвал быў упакаваным. Вырашылі мяне скінуць дадому. Пакуль марудзілі з машынаю, я зьлавіла момант — брама дворыка была прыадчыненаю. Але ля самае шчыліны мяне перахапіў міліцыянт. Запіхнулі ў машыну, даставілі дадому, з рук у рукі перадалі бацькам. Астачу ночы сяджу й думаю. Гэта было трэцяе затрыманьне. Першае мне прабачылі, але яно мне вылілася ў вайну з ідэолягам. Другое было фактычна ні за што, таму што была закранутаю інфармацыйная тумба — месца, дазволенае мне самім старшынём адміністрацыйнае камісіі. Вынікі гэтага затрыманьня яшчэ наперадзе.

І ці ж я буду сядзець і чакаць? Вырашаю рызыкнуць. Выйшла ў наступную ж ноч яшчэ раз, дабіваць тое, што задумала. Машыны ідуць — хай сабе, я тут прыўзбочку, нікому не перашкаджаю. І патрэбна ж было ехаць акурат у гэным кірунку нашаму сёлетняму найлепшаму супрацоўніку міліцыі. Ехаў ён, вядома, не па службе, у яго быў выходны й водарам ад каўнерыка крыху несла. І праехаў бы ён, не зважаючы, але гэта была ягоная дарога — даішнік заўсёды застаецца даішнікам. Спыніўся. Агукнуў. Я па голасе не пазнала, таму не адрэ-

агавала адразу, а калі ён падышоў і схапіў мяне за руку — было ўжо позна казаць, што не мае. Зь ім былі яшчэ левыя хлапцы, якія, натуральна, ператварыліся ў сьведкаў. Віцька выклікаў патрульных. Пакуль іх чакалі, я спрабавала вырвацца, мы кружыліся нібы ў вальсе ці больш падобна было нават на танга. Я нейк вывернулася й нацэліла распыляльнік хлапцу ў твар. Ён не спалохаўся, хоць і крыху паслабіў хватку, гэта я асеклася — Віця такі прыгожанькі, у белай кашульцы, а я яму фарбаю?.. Замінка — і ён перахапіў балёнчык. А вось і мігалачкі — ляцелі яму на падмогу, нібы адчувалі, што яшчэ хвіліна і тут будзе бойка. Я мела права на яе. Віця быў не пры службе. І калі б ён вырашыў ужыць сілу ці да яго на дапамогу прыйшлі б ягоныя сябры, якія стаялі ля машыны й ржалі, паглядаючы на нас, то без крыві не абышлося б. З «мошкі» павыскоквалі, разьнялі, але... Сарвала нечы бэджык — добра, што не пагон. Спрабуюць вырваць заплечнік — я сцапіла рукі, падсечкаю выбілі раўнавагу. Кульбіт за кульбітам — і вось я ўжо цалуюся з асфальтам. Ня могуць зьняць з плячэй заплечнік, дык расшпілілі яго на мне, прыціснуўшы каленам да дарогі. Паглядзелі, што ён поўны, вырашылі забраць мяне ў аддзел. Ага, на словах, канечне, лёгка, я працягваю выкручвацца — рызыкавала страшэнна, гэтая ноч была ў зьмене даражэнькіх маёраў, мне вельмі не хацелася туды трапляцца, і каб ня Віцька — усё было б акуратна ўкладзена. Заплечнік даўно зьнік у «мошцы», я зноў цалуюся з асфальтам, у мяне выкручаныя рукі, зьверху прыціскае мент. Хтосьці кінуў прапанову нацапіць кайданкі — гэта ўжо рэальнае непадпарадкаваньне. Пачакалі яшчэ колькі хвілінаў, пакуль самі супакоіліся. Запіхнулі ў «мошку», прывезьлі ў аддзел.

На гэны раз пакінулі на ноч. Пісаць тлумачальную? Зь якога ражна? Хопіць зь іх і ўчорашняга пратаколу. Адмовілася. Сяджу, рукі баляць, ажно самі ўжо выкручваюцца. Доўга вырашалі, куды мяне пакласьці спаць — у падвале няма месца, у стакане сьмярдзіць, дык прывалаклі раскладуху й тут жа ў дзяжурцы паставілі. Дзякуй і на гэным. Ноч была спакойнаю, хоць выспалася. Нягледзячы на жартачкі маёраў. Раніцою прыйшоў начальнік міліцыі — патэлефанаваў зраньня, даведаўся, што я ноччу, дык дужа закарцелася пабачыцца. Даўнавата зь ім не сустракалася, хоць і вітаемся ці не штодзень ківочкамі на вуліцах. Ягоны зам ажно прысьвіснуў, чытаючы рапарты:

— Ну, гэта ўжо цягне на хуліганку. Трэба садзіць на 15 сутак. Што з табою рабіць?

Я гляжу на яго яшчэ крыху заспанымі вачыма.

— І ня строй мне тут вочкі, — сьмяецца.

Адпусьцілі.

Плечы ўсе ў сіняках, добра, што вусны не распухлі — значыць, быў толькі лёгенькі пацалунчык з асфальтам, прыклалі як да іконы. Давялося цэлы тыдзень хадзіць у рукавох. Надвор'е сапсавалася, дождж ліў тры дні не спыняючыся. Тут жа давялося камунальшчыкам усё замалёўваць ізноў. Ну і хай сабе, трэба ж ім за штосьці грошыкі атрымліваць, дык хай не абураюцца.

Перачакала дождж. У нядзелю раніцою пайшла на базар. Між справамі раблю сабе ў пакою маленькі рамонцік, ня эўра, канечне, але паднавілася. Там сустракаю свайго участковага (аднаго з). Ён кажа, каб заўтра адранку прыйшла ў аддзел ці да яго, ці да старлея: — Інакш самі па цябе прыедзем.

Добра, прыходжу раніцою ў пастарунак. Старлей нават не захацеў са мною размаўляць — бач ты, ізноў я хлопчыка бедненькага падставіла, ізноў ён дзьмуўся на канапе ў начальніка. А што ж я магу зрабіць? Ну, ня хочаш і ня трэба, у мяне шмат справаў таксама. Мне ж лепей. Участковы зьехаў на забойства. Ну, калі я нікому не патрэбная і суду ніякага ня будзе, то й сьцяг вам у рукі. Але выйсьці ў гэную ж ноч мне перашкодзіў усё той жа дождж. Сёмая гадзіна раніцы. Званок у дзьверы. Я ўжо ня спала — пры канцы водпуску пачала прачынацца а 4 гадзіне зраньня. Бацька пайшоў адмыкаць. Родненькі голас участковага. Чую я, чую, што трэба зьбірацца, дзе ж ты быў учора, я ж прыходзіла...

І атрымала накіраваньне ў маё любімае ЖКГ да юрыста на складаньне чарговага пратаколу.

Артыкул можна было хуценька адмахнуць і на месцы, калі б я была кіроўцам — тады трэба было б ісьці да начальніка, ну й адпісаліся б мінімумам, а так трэба накіроўваць дакумэнты на адміністратыўную камісію. Камісія дык камісія. Перажывем. А вось з судом за непадпарадкаваньне нешта зацягнулі — ці то чакаюць, пакуль у мяне сінякі пасыходзяць, ці то проста шкадуюць...

І мне б пасядзець, пакуль усё ўтрасецца, дык не, дагналася. Так дагналася, што толькі падвальчык і ўратаваў...

### III

Ну я ж прасіла, я ж папярэджвала ўсіх пра тое, што Нясьвіж — недатыкальны горад. Ня ваша — не бярыце, ня ў справе — ня суньцеся... Мне што, пра гэта пачаць на сьценах пісаць? Ці мітынгі зладкоўваць ды пад выканкамам на ўсю плошчу крычаць?

Выйшла. Ня позна, але акурат каб пасьпець усё зрабіць. Знайшла была адчынены пад'езд, пахадзіла па даху, вырашыла вярнуцца потым сюды ж раніцою — мабіла не бярэ. Прайшлася па горадзе... Не, трэба было нейкаму малакасосу да расьцяжкі прычапіцца. Ды каб жа ён у той момант, як я яе вешала, прыйшоў ці да мяне зьвярнуўся — я б пасьпела з чалавекам паразмаўляць — мо ён чагосьці хацеў, — і ад затрыманьня выкруціць і яго самога, і сябе разам. Дык не, трэба было яму акурат прыйсьці тады, калі мяне побач не было. Ды яшчэ, мусіць, і патрымацца за яе. Вось дурня й сцапалі. А мяне запынілі. Хаджу сабе па іншай вуліцы, нікога не чапаю. Віск тармазоў — я аж падскочыла на месцы. Ды яшчэ сваёю кракалкаю пасыгналілі. Хацела зьбегчы, сысьці — дагналі. Не, браткі, не хачу я сёньня ў пастарунак, ну не хачу я... Спрабавалі зацягнуць у машыну, але нечакана для ўсіх нас я ўбачыла ў сваёй руцэ пагон. Некалькі імгненьняў мы стаялі й незразумела паглядалі адзін на аднаго — як жа так выйшла... Вадзім павольна спытаў:

— Ты знаіш, што за эта будзе?

— Знаю, — мне зрабілася страшна, але чамусьці цягнула на сьмех.

— Давай у машыну.

Прывезьлі ў аддзел. Заўважаю нейкага хлопчыка, які быў чамусьці з маёю расьцяжкаю. Доўга яшчэ высьвятлялі сувязь паміж намі — а я яго ў першы раз бачу. І ён мяне ня ведае. Хлопчык непаўналетні, цялятка нейкае, што зь ім цягацца? Дык і не захацелі, загадалі яму аддаць мне маю расьцяжку й адпусьцілі. Не, вы канечне, скажаце — цябе не злавілі зь ёю, дык магла й адкасацца. Можна было, але б тады пачалі цёгаць гэтага хлопчыка. Праблемы з бацькамі, зь міліцыяй, дый дзядзька Вася падскочыў бы адразу. Тым болей, калі хлопчык зусім ні пры чым. Ён і пайшоў сабе дахаты, мусіць, упершыню сутыкнуўшыся з такою справаю. Я сяджу далей. Склалі тут жа пратакол за непадпарадкаваньне. Расшманалі заплечнік, выграблі ўсё, што там заставалася. Яшчэ колькі часу думалі, што са мною рабіць — ці зачыняць да суду, ці адпускаць дадому. Вырашылі, што хай сабе апошняе. І безь мяне ночка нейкая упакаваная. Так былі й адпусьцілі, але ўзгадалі, што ў заплечніку не знайшлося налепак. Яшчэ й кішэні вытрасьлі.

Раніцою, пакуль сядзела ў пакоі для допытаў — чакала канвою ў суд, — уся міліцыя ржала аб тым злашчасным пагоне. Прыйшлі нарэшце й «пацярпелыя»: «У, хуліганка, зачэм пагон сарвала? Зь цябе што, не хваціла цех задзержаній? Дапрыгалася!» Вадзім увогуле паскардзіўся, што яму ўвесь час нешта даводзіцца перашываць гэныя пагоны — што мы яго ўсе так ня любім? Да таго ж і зорачкі недзе расшпурваюцца, даводзіцца штораз набываць новыя. Добра, я ж гэта ненаўмысна, як знайду, набуду хлопчыку які дзясятак гэных зорачак, хай цешыцца.

Судзьдзя Цьвік аж расьцьвіў — ня бачыліся ажно з тога жніўня. Сядзіць іржэ ці то з сакратаркі свае, ці то ягоная сакратарка з судзьдзі ржэ. Пытаецца ў мяне — раскажы, маўляў, як была справа, за што прыцягнулі. Я й кажу, што зрываць той няшчасны пагон зусім не хацела. Запрасіў «пацярпелага», Вадзіма. Той паказвае адарваты пагон. Цьвік сьмяецца — можа, яго далучыць да справы ў якасьці рэчдоку? Ня трэба. Юра дык і ўвогуле залупіў:

— ...Наручнікаў не адзявалі, бо гэта ж жэншчына... жэншчына ёсьць жэншчына, як жа на яе наручнікі?.. А пагон сарвала з Ромаза, ён аж на асфальт упаў...

— Хто упаў? — судзьдзя пытаецца.

— Пагон... Мы ёй гаварылі: стой, штоб шла садзілась ф машыну, а яна ж па-рускі не панімае.

— Нада была па-беларускі, — Цьвік увогуле заўсёды сьмяецца, вясёленькі такі хлопчык.

Маглі б даць мінімум, таксама вялікі, ды не такі ўжо й страшны, калі б гэта быў першы раз, але да справы прыклалі ўсе рапарты. Вось і атрымала.

Добра, што пра крымінальную справу ніхто нават гутаркі не завёў. А яшчэ ізноў давядзецца дзьмуцца ў ЖКГ і на камісіі.

Вяртаюся дадому. Па дарозе заварочваю да тога дому, дзе была ўначы, але... там ужо хадзілі міліцыянты. Ледзь не сутыкнулася нос да носу. Дрэнна — я так хацела пафоткаць панараму гораду звышыні...

Па дарозе тэлефануе кадэбэшнік:

— Ну, што ж гэта ты там ізноў куды ўлезла? Заняцца табе больш няма чым? Мусіць, патрэбна казаць тваёй дырэктарцы, каб дала табе такую працу, на 23 гадзіны ў суткі каб была занятаю.

Папярэдзіў, што хутка вельмі давядзецца нам яшчэ раз пабачыцца. Я, канечне, разумею, што з такімі посьпехамі, хочаш ня хочаш, а яшчэ раз праз крыміналку пройдзеш, таму вельмі добра, што водпуск ужо скончыўся.

Усё, іду на працу. Акурат начное дзяжурства, пасьля паўночы ўжо. Дарэчы, нібы й не адсутнічала там месяц, вось за гэта я й люблю льнозавод — проста й па-чалавечы. Грукат у дзьверы — падкаціў сэржант з прапарам, праверка ў іх, бач ты. Хлапцы засталіся задаволенымі — Насьця выйшла з водпуску, цяпер можна крыху й паслабіцца, кожную ноч ужо ня трэба будзе дрыжаць за спакой у горадзе. Усё нармальна.

За адзін месяц завіснула на трох артыкулах, як я зь імі буду разграбацца — ня ведаю... ніколі яшчэ такога не было. Проста нейкая жудасьць.

І яшчэ. Да гэтага часу тут я была, так бы мовіць, пэрсонаю нон грата. Цяпер паступова ператвараюся ў VIP-пэрсону, але яшчэ да гэнага статусу расьці й расьці. Патрэбна займець вышэйшую адукацыю. Патрэбна знайсьці прэстыжную працу. Патрэбна выбівацца на дзяржаўны ўзровень хай сабе й мясцовага гатунку. Чым я й пляную заняцца надалей. Але жыцьцё без налепак, сьцягоў і расьцяжак — гэта вельмі прэсна й нецікава, таму я нічога не зьбіраюся кідаць, проста крыху пашыруся.

Водпуск скончыўся. Але ўсё яшчэ наперадзе.

*Нясьвіж*

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 29 ліпеня

#### Берасьце

Моладзевыя актывісты 26, 27 й 29 ліпеня вывешвалі ў горадзе бел-чырвона-белы сьцяг у гонар абвяшчэньня сувэрэнітэту Беларусі.

#### Віцебск

Кіраўніка віцебскай суполкі «Моладзі БНФ» **Аляксандра Кузьняцова** звольнілі з працы. Ён працаваў санітарам у хуткай дапамозе. Зь ягоных словаў, галоўны фэльчар заявіў яму, што ім цікавяцца з органаў. А.Кузьняцову прапанавалі напісаць заяву па асабістым жаданьні, паабяцаўшы ў адваротным выпадку знайсьці прычыну для звальненьня. Аляксандар мае жонку і дваіх дзяцей.

#### Менск

Актывіста грамадзянскай кампаніі «Эўрапейская Беларусь» **Максіма Вінярскага** і сябра АГП **Алега Корбана** па тэлефоне выклікалі на допыт ва Ўпраўленьне КДБ па Менску і вобласьці. Са словаў Вінярскага, яму пазваніў чалавек, які прадставіўся «працаўніком КДБ Аляксандрам Мікалаевічам» і настойліва прасіў прыйсьці на допыт па справе выбуху ў Менску 4 ліпеня. Пры гэтым ён не назваў свайго прозьвішча і адмовіўся даслаць афіцыйную позву. Са словаў Корбана, чалавек, які тэлефанаваў яму, прадставіўся толькі супрацоўнікам КДБ. Ён цікавіўся таксама месцазнаходжаньнем моладзевых актывістаў **Уладзімера Сяргеева** і **Ягора Баброва**.

#### Слонім

На кватэры актывіста партыі БНФ **Віталя Ешану** супрацоўнікі міліцыі і КДБ шукалі наркотыкі. Яны спасылаліся на ананімнае паведамленьне пра тое, што на гэтай кватэры нібыта робяць наркотыкі. У выніку наркотыкаў не знайшлі, аднак сканфіскавалі некалькі старых брашураў КХП-БНФ. В.Ешану зьяўляецца сябрам ініцыятыўнай групы прэтэндэнта на кандыдаты ў дэпутаты **Івана Шэгі** ад партыі БНФ. Пазьней І.Шэгу, а таксама сяброў ягонай ініцыятыўнай групы **Алеся Масюка** ды В.Ешану выклікалі ў міліцыю, дзе дапыталі наконт месцазнаходжаньня іх у ноч на 4 ліпеня.

#### Вушачы

Міліцыя шукае тых, хто зрабіў на некалькіх будынках ды аўтобусных прыпынках мястэчка Вушачы надпісы «Жыве Беларусь!» У якасьці падазраваных затрымалі **Артура Дробата** і непаўналетнюю **Насту Залатухіну**. Хлопца адпусьцілі, ня склаўшы пратаколу, праз некалькі гадзінаў. Са словаў Насты, у райаддзеле ад яе патрабавалі прызнаньняў, палохаючы зьняволеньнем ды праблемамі з паступленьнем у ВНУ. Міліцыянты засьведчылі ў пратаколе, што дзяўчына папсавала дзяржаўную маёмасьць, і запатрабавалі зьявіцца на паседжаньне камісіі па справах непаўналетніх, аднак позву ня выпісалі.

### 30 ліпеня

#### Менск

Да жонкі праваабаронцы **Валянціна Стэфановіча** Аліны патэлефанавалі з Упраўленьня КДБ па Менску і вобласьці з прапановаю тэрмінова зьявіцца на гутарку, не патлумачыўшы прычыны. Жанчына адмовілася размаўляць бяз позвы і спыніла размову па тэлефоне. Раней прыбыткамі сям'і Стэфановічаў цікавілася падатковая інспэкцыя, а праваабаронцу выклікалі ў Дэпартамэнт фінансавых расьследаваньняў КДК Беларусі.

#### Горадня

Прадстаўнікоў партыі БНФ — **Сяргея Антусевіча** і **Вадзіма Саранчукова** выклікалі ва Ўпраўленьне КДБ па Гарадзенскай вобласьці для гутаркі наконт выбуху 4 ліпеня ў Менску. Абодва балятуюцца ў палату прадстаўнікоў. Больш за гадзіну правёў на допыце ў КДБ кіраўнік абласной суполкі партыі БНФ **Сяргей Мальчык**. Перадусім службоўцаў цікавіла, дзе той знаходзіўся 3 ліпеня.

#### Ворша

Супрацоўнікі міліцыі зьнялі зь цягніка аднаго зь лідэраў Аршанскай філіі незарэгістраванага «Маладога фронту» **Сержука Гумінскага**, які накіроўваўся ў Шклоў да сябра. Міліцыянты высьвятлялі асобу маладафронтаўца больш за дзьве гадзіны, дапытвалі яго наконт выбуху ў Менску. Міліцыянтаў таксама цікавіла вучоба С.Гумінскага, які навучаецца па праграме Каліноўскага, а таксама ягоная прыналежнасьць да моладзевых незарэгістраваных арганізацыяў.

### 31 ліпеня

#### Пухавічы

Пухавіцкі раённы суд аштрафаваў грамадзкага актывіста **Сяргея Абразоўскага** на 1750 тыс. руб. Яго абвінавацілі ў арганізацыі мітынгу 27 чэрвеня супраць будаўніцтва заводу па вытворчасьці пэстыцыдаў у пасёлку Дружны. Гэта ўжо трэці штраф Абразоўскаму. За мітынгі, якія адбыліся ўвесну ў пасёлках Дружны і Сьвіслач, зь яго спагналі 2 800 000 руб.

#### Полацак

Актывіста полацкай філіі незарэгістраванага «Маладога фронту» **Алеся Круткіна** забралі з кватэры супрацоўнікі міліцыі і адвезьлі ў Полацкі РУУС.

Супраць яго склалі адміністрацыйны пратакол паводле арт. 25.1 за няяўку па позьве ў ваенкамат. Пры канцы чэрвеня А.Круткін быў адлічаны з 1-га курсу гістфаку БДУ. Алесь, як пераможца рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі, паступіў ва ўнівэрсытэт без уступных экзамэнаў.

#### Смаргонь

Прэтэндэнтка ў кандыдаты ад АДС **Ірына Вештард** знайшла ў сваёй паштовай скрыні ўлёткі ад імя сябра яе ініцыятыўнай групы **Алеся Дзергачова** з просьбай пералічыць на яе кампанію 10 тыс. руб. За апошні час супраць кандыдаткі невядомыя зладзілі шэраг правакацыяў: дзьверы яе кватэры выпацкалі чорнай фарбай, зламалі замок, пабілі ў кватэры вокны, зьмясьцілі нумар мабільнага на сайце інтымных паслугаў, распаўсюдзілі па горадзе ўлёткі з заклікам перасылаць па 5 тыс. руб. на кампанію. І.Вештард зьвярнулася са скаргай у пракуратуру і акруговую выбарчую камісію. Пакуль безвынікова.

#### Віцебск

Настаўніцу віцебскай сярэдняй школы № 31 **Алену Каваленка**, жонку сябра КХП-БНФ **Сяргея Каваленкі**, апыталі праз тэлефон. Мужчына, які назваўся супрацоўнікам КДБ, цікавіўся тым, ці не была сям'я Каваленкаў у Менску 3 ліпеня. Таксама ён прасіў узгадаць, ці не прасілі вучні спн.Алены патлумачыць, як выраблять выбухоўку.

**СП**

# Ёсьць такая кніга

У Маскве на 90-м годзе жыцьця памёр знаны расейскі пісьменьнік Аляксандар Салжаніцын. Піша **Віталь Тарас**.

Чамусьці заўсёды, каб ацаніць маштаб асобы сучасьніка, нам патрэбная ягоная сьмерць. Менавіта нам, а не асобе, маштаб і веліч таленту якой у любым выпадку застануцца ў гісторыі — незалежна ад нашых прыватных меркаваньняў і дробных прэтэнзіяў.

Я не лічу сябе ў праве ацэньваць спадчыну клясыка расейскай літаратуры, тым болей, што ня ўсе ягоныя творы, шчыра кажучы, чытаў. Але «Архіпэляг Гулаг» Аляксандра Салжаніцына стаўся фактам майго асабістага жыцьця — як і жыцьця многіх тысячаў маіх сучасьнікаў.

Мне давялося прачытаць кнігу недзе ў сярэдзіне 1970-х. Чытаў, як і ўсе, каму выпадала такое шчасьце, усю ноч, без адрыву, бо трэба было раніцай перадаць кнігу наступнаму. Гэтага вымагалі яшчэ і меркаваньні бясьпекі. За трыманьне «Архіпэлягу» ў сябе дома можна было атрымаць, прабачце за таўталёгію, рэальны тэрмін заключэньня ў савецкім Гулагу. Адзін зь беларускіх мастакоў стаў невыязным ужо прыканцы 1970-х пасьля таго, як дзеля забавы вырашыў прывезьці з Парыжу тую кнігу. Вырашыў, што яму, мэтру, ляўрэату розных прэміяў, усё можна. Можна было, сапраўды, ужо даволі шмат. Але толькі ня гэта — не глыток праўды пра СССР.



**Аляксандар Салжаніцын**

(1918—2008) знаны расейскі пісьменьнік, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі. Аўтар мноства раманаў і аповесьцяў, спаміж найвядомейшых — «Адзін дзень Івана Дзянісавіча», «У крузе першым», «Архіпэляг Гулаг», «Ракавы корпус», гістарычная эпапэя «Чырвонае кола». У 1960-я і 1970-я пісьменьнік удзельнічаў у дысыдэнцкім руху, быў высланы з СССР. Вярнуўся ў Расею ў 1994 г.

Няма сэнсу пераказваць «Архіпэляг». Там шмат хібаў, як на сучасны погляд. Але мне запомнілася пачуцьцё ледзь не сьвятарнага жаху, якое мяне, юнака, тады ахапіла. Жаху нават не ад тае жудаснае праўды, якая нібы ўваччу паўставала са старонак кнігі. Жаху ад таго, што гэтую праўду нехта асьмеліўся напісаць — вось так, дробным чорным шрыфтам па белай, амаль што празрыстай паперы нейкага замежнага выдавецтва. Жах перамешваўся з захапленьнем ад таго, што ёсьць такая кніга! Ёсьць, нягледзячы ні на што. Яна выйшла на сьвет «из- под глыб», як пісаў Салжаніцын. Ніколі больш у жыцьці нічога падобнага я не адчуваў пры прачытаньні любой іншай кнігі, у тым ліку самвыдатаўскай.

Казаць сёньня, што ты нечага ня ведаеш пра сталінскія рэпрэсіі, пра сталінскую сыстэму, пра яе стваральнікаў — бальшавікоў на чале зь Леніным, якія стварылі Гулаг, пра злачынную прыроду камуністычнага рэжыму, немагчыма. Вазьмі кнігу і прачытай. І тады табе больш не захочацца, мабыць, ехаць на «Лінію Сталіна», удзельнічаць у амаральным маскарадзе на касьцях мільёнаў ахвяраў Гулагу. Вось толькі для таго, каб прачытаць, трэба спачатку набрацца мужнасьці жыць без ілжы. Да чаго заклікаў Салжаніцын у найлепшых сваіх творах.

# Інтэлігентны беларускі слэм

1 жніўня ў межах трэцяга міжнароднага фэстывалю паэзіі «Парадак словаў» у Менску, у фальварку «Добрыя мысьлі», адбыўся першы беларускі слэм. Пераможцам ў гэтым спаборніцтве быў прызнаны менскі паэт **Віктар Жыбуль**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Віктар Жыбуль.

Яму прысуджаны спэцыяльны прыз ад кіеўскага часопісу культурнага супрацоўленьня «ШО». Другога месца ўдастоеная беларуская паэтка і жонка галоўнага пераможцы Вера Бурлак. Трэцяе месца — у маладога магілёўскага паэта Віталя Рыжкова.

Як зазначыў арганізатар фэстывалю маскоўскі паэт Андрэй Новікаў, слэм — гэта асноўная падзея цяперашняга «Парадку словаў». Паэты, якія выступаюць на такіх мерапрыемствах, павінныя чытаць свае творы задзірліва, лічыць ён.

«Яны прапануюць найперш манэру чытаньня, а ня якасьць тэкстаў», — сказаў А.Новікаў і дадаў, што ва ўсім сьвеце паэтычныя слэмы заўсёды маюць посьпех у публікі.

Беларускі паэт і вядоўца мерапрыемства Андрэй Хадановіч лічыць, што «Парадак словаў — 2008» унікальны ўжо тым, што ў ім удзельнічаюць літаратары з Расеі, Украіны, Таджыкістану.

«Слэм — гэта ня проста паэзія, — кажа А.Хадановіч. — Гэта шоў, у якім аўтар гаворыць ня толькі тэкстам, але і рухам цела, інтанацыямі. Тут важны артыстызм. Я мяркую, што беларускі слэм у любым выпадку будзе адрозьнівацца ад падобных мерапрыемстваў у іншых краінах найперш інтэлігентнасьцю».

**БелаПАН**

## СЬЦІСЛА

### Захару Шыбеку – 60



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

30 ліпеня споўнілася 60 гадоў аднаму з найвыбітнейшых гісторыкаў сучаснасьці Захару Шыбеку. Спадар Шыбека, аўтар многіх кніг і артыкулаў, найперш прысутнічае ў сьвядомасьці сваіх сучасьнікаў як вялікі знаўца гісторыі гарадзкой цывілізацыі беларусаў. Кнігі сп.Шыбекі, прысьвечаныя мінуламу Менску, рэканструююць тыя старонкі нашай гісторыі, якія былі адсунутыя ад увагі ягоных папярэднікаў, то праблемамі клясавай барацьбы, то пытаньнямі культурнага жыцьця. Захар Шыбека адказвае на тыя пытаньні, на якія будуць адказваць і праз дзьвесьце гадоў: які жылі нашыя продкі, якімі былі іхныя будні і сьвяты.

Чытаючы ягоныя працы, я заўсёды праводжу паралель між мінулым і сёньняшнім. Бо мы таксама — месьцічы. І ў нас — тыя ж праблемы. І як пашанцуе нам, калі нашай штодзённасьцю зоймецца такі ж добрасумленны і дапытлівы дасьледчык, як Захар Васільевіч.

Зь юбілеем Вас, мэтар!

**Аляксандар Фядута**

### Слоўнік мовы «Нашай Нівы». Новы том

У выдавецтве «Тэхналёгія» выйшаў новы, другі па ліку, том «Слоўніка мовы «Нашай Нівы». У ім зьмясьціліся ўжываныя ў першай беларускай газэце ў 1906—1915 гг. лексычныя адзінкі — ад слова «Дэкляраваць» да слова «Народ».

Слоўнік мовы «Нашай Нівы». — Менск: Тэхналёгія, 2008.

### У Асьвеі шукаюць Атлянтыду

У Асьвеі стартаваў пленэр «У пошуках Атлянтыды». Сёлета мастакі з усяе Беларусі сабраліся на акцыю ў чацьверты раз.

У мінулыя гады пленэр праводзіўся ў Лявонпалі, Дзісьне й Друі. Ідэя пленэру — сабрацца ў некалі вядомых і славутых, а цяпер амаль забытых гарадах і мястэчках Беларусі й нібыта наноў адкрываць іх.

У пленэры бяруць удзел каля 25 мастакоў. Пасьля створаныя працы мяркуюць паказаць на выставе.

### Гурт N.R.M. выклаў рарытэтную песьню, каб дапамагчы Мішы Ларыну

Гурт N.R.M. далучыўся да дабрачыннай акцыі, скіраванай на збор сродкаў на апэрацыю па перасадцы сэрца для Міхася Ларына. На сёньня з патрэбных для апэрацыі 350 тысячаў эўра добрыя людзі ахвяравалі пакуль дзясятую частку грошай. Раней да акцыі далучыліся гурты J:МОРС, «Крамбамбуля» ў дуэце з Русяй, этна-трыё «Тройца», «Тяни-толкай», Аляксей Хлястоў.

N.R.M. выклаў у сеціве для вольнага пампаваньня рарытэтную песьню «13». «Песьня на студыйныя альбомы N.R.M. не патрапіла, — расказвае Лявон Вольскі. — Мы яе выканалі на акустыцы 10 гадоў таму. Адтуль і запіс».

Удзельнікі гурту спадзяюцца, што іхная песьня дапаможа сабраць грошы для Мішы Ларына.

Пералічыць грошы Міхасю вельмі проста — дастаткова зайсьці ў любое аддзяленьне «Беларусбанку» й мець з сабой рэквізыты ягонага рахунку:

Філіял 511 ААТ «ААБ Беларусбанк», код 815 УНП 100349858 р/с 3819382103561 для пералічэньня на рахунак №01000019 для Ларына Міхася.

# Дыктатура ў тэлеэфіры

ВВС і Аль-Джазіра зьнялі грунтоўныя рэпартажы пра Беларусь

Лета — мёртвы сэзон у палітыцы. Нягледзячы на гэта, у замежных мэдыяў нечакана прачнулася цікавасьць да Беларусі. Ажно дзьве буйныя тэлекампаніі — ВВС ды Аль-Джазіра (яе брытанскі філіял) выправілі сваіх карэспандэнтаў у нашую краіну. У выніку выйшла вялікая падборка мультымэдыйных матэрыялаў — тут і відэа, і радыёрэпартажы, і фота з тэкстам. Але наколькі дакладна і даходліва здолелі журналісты патлумачыць сваім гледачам сытуацыю ў Беларусі?

### ВВС: зноў пра дыктатуру

«Апошняя дыктатура Эўропы» — такую досыць неарыгінальную назву мае дакумэнтальны фільм пра Беларусь, зьняты тэлекампаніяй ВВС. «Многія краіны былога СССР зьмяніліся радыкальна, але Беларусь, здаецца, застрала ў часе», — кажа журналістка Люсі Эш у той час, як па экране ідуць кадры, зьнятыя з гатэлю «Юбілейны». Ранішні Менск выглядае як пустэльня. Неабазнаны замежнік можа вырашыць, што ў нас на вуліцах няма ні машынаў, ні людзей.

Першае інтэрвію — з Ганнай, актывісткай БРСМ, якая ў сваім небагатым студэнцкім пакойчыку рыхтуецца да ўдзелу ў парадзе 3 ліпеня. Старанна, нібы тэму на экзамэне, Ганна тлумачыць, што «гэта сапраўды вялікае сьвята для нашай краіны», бо 3 ліпеня Беларусь была вызваленая ад фашызму. «Ці Вы дагэтуль так шмат думаеце пра гэтыя падзеі?» — зь лёгкім зьдзівам пытаецца журналістка. «Гэта асабліва складана для мяне, у мяне дзед загінуў», — адказвае дзяўчына, ня ў сілах стрымаць раптоўныя сьлёзы. — «Гэта… у ягоную памяць… Для яго». — «It's ok», — супакойвае карэспандэнтка дзяўчыну, пакуль тая змахвае сьлязіны, але гутарка ўжо ня клеіцца: ад нечаканага напліву пачуцьцяў Ганна ледзь можа размаўляць.

«Вайна пакінула глыбокія сьляды ў псыхалёгіі беларусаў, стварыўшы адчуваньне пэрманэнтнай нестабільнасьці», — кажа журналістка, назіраючы за парадам. Недзе там выступае Ганна — шрубік у ідэалягічнай машыне. «БРСМ — гэта абноўленая вэрсія камсамолу», — тлумачыць Люсі Эш, пакуль па экране скачуць гімнасты ды ляцяць гелікоптэры. Але раптам вялізная далонь ахоўніка захінае аб'ектыў камэры: апэратар ВВС паспрабаваў быў зьняць браніраваны «мэрсэдэс», у якім Лукашэнка зьяжджае з параду, прысьвечанага выгнаньню фашыстаў.

Увечары журналістка знаходзіць Ганну ў натоўпе людзей, якія назіраюць за фаервэркам. Выбух, які адбыўся незадоўга пасьля гэтага, журналісты зьняць не пасьпелі. Затое адразу пасьля таго, як пачынаюцца арышты, Люсі Эш скіроўваецца зь Нінай Шыдлоўскай на пошукі ейнага мужа, Міраслава Лазоўскага. Потым апэратар ВВС цудам прасьлізгвае ў суд, дзе ідзе працэс над маладой апазыцыянэркай Палінай. Пасьля вызваленьня Паліна едзе на лецішча, дзе сям'я зьбіраецца разам. «Малайчына!» — кажа бацька, цалуючы дачку. «Павінен нехта змагацца, але калі ня мы — то хто?» — кажа Павал, брат Паліны, і, разам з журналістамі скіроўваецца на дах панэльнага дому, дзе вывешвае эўрапейскі ды нацыянальны сьцягі. Спускаючыся з даху, Павал нават чапляе свой уласны замок на клетцы, якая вядзе на дах — каб перашкодзіць тым, хто будзе здымаць сьцяг. «Хітра. Але ці гэта эфэктыўна? — запытваецца скептычная карэспандэнтка. — Многія ігнаруюць такія пратэсты як непатрэбныя. Беларусь вонкава не падобная да паліцэйскай дзяржавы». На адной зь менскіх будоўляў Люсі Эш сустракаецца з амбітным функцыянэрам БРСМ. Як і варта было чакаць, той распавядае журналістцы пра стабільнасьць, моцную дзяржаву і апазыцыю, якая смокча грошы з Захаду.

Дарэчы, Люсі Эш здолела адшукаць цэлы лясны лягер апазыцыі. Гэта летнік хрысьціянаў веры эвангельскай, тых самых, якіх спрабуюць пазбавіць будынку царквы ў Менску. «Калі людзі разам, то ўрад нас пабойваецца, але калі кожны сам па сабе, то ўрад ня мае страху перад імі, — на цудоўнай ангельскай зь мяккім амэрыканскім акцэнтам кажа журналістцы Караліна, 14-гадовая дачка пастара.



— Усё можна зьмяніцца за адну ноч.

«Магчыма, Лукашэнка так доўга пратрымаўся ва ўладзе таму, што апазыцыя падзеленая. А можа быць і таму, што сьвет лічыць, што беларускімі справамі мусіць займацца найперш Расея. Як бы там ні было, але апошні дыктатар Эўропы не зьбіраецца здавацца ў найбліжэйшай будучыні», — робіць выснову журналістка.

Ад ВВС чакаеш арыгінальнага падыходу да асьвятленьня Беларусі, але рэпартаж Люсі Эш мала чым выбіваецца з шэрагу падобных матэрыялаў, якія гады ў рады ствараюць заходнія журналісты. Зрэшты, журналістка сапраўды намацвае глыбокія тэмы. Вось, напрыклад, Ганна, маладая актывістка БРСМу. Хто яна — зьбітая з панталыку прапагандай дзяўчынка, якая старанна наводзіць макіяж, а праз сэкунду ўжо ня можа вымавіць і слова ад плачу? Ці чалавек, для якога сьвяткаваньне 3 ліпеня — адзіная магчымасьць выплеснуць свой боль, аддзячыць дзеду, забітаму фашыстамі? Цікавыя таксама спробы пераасэнсаваць эфэктыўнасьць апазыцыйнай дзейнасьці — гэта нешта новае для заходняй журналістыкі, якая схільная гераізаваць нашых апазыцыянэраў. Але глыбей Люсі Эш капнуць не ўдаецца, бо абмежаваньні тэлефармату няўмольна гоняць яе ад адной тэмы да іншай, не даючы засяродзіцца. Дарэчы, радыёрэпартаж Люсі Эш, зроблены для радыёстанцыі ВВС-4 падаецца нашмат больш зьмястоўным ды маляўнічым за тэлевэрсію.

### Аль-Джазіра: у гасьцях у Якубовіча

Мы звыкліся лічыць, што Аль-



Джазіра — гэта Бін Ладэн з «калашнікавым», талібы ў чалмах ды незразумелая вязь арабскіх іерогліфаў. Насамрэч жа, гэта цалкам рэспэктабэльны, лібэральны ды па-заходняму прафэсійны тэлеканал, які надае, у тым ліку, увагу Беларусі.

Перадача Listening Post — гэта 20 хвілінаў эфірнага часу, цягам якіх вядоўца ў студыі прэзэнтуе відэаматэрыялы, прысьвечаныя адной тэме, у нашым выпадку — Беларусі. Рэпарцёр Аль-Джазіры Сайман Астроўскі прывёз зь Беларусі ажно два вялікія сюжэты — адзін пра стан беларускіх мэдыяў, а другі — пра тое, як дзяржава сваёй навязьлівай падтрымкай замінае музыкам працаваць.

Параўноўваючы рэпартажы ВВС і Аль-Джазіры, нельга не ўсьміхнуцца: мы зноў бачым кадры ранішняга Менску, зноў мінімум руху на вуліцах, хіба што ў гэтым выпадку апэратар узьлез не на «Юбілейку», а на гатэль «Беларусь». Здаецца, відэашэраг рэпартажаў наўпрост залежыць ад таго, у якім гатэлі спыняюцца журналісты. «Гэтае месца лічыцца апошняй дыктатурай Эўропы», — чуецца голас журналіста за кадрам пад акампанэмэнт злавеснай музыкі.

Сымон Астроўскі мае намер разабрацца, ці сапраўды Лукашэнка спрабуе выправіць стасункі з Захадам — на прыкладзе беларускіх мэдыяў. Пачынаецца ўсё ў Берасьцейскай фартэцыі, дзе ідзе сустрэча Пуціна ды Мядзьведзева. Кадры трапляюцца сапраўды анэкдатычныя. Вось, напрыклад, эпізод, у якім Павал Лёгкі, прэс-сакратар Лукашэнкі, так старанна апякуецца журналістамі, што сам хапае штатыў ад відэакамэры апэратара Аль-Джазіры ды падбегам нясе яго да месца прэс-канфэрэнцыі. Але гэтая ідылія падманлівая. Спроба Саймана задаць незапланаванае пытаньне Лукашэнку правальваецца. «На беларускіх прэс-канфэрэнцыях няма калі задаваць пытаньні», — робіць выснову журналіст.

Пачуўшы пра тое, што ў парлямэнце разглядаецца новы закон аб СМІ, Астроўскі кіруецца ў Менск. Алесь Анціпенка ў офісе Беларускай асацыяцыі журналістаў тлумачыць гледачам Аль-Джазіры падводныя камяні новага закону. «Але ў Беларусі нават проста паведамляць пра навіны таксама можа быць небясьпечным», — заўважае рэпарцёр і скіроўваецца ў рэдакцыю «Нашай Нівы», дзе бярэ інтэрвію ў Андрэя Лянкевіча ды Сямёна Печанка, якія былі арыштаваныя ў часе сёлетняга Дня Волі.

Выслухаўшы адзін бок, Сымон Астроўскі скіроўваецца за лінію мэдыйнага фронту — да Паўла Якубовіча. Раскоша кабінэта галоўнага рэдактара «СБ. Беларусь Сегодня» ўражвае. Патанаючы ў глыбінях скуранога фатэля, Сымон Астроўскі слухае аповед Паўла Якубовіча, які папыхвае сваёй нязьменнай люлькай. «Я не магу крытыкаваць дзейнасьць прэзыдэнта, — прызнаецца галоўны рэдактар. — Таму што прэзыдэнцкая адміністрацыя зьяўляецца суўладальніцай маёй газэты».

«Я прыехаў сюды з адкрытым сэрцам, спадзеючыся, што прэзыдэнт сапраўды вырашыў зьмяніць нешта да лепшага», — зь лёгкім сумам у голасе кажа Сымон Астроўскі, якога спыніў мажны ахоўнік на плошчы Незалежнасьці. «Але пакуль правяралі мае паперы, я зразумеў, што гэтай краіне яшчэ далёка да таго, каб скінуць свой савецкі імідж».

Бонусам да рэпартажу ў праграме Listening Post ідзе рубрыка «Галасы сусьветнай вёскі», дзе брытанскія эк-



спэрты кажуць пра праблемы Беларусі. Ляйтматыў такі: абмежаваньні свабоды мэдыяў у доўгатэрміновай пэрспэктыве ня будуць мець плёну. Акрамя гэтага паказваюць невялікую падборку інфармацыі пра непадцэнзурную палітычную флэш-анімацыю, фільм Юр'я Хашчавацкага «Плошча», «Белсат» і стан інтэрнэту ў краіне. Нарэшце, гледачам прэзэнтуюць другі рэпартаж Саймана Астроўскага. «У Беларусі хапае адзнакаў таго, што ты знаходзісься ў Беларусі», — саркастычна кажа рэпарцёр, стоячы на праспэкце Пераможцаў, дзе дамы пярэсьцяць чырвона-зялёнымі транспарантамі. Гэта датычыцца і радыёхваляў, дзе 75% музыкі павінна быць беларускай. Але, як выяўляецца, гэтым станам мала хто задаволены.

Вось саліст гурту «Атлянтыка» грае на фартэп'яна ў рэстарацыі. Сытуацыя на радыёхвалях яго не задавальняе: круцяць часьцей, але папулярнасьць падае. Астроўскі ідзе ў студыю радыё «Бі-Эй», дзе дыджэі скардзяцца на тое, што слухачы ня хочуць слухаць беларускіх музыкаў, а тыя, у сваю чаргу, ня могуць прапанаваць якасных трэкаў. Таму, маўляў, даводзіцца шукаць беларускія карані ў замежных выканаўцаў.

Рэпарцёр Аль-Джазіры, аднак, трапна заўважае, што ў сваіх пошуках дыджэі часьцяком не заўважаюць гуртоў, якія сьпяваюць па-беларуску. Пра гэта кажа і Лявон Казакоў, які піша песьні для фолкавага гурту «Рокаш», і Піт Паўлаў з N.R.M.

«Правіла 75% мусіла зьменшыць замежны ўплыў і зрабіць радыё больш беларускім. Але ў выніку падтрымку атрымліваюць толькі тыя, хто капіюе замежную музыку, а ўсе астатнія прыціскаюцца», — робіць выснову Сайман Астроўскі.

На дэсэрт дыктар Listening Post прапануе гледачам кліп «Слухай бацьку» — «песьню, якую Аляксандар Лукашэнка не стамляецца слухаць, бо яна напісаная адмыслова пра яго».

### Высновы

У адрозьненьне ад Люсі Эш з ВВС, якая збольшага застаецца за кадрам, Сайман Астроўскі робіць рэпартаж як актыўны журналіст-вандроўнік. Калі рэпартаж ВВС — гэта, хутчэй, дакумэнтальны фільм, дык матэрыялы Аль-Джазіры — гэта асарці, спроба ахапіць беларускую сытуацыю, даючы гледачу максымум інфармацыі. Прыемная акалічнасьць: Аль-Джазіра выкладае свае матэрыялы на дэмакратычным інтэрнэт-сэрвісе YouTube, а ВВС трымае іх на ўласным сайце, адкуль відэа ніякім гвалтам не спампуеш.

Нельга ня цешыцца з таго, што замежныя мэдыі зьвяртаюцца да беларускіх тэмаў. Тым больш, што яны спрабуюць знайсьці новыя ракурсы погляду на нашую краіну. Разам з тым, рэпартажы ВВС ды Аль-Джазіры ў поўнай ступені працягваюць традыцыі «рэпарцёрскага турызму», калі карэспандэнты прылятаюць у Менск на некалькі дзён з заданьнем расказаць пра «апошнюю дыктатуру Эўропы», што заўжды робіцца паводле аднаго сцэнару: сустрэчы зь дзеячамі апазыцыі, гутарка-другая з функцыянэрамі Лукашэнкі ды паказ усюдыіснай саўковасьці лукашэнкаўскай Беларусі. Проста праклён нейкі: плошча Незалежнасьці вабіць заходніх журналістаў як ліхтар матылькоў, што немінуча заканчваецца праверкай дакумэнтаў ды патрабаваньнем ахоўнікаў адключыць відэакамэры. А яшчэ шкада, што заходнія журналісты амаль ніколі не наважваюцца выехаць за межы сталіцы. Пабачыўшы вёску, яны маглі б адкрыць для сябе зусім іншую Беларусь.

**Алесь Кудрыцкі**

# Падарожжа на Радзіму герояў

Шурычы–Якушоўка. Радзіма Гадлеўскага, радзіма Каліноўскага. Піша **Андрэй Павач**.

Дарога з Горадні ў Шурычы заняла менш за паўтары гадзіны. Паўтары гадзіны машынай, выходзіш у агароды вясковых гаспадароў, далей мэтраў сто ніколі не аранага ўзьлеску і — высачэзная сьцяна Белавескай пушчы. Гэтая цёмна-зялёная яловая сьцяна цягнецца ўправа і ўлева колькі хапае вока і стварае ўражаньне, быццам стаіш пад мурамі нейкага таемнага старажытнага гораду, куды людзей з нашага сьвету наагул не пускаюць. Крыху нават боязна і дзіву даесься, як хутка перад такой магутнасьцю забываесься аб тым, што яшчэ зусім нядаўна ехаў тралейбусам па пыльных вуліцах вялікага гораду.

У Шурычах з часоў, калі тут у сям’і вядомага сталяра Яна Гадлеўскага нарадзіўся сын Вінцэнт, зьмянілася ня так і многа. Тая самая пушча за вокнамі, тая самая чыстая беларуская гаворка з крыху оканьнем на канцы (дзядзько) нават у нешматлікай моладзі... Праўда гумны ўжо ня крыюць саломай на чатыры бакі без шчытоў, няма і той курнай хаты, дзе маленькі Вінцэнт, як ён сам пасьля пісаў, год пасьля нараджэньня качаўся ў дыме. Родную хату Вінцэнта Гадлеўскага спалілі ў 1915 г. казакі, якія, адступаючы перад немцамі, пакідалі пасьля сябе «выпаленую зямлю». На яе месцы дзядзька ксендза (у Шурычах гавораць менавіта «ксендз» а ня «ксёндз») Адам Гадлеўскі яшчэ недзе ў пачатку 1920-х паставіў новую хатку. Менавіта яна, прыстасаваная цяпер адным зь вяскоўцаў пад майстэрню, была для ксяндза прыстанішчам падчас ягоных прыездаў на Радзіму ў 1920—1930-х.

Нікога з Гадлеўскіх у Шурычах цяпер не засталося. Род выгас. Нашчадкі дзьвюх сясьцёр ксяндза жывуць па ўсёй Беларусі, і, мабыць, мала хто зь іх ведае пра сваяцтва з адным зь лідэраў беларускага нацыянальнага руху першай паловы XX ст. У вёсцы добра памятаюць бязьдзетнага майстра па дрэве Адама, брата бацькі ксяндза, які памёр пасьля вайны і чыю магілу, таксама як магілу Яна Гадлеўскага, нам не пашчасьціла адшукаць на могілках у Поразаве. Аднак памяць пра сябе Гадлеўскія пакінулі ў Шурычах добрую: «Ксендз быў надта здольны да навукі чалавек. Але ўсе Гадлеўскія былі здольныя да ўсяго, і да навукі, і да работы», — успамінае Анэля Дзямянчык, якой наступнай вясною споўніцца дзевяноста гадоў. Гэта праўда, паколькі зробленымі дзядзькам ксяндза шафкамі і столікамі і цяпер ганарацца многія шурычаўцы. Зь цеплынёй і гонарам успамінае бабуля Анэля і ксяндза Вінцэнта: «Ксяндза Гадлеўскага помню добра. Помню, як ксендз прыяжджаў у Шурычы, і мы малыя на яго выходзілі глядзець. Быў высокага росту, хадзіў у сутане і калі ішоў па Шурычах, то вітаўся і размаўляў з усімі па-беларуску. Раней, калі зь вёскі быў ксендз, то лічылася надта добра, а калі ў каго з роду быў ксендз, то таму роду быў вялікі пачот».

Жыхары поразаўскай парафіі лічаць сябе палякамі і трымаюцца сваёй дэкляраванай польскасьці моцна. Шляхта, як-ніяк. Помню, як летам 2005 году адзін з кіраўнікоў сьвіслацкай вэртыкалі заломваў рукі ад гора, што ня можа выканаць заданьня — знайсьці двух дэлегатаў ад Поразава на «польскі» зьезд у Ваўкавыску, што плянаваўся тады да правядзеньня ўладамі. Тым ня менш сваю штодзённую беларускасьць прызнаюць без ваганьняў, чым адрозьніваюцца ад каталікоў з-пад Сапоцкіна, ці хоць бы Бераставіцы. «Вінцэнты быў беларускі ксендз, — успамінае Анэля Дзямянчык, паклаўшы рукі ў цэляфанавы пакунак, у якім трымае ружанец, — усё па-беларуску рабіў, а ў нас то ў Поразаве быў Рэўновіч, то усё было па-польску. Тады ўсё — школа, гміна, касьцёл было па-польску. Але мы як выбежым на перапынак, то па-свойму, па-беларуску гаворым. Тады па-простаму называлася. А так у касьцёле ці ў гміне па-польску. Кніжак ад Вінцэнтага ня помню, але абразкі і малітвы ўсякія ён даваў і вучыў. Помню «Гожке жале» вучыў так: «Горкі жаль няхай прыбудзе, няхай сьцісьне сэрца грудзі…»

Шурычаўцы нешта ўжо чыталі пра свайго знакамітага аднавяскоўца, таму прымаюць выдадзеныя гэтым летам у Маладэчне паштоўкі зь ягонай выявай без зьдзіўленьня. Маўляў, так і павінна быць. Увогуле цікава і радасна назіраць, як нешматлікія цяпер землякі ксяндза ўспрымаюць ягоную асобу. Ён для іх не герой, а хутчэй напаўзабыты аднавяскоўвец, якім яны, тым ня менш, ганарацца і з ахвотай паказваюць усё, што зьвязана зь ягоным жыцьцём. Маюць яны нават сваю ўласную вэрсію сьмерці ксяндза. Як кажа былы настаўнік матэматыкі сямідзесяцігадовы Эдуард Шчасюк: «Ксендз Гадлеўскі быў за Беларусь. Калі прыйшлі немцы, то ён думаў Беларусь разам зь імі строіць, а пасьля як убачыў, што яны робяць, то сказаў ім: «Вы тут разьвялі цірор». Падпарцізаньваць пачаў. То яны яго і забілі». Расказваюць яны аб сьмерці ксяндза, спасылаючыся на словы Марыі Гуштын, ягонай сваячкі па адной з бабуляў. Марыя Гуштын у якасьці санітаркі брала ўдзел у Варшаўскім паўстаньні і пасьля яго падаўленьня была ў палоне аж у Брэслаўлі. Дажывала яна ў Польшчы, аднак падчас сваіх прыездаў на Радзіму расказвала, што бачыла, як напярэдані паўстаньня немцы расстралялі ксяндза Вінцэнта ў Варшаве. Быццам цела ксяндза некалькі дзён ляжала некранутым, пакуль яго ня выкралі польскія падпольшчыкі і таемна не пахавалі...

Ад Шурычаў да Якушоўкі, калі не заяжджаць у Сьвіслач, усяго кілямэтраў сямнаццаць. Дарога ідзе ўскрайкам пушчы, і Алег Сяргеевіч, сьвіслацкі інтэлігент, якога мы захапілі з сабою для трывалейшага знаёмства з шурычаўцамі, расказвае, як жыхары пушчанскіх вёсак часта знаходзяць на сваіх сотках... зуброў. Тыя качаюцца па зямлі і нікуды не адыходзяць нават убачыўшы людзей. Словам, адна пакута з гэтымі ляснымі гаспадарамі.

Якушоўка не захапляе нічым новым. Тыя самыя зарослыя шыпшынай і верасам падмуркі сядзібы Каліноўскіх, адно толькі надвор’е крыху весялейшае, чым звычайна ў кастрычніку, калі даводзіцца завітваць сюды разам зь іншымі гарадзенцамі.

Мы цяпер самі глухі вугал вобласьці, — кажа Алег Сяргеевіч, — на дваццаць восем тысячаў жыхароў раёну ніводнага прамысловага прадпрыемства, нават харчовага. Пасьля мінулагодняй гісторыі з жоўтым фосфарам на Львоўшчыне Ўкраіна забараніла перавозіць гэтае рэчыва праз сваю мяжу і цяпер уся плынь з яго ідзе з Казахстану ў Эўропу праз нас. Любяць гаварыць пра турызм, але рэальныя пэрспэктывы амаль нулявыя. Занадта шмат праблемаў для замежнікаў зь візамі, ды і што ім паказваць апроч пушчы, а і там трэба гатэлі, месцы для адпачынку... Цэнтральным аб’ектам інфраструктуры ў раёне, канечне, павінен быць музэй Кастуся Каліноўскага ў Якушоўцы, куды б народ пацёк ня толькі зь Беларусі, але і з-за мяжы. Але ж самі ведаеце, што пра яго цяпер пішуць. І ў нас пра яго стараюцца многа не гаварыць, адразу ахрысьцяць «бэнээфаўцам».

Яно і праўда, цяпер галоўны прадмет экспарту са Сьвіслаччыны — знакамітая пушчанская самагонка, якую ледзь не цыстэрнамі ад малаказавозаў вараць мясцовыя спэцыялісты. Усё быццам застыгла ў чаканьні чагосьці невядомага — напаўразбураны велізарны касьцёл у Вялікай Бераставіцы, цэркаўка ў Алекшыцах, на званах якой дасюль бачныя сьляды ад куляў польскіх паліцыянтаў, якія ў 1930-м г. стралялі па мітынгуючых сялянах, усе абшары палёў і пералескаў паміж Горадняй і Сьвіслаччу, па якіх ноччу гуляюць прывіды зь сьвіслацкай «Алеі Герояў» — Каліноўскі і Траўгут у пары з Леніным і Сталіным.

**Горадня—Сьвіслач—Шурычы—Якушоўка—Горадня**



СЯМЁН ПЕЧАНКА

# Пераплаўка



Не было намеру гэтым разам пісаць падарожныя нататкі. Які сэнс апісваць Курскую касу, калі прыгажосьць гэтых мясьцінаў ужо тысячу разоў апісаная ў кнігах, даведніках, фотаальбомах, зьнятая ў фільмах? Той выпадак, калі нешта ўнікальнае, размножанае ў тысячах фатаздымкаў, ператвараецца ў крыху зашмальцаваную турыстычную паштоўку. Але непаўторнае ад гэтага не перастае быць непаўторным. Ды гэтыя нататкі не пра прыроду. Дакладней, ня толькі пра яе.

## Геаграфічная памылка

...Апоўдні, у моры ля берага, на якім загараюць пад летнім сонцам дзясяткі людзей, зьяўляецца неведама адкуль вялікі баклан. Пляжнікі падхопліваюцца, пачынаюць здымаць птушку на фота й відэа. Баклан павольна выкараскваецца з вады на пясок, выдае кароткі рыпучы гук і пачынае ўперавалку, нібы марак, шпацыраваць па пляжы. Яго абступаюць з усіх бакоў, кідаюць веслаēногай птушцы кавалкі батону, цукеркі. Баклан не рэагуе. Калі цікаўных становіцца вакол зашмат, ён раптам растапырвае крылы — пужае. Не дачакаўшыся нармальнага пачастунку (хутчэй за ўсё, сьвежай рыбы), птушка павольна вяртаецца ў родную стыхію і гэтаксама нечакана, як зьявілася, зьнікае ў марской прасторы. Гэта не яна тут выпадковая госьця, а мы...

Побач на касе, на беразе Курскай затокі — адно з самых буйных гнёздаў чапляў і бакланаў у Эўропе. Нэрынга (тэрыторыя касы ад Клайпеды да Ніды, за якой пачынаецца ае расейская частка) вось ужо амаль 20 гадоў як абвешчаная Нацыянальным паркам Літвы.

Тут пачынаюцца ня толькі геаграфічныя — гістарычныя дзівосы. Паўднёвая частка касы, а таксама Калінінград (Кёнігсбэрг, Каралявец) былі далучаныя да Расейскай Фэдэрацыі ў выніку разгрому гітлераўскай Нямеччыны. Але ж абедзьве часткі касы да Другой сусьветнай вайны належалі Нямеччыне, а Клайпеда, перададзеная рашэньнем Лігі нацыяў Літве ў 1929-м, датуль называлася Мэмэлем. Таксама як і з 1939-га па 1945-ы.

Мэмэль, дарэчы, — нямецкая назва нашага Нёману. Старадаўнія тэўтоны некалі памылкова вырашылі, што Курская затока ёсьць дэльтай ракі, не працягам.

А цяперашняя дзяржаўная мяжа пасярод касы, як гэта ні дзіўна, паўтарае колішнюю сярэднявечную мяжу. Паўночная частка касы была некалі ленам мэмэльскіх баронаў, а жыхары паўднёвых вёсак плацілі падаткі Кёнігсбэргу. Так што мяжа была чыста эканамічная. У выніку пэўнай адасобленасьці паўночнай часткі там сфармавалася народнасьць куршынінкі, якія ня мелі дачыненьня да старажытнага племені куршаў і гаварылі на адным з латыскіх дыялектаў. Побыт, звычаі, традыцыі куршынінкаў шмат у чым адрозьніваліся і ад нямецкіх і ад жмудзкіх. Узоры іх народнай творчасьці, у тым ліку незвычайнай прыгажосьці флюгеры, кожны зь якіх — цэлая паэма, можна бачыць цяпер толькі ў музэях. У паваенныя гады — у той час, як у Клайпеду ехалі з усяго Савецкага Саюзу — Курскую касу асвойвалі жыхары ўсіх раёнаў Літоўскай ССР. Якой Сталін пасьля вайны падараваў Віленскі край.

Але досыць гістарычных экскурсаў.

Для мяне падарожжа ў Нэрынгу было, хутчэй, падарожжам ва ўласнае дзяцінства. Самым моцным уражаньнем тады быў паром, на якім вось ужо некалькі стагодзьдзяў перапраўляюцца падарожнікі з Клайпеды і назад. Дарэчы, паром па-літоўску — pierplauka. Гучыць амаль па-беларуску: як пераплаў ці пераправа.

Амаль праз сорак гадоў пасьля майго першага знаёмства з тым паромам два беларускія падарожнікі-небаракі на аўтамабілі шукалі ў адносна невялікай Клайпедзе тую «перплаўку» больш за гадзіну. Бо мелі неасьцярожнасьць запытацца дарогу «да парому» у нейкай сустрэчнай спадарыні за рулём шыкоўнага аўто. Яна зь ветлівай усьмешкай паказала ў той бок, куды падарожнікам, як потым высьвілася, было зусім ня трэба. Спадарыня не падманула, проста ў клайпэдзкі порт цяпер рэгулярна ходзяць вялікі паром зь Нямеччыны. Трэ было шукаць у горадзе ўказальнікі не на парам, якіх у Клайпедзе некалькі, а проста на Нэрынгу.

## Недакуркі ў нацпарку

На пачатку 1970-х даваўся пабываць у Калінінградзе, а таксама на касе — у Зеленагорску ці Сьветлагардзе — цяпер ужо ня памятаю, дый запомніць гэтыя безабліччыя назвы, якімі адмыслова назвалі ўсе нямецкія гарады й вёскі былой Усходняй Прусіі, немагчыма.

Тады ўражвалі руіны й паўсюдная запусьценьне, як быццам пасьля вайны прайшло на той час ня чвэрць стагодзьдзя, а некалькі гадоў.

Цікава, канечне, было б параўнаць цяперашняе жыцьцё на касе ў Літве і ў Калінінградзкай вобласьці. Але ж пэрспэктыва чарговага памежнага кантролю прымусіла ад гэтай ідэі адмовіцца.

Не сказаць, што з «эўрасаюзаўскага» боку мяжы на касе ўсё ідэальна. Пра тамтэйшыя цэны ў сэзон адпачынку лепш прамаўчаць. Але сумна было бачыць па дарозе на мора праз цудоўны бор, як абапал яе штодня прыбаўляецца недакуркаў, цыгарэтных пачкаў, плястыкавых бутэлек, хоць скрыняў для сьмецьця на пляжах там хапае. А між тым, нумары аўтамашынаў на вуліцах прыбярэжнага мястэчка амаль спрэс літоўскія. Зрэдку трапляліся латвійскія і эстонскія (для эстонцаў Курская каса — сапраўдны Поўдзень). Пару разоў трапляліся расейскія нумары. Расейскую мову таксама можна было зрэдку пачуць, як і польскую ці нямецкую. Так што савецкасьць, ці дакладней сказаць — адсутнасьць культуры, ня ёсьць чыёйсьці нацыянальнай рысай. Гэта, так бы мовіць, стан душы. У прыватным доме ці гатэлі нікому ня прыйдзе да галавы раскідаць сьмецьце. А ў «нічыйным» лесе (нацыянальным парку), калі ніхто цябе ня бачыць — чаму б і не?

Уявіць сабе завалы бруду, якія можна бачыць амаль паўсюдна ў Беларусі ў «зонах адпачынку», у нашых заходніх суседзяў, зразумела, немагчыма. Але ж і спадзявацца, што з набыцьцём незалежнасьці ці нават з перамогай дэмакратыі ў Беларусі назаўтра ўсё зьменіцца да лепшага — рэкі ды азёры станучь чыстымі, усе станучь адразу ветлівымі й сьціплымі, палюбяць родны край і ўласную гісторыю, загавораць на роднай мове, не даводзіцца.

Што праўда, з роднаю моваю праблемы ў літоўцаў няма. Яна, дарэчы, абвешчаная ў Літве галоўным нацыянальным набыткам. Потым ужо ўсё астатняе…

Што ж тычыцца стаўленьня да гісторыі... Наўрад ці нехта са звычайных літоўцаў, якія штогод адпачываюць у Нідзе або ў Палангэ, хоць аднойчы задумаўся над тым, што некалі гэтыя землі належалі Нямеччыне, а тым больш — пра лёс тых самых куршынінкаў. У масавай сьвядомасьці літоўцаў ВКЛ ня мае ніякага дачыненьня да РБ, а беларусы — да гісторыі Літвы. І гэта ня ёсьць, думаецца, вынікам нейкай адмысловай антыбеларускай (ці антыпольскай) прапаганды. Палітыка — гэта зусім іншая справа. Мала хто зь літоўцаў усур'ёз цікавіцца ёю. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова паглядзець, колькі месца ў літоўскіх газэтах займае тэма выбараў у Сойм, якія адбудуцца сёлета ўвосені, і колькі — спорт, сад і гарод. І гэта нармальна.

Літоўцы адчуваюць сябе самадастатковай нацыяй. Яны ганарацца Жальгірысам (Грунвальдам), не жадаючы дзяліць яго ні з палякамі, ні, тым больш, зь беларусамі. Яны зьвязаюць імя заснавальніка ВКЛ Міндоўга не з Навагрудкам (Наўгардукасам), дзе была ягоная рэзыдэнцыя і дзе ён быў каранаваны, а зь нейкім іншым мястэчкам на тэрыторыі сучаснай Літвы, назва якой нічога не гаворыць беларусам. І гэта таксама нармальна.

Але нармальна — яшчэ ня значыць добра. Ёсьць і іншая форма любові да ўласнай гісторыі і яе асэнсаваньня, якая падаецца на ступень вышэйшай, чымся толькі гонар за ўласныя перамогі і здабыткі, прыдуманыя або рэальныя. І прыклад такой любові падаюць нашыя суседзі ў Балтыі. Адметна, што яны даўно лічаць нас сваімі суседзямі. Балтыя — гэта ня толькі Балтыйскае мора. Але мы пакуль гэтага яшчэ не ўсьвядомілі. Усьпрымаем швэдаў, у лепшым выпадку, як спаборнікаў у хакеі…

## «Тытанік» XXI стагодзьдзя

Ужо даўно стаўся анэкдотам апавед пра тое, што швэдзкія чыноўнікі, нібыта, вешаюць у сваіх кабінэтах партрэты Пятра І. За тое, што ён разьбіў войскі швэдзкага караля Карла XII пад Палтавай і тым самым назаўсёды адвучыў швэдаў ваяваць, а Швэцыя ў выніку стала разьвітай дэмакратычнай дзяржавай.

Апокрыф не зусім адпавядае рэчаіснасьці. Пасьля Карла XII была яшчэ швэдзка-расейская вайна 1741—1743 гадоў, Семігадовая вайна, вайна Швэцыі з Даніяй і Расеяй 1788—1790 гадоў і нарэшце — вайна з Расеяй і Нарвэгіяй на пачатку XIX стагодзьдзя. Але гаворка не пра тое.

Кожнага журналіста, які ўпершыню патрапіў у Стакгольм, абавязкова завязуць (ці, прынамсі, параяць наведаць) у музэй карабля «Ваза». У 1625 годзе кароль Швэцыі Адольф Густаў Ваза, які ваяваў тады з Польшчай за панаваньне над Балтыйскім морам, загадаў пабудаваць некалькі баявых караблёў, сярод якіх роля флягмана адводзілася «Вазе». Лёс судна ўнікальны ў гісторыі марапаўства. Гэта быў самы магутны на той час узброены карабель у сьвеце. Водавымяшчэньне 1200 тонаў, даўжыня з бушпрытам — каля 70 мэтраў, вышыня ад кіля да вяршыняў мачтаў 54 мэтры. На дзьвюх палубах месьціліся 64 гарматы. Такіх караблёў тады не было нават у Францыі.

10 жніўня 1628 году гэты шэдэўр карабельнага мастацтва узьняў ветразі ў стакгольмскай гавані, грымнуў салют… Раптам судна нахілілася на бок, праз люкі для гарматаў унутар патрапіла вада. Прапорцыі карабля не дазволілі яму выраўнацца — ён нахіліўся яшчэ больш і пайшоў на дно. З экіпажу ў 150 маракоў загінулі каля сарака. Усё адбылося амаль імгненна, на вачох шакаваных гасьцей, у тым ліку замежных дыпляматаў.

Неўзабаве распачалося афіцыйнае сьледзтва для высьвятленьня прычынаў трагедыі (на той час гэта была катастрофа, сувымерная з крушэньнем «Тытаніка»). Але паколькі, як высьвілася, інжынэры й будаўнікі кіраваліся парадамі самога манарха, які, у прыватнасьці, жадаў разьмясьціць на палубах як мага болей гарматаў, сьледзтва хутка згарнулі. На пытаньне, што здарылася з суднам, быў атрыманы знаёмы адказ: яно патанула…

Балтыйскае мора, у заўжды халодных глыбінях якога дрэва амаль ня гніе, захавала «Вазу» для нашчадкаў. Калі судна ўзьнялі са дна ў 1961 годзе, яно выглядала, як новае. Навукоўцы былі ўражаныя выглядам, багацьцем дэкору й скульптураў у стылі барока, якія ўпрыгожвалі карабель-палац. Некаторыя зь іх, між іншага, выклікаюць у сучасных гледачоў зьдзіўленьне. Што маглі азначаць, напрыклад, скульптуры каталіцкіх манахаў з жаночымі грудзямі, прычоскамі ды нафарбаванымі кармінам вуснамі? Справа ў тым, што пратэстанцкая Швэцыя вяла ідэалягічную вайну з Ватыканам, і тыя вывявы былі нічым іншым, як... карыкатурай на папістаў. «Ваза», такім чынам, задумваўся ня проста як плывучая крэпасьць, сымбаль магутнасьці швэдзкага каралеўства, але і як плывучы агітпункт

## Замест высновы. 300 гадоў пасьля Палтавы

Карабель стаў сымбалем бязглуздай катастрофы, марнасьці імпэрскіх амбіцыяў. Чаму ж так цікавіць сучасных швэдаў тая гісторыя? Vasamuseet застаецца самым папулярным музэем у Швэцыі. Думаецца, ня толькі таму, што ў запасьніках музэю захоўваюцца тысячы ўнікальных знаходак, якія шмат расказваюць пра швэдзкую рэчаіснасьць XVII стагодзьдзя ды яшчэ хаваюць безьліч сакрэтаў і цікавостак.

Швэды, зь якімі даваўся гаварыць, відавочна любяць гэты свой патанулы карабель. Без усялякага мазахізму, без празьмернай настальгіі па ранейшым часе. Яны любяць сваіх каралёў — і стародаўніх, і цяперашняга, Карла XVI Густава. Любяць, дарэчы, не за каралеўскі сан, а за надзвычайны дэмакратызм і мяккасьць, і, у той самы час, цьвёрдую аддана́сьць маральным прынцыпам. (Даваўся некалі быць сьведкам таго, як кароль браў удзел у Гётэборгу ў адпяваньні некалькіх юнакоў і дзяўчатаў — у асноўным гэта былі імігранты, якія згарэлі ў выніку жахлівага пажару ў тамтэйшай дыскатэцы, бачыць, як проста, без усялякай рысоўкі трымаліся на людзях ён і ягоная жонка.)

Швэды любяць Карла XII і ягонага сучасьніка Карла Лінэя, Акадэмію навук разам з Нобэлеўскім камітэтам і Астрыд Ліндгрэн, якая так і засталася бяз Нобэлеўскай прэміі, любяць сваю зямлю, якая амаль уся складаецца з граніту, і ганарацца тым, што п'юць ваду выключна з-пад крану, настолькі яна чыстая, любяць свабоду й парадак, якія, аказваецца, зусім не пярэчаць адно аднаму, любяць свой Рыксдаг і ўсю Швэцыю бяз вынятку — ад запалярных шахтаў у Кіруне, да выспы Фаро, на якой жыў і памёр Інгмар Бэргман.

І сваю гісторыю — таксама бяз вынятку. Не перапісваюць яе, не прыхарошваюць.

Спасьцігаюць сэнс.

Сёлета 28 верасьня (у дзень выбараў) споўніцца 300 гадоў са дня бітвы ля вёскі Лясная, што Магілёўшчыне, дзе швэды пацярпелі першую сур'ёзную паразу ў Паўночнай вайне.

У наступным годзе Ўкраіна будзе адзначаць 300-годзьдзе Палтаўскай бітвы, якая адбылася акурат праз дзевяць месяцаў пасьля бітвы пад Лясной. Безумоўна, гэта ня будзе сьвяткаваньнем перамогі расейскіх войскаў над войскамі швэдаў і Мазэпы. Украінцы спрабуюць наноў знайсьці сябе ў эўрапейскім гістарычным кантэксьце.

Мажліва, некалі і ў Беларусі таксама навучацца любіць сваю гісторыю — усю бяз выняткаў. Навучацца любіць і паважаць ня толькі свой край, але самі сябе.

Вось толькі не даваўся б гэтага чакаць яшчэ 300 гадоў.

**Віталь Тарас**

# Падвойнае жыцьцё




Піша **Алег Дзярновіч.**

Што застаецца рабіць чалавеку творчай прафэсіі ва ўмовах рэжымаў, зь якімі можна альбо толькі змагацца, альбо супрацоўнічаць? У часы, калі эпоху апаноўвае эратычнае цягненьне да «народу» — у жаноцка-таямнічую глыбіню, а публічна агучваецца адмаўленьне ад эгалітарнага прагрэсу ды спакусаў сучаснае цывілізацыі.

Нямецкі літаратар Готфрыд Бэн, на самай справе адзін з найбуйнейшых лірыкаў мінулага стагодзьдзя, нарадзіўся ў 1886 г. і быў сынам пратэстанцкага пастара — таксама, як і Ніцшэ, Гэсэ, Юнг... Ягонае жыцьцё прыйшлося на самыя драматычныя пэрыяды XX ст. — ён перажыў дзьве сусьветныя вайны, росквіт барбарства ў сваёй краіне і ягоны крах. Індывідуаліст і мужны скептык, Бэн меркаваў, што «спадзяваецца — значыць мець фальшывыя ўяўленьні пра жыцьцё».

Але ў Готфрыда Бэна заўжды было чым зарабіць на жыцьцё — ён скончыў Ваенна-мэдычную акадэмію імя кайзэра Вільгельма і шмат гадоў меў у Бэрліне ўласную практыку дэрматоляга. У пачатку дваццатых гадоў Бэн дэбютаваў экспрэсіўнай, эпатажнай паэзіяй; галоўнай яе тэмаю быў адваротны бок працы мэдыка, пераважна хірурга і патолягаанатама — антыэстэтыка чалавека, які пакутуе, які расьсечаны і адчувае распад прыроды. У ягонай творчасьці спалучаўся халодны жаргон лекара зь вялікімі ўзьлётамі лірыкі. На мяжы 1930-х Бэн стаў вядомым, яго цанілі ў літаратурных колах.

Дык вось, у гэтага безнадзейнага стоіка быў адзін момант у жыцьці, калі яму падалося, што сьвет можна адрадзіць — і гэтыя спадзяваньні былі зьвязаныя з нацыяналсацыялізмам. На імгненьне Бэну прымроіўся гул гісторыі. У выніку ён ня зьехаў з нацысцкай Нямеччыны і апынуўся адным зь нешматлікіх па-сапраўднаму значных нямецкіх пісьменьнікаў, які не эміграваў і застаўся там, дзе ягоны «народ, да няшчасьця, быў».

Гэта не прайшло незаўважана для ўсіх. Клаўс Ман, старэйшы сын Томаса Мана, 9 траўня 1933 г. з-пад Марсэлю напісаў Бэну знакаміты ліст-дакор:

«Дарагі і шаноўны спадар доктар Бэн,

...у сутнасьці, Вы застаяцеся АДЗІНЫМ нямецкім пісьменьнікам, зь якім мы лічымся, які не заявіў пра свой выхад з Акадэміі. Тое, што не зьдзіўляе ў выпадку... з X і чаго варта было чакаць ад Y, які з цудоўнай пасьлядоўнасьцю грае ролю Гіндэнбурга нямецкай літаратуры, — у Вашым выпадку выклікае жах. У якім грамадзтве Вы засталіся? Чаго Вы можаце дасягнуць, прадастаўляючы Вашае імя, якое было для нас сымбалем найвышэйшага культурнага ўзроўню і проста такі фанатычнай чысьціні і шчырасьці, у распараджэньне тых, чыё бескультур'е ёсьць абсалютна беспрэцэдэнтным у эўрапейскай гісторыі і ад маральнай нядобрасумленнасьці якіх з грэблівасьцю адвярнуўся ўвесь сьвет? Колькіх сяброў Вы згубіце, калі супрацоўнічаеце зь людзьмі, вартымі духоўнае нянавісьці, і што за сяброў Вы набудзеце ў Вашым цяперашнім фальшывым становішчы? Хто Вас там зразумее?.. А дзе ж прыхільнікі Вашага таленту?.. Маладыя Вашыя прыхільнікі, якіх я ведаю, сядзяць сёньня па маленькіх гатэлях Парыжу, Цюрыху, Прагі, а Вы, Вы — іхны кумір, прагнаеце гуляцца ў акадэміка ГЭТАЙ краіны».

У сваім адказе, абвешчаным публічна, Готфрыд Бэн апеляваў да такога паняцьця, як народ:

«Вось мой адказ: я і надалей буду цаніць тое, што, на мой погляд, каштоўнае і карыснае для нямецкай літаратуры, дзе б яно ні было — хоць у Лугана, хоць на ўзьбярэжжы Лігурыйскага мора... І хто я такі, каб заставацца ў баку, хіба я ведаю, як можна было б зрабіць лепей?... Народ — гэта так многа!... І паколькі я ўзгадаваўся ў вёсцы, сярод палёў і статкаў, я яшчэ ведаю, што такое радзіма. Вялікі горад, індустрыяльнае грамадзтва, інтэлектуалізм, усе цені, якія адкідвае эпоха на маю сьвядомасьць, уся моц гэтага стагодзьдзя, якой я супрацьстаю ў маёй творчасьці, — бываюць імгненьні, калі ўсё гэтае вымучанае жыцьцё зьнікае і не застаецца нічога — толькі раўніна, прастора, поры году, зямля, простае слова Народ».

Але тэма эміграцыі сапраўды закранула нямецкага паэта:

«Аб працэсах, якія цяпер адбываюцца ў Нямеччыне, можна разважаць толькі з тымі, хто перажыў іх разам са сваёй краінай, хто жыў гэтымі падзеямі штогадзінна, з дня ў дзень... З тымі, хто ўцёк за мяжу, размаўляць немагчыма. Вы страцілі магчымасьць адчуць паняцьце народу, такое чужое Вам».

Ужо пазьней, пасьля вайны Готфрыд Бэн у сваёй аўтабіяграфічнай кнізе Doppelleben — «Падвойнае жыцьцё», вернецца да праблемы эміграцыі:

«Эміграцыі, як уласна такой, Нямеччына ня ведала. Былі Маркс і Энгельс, якія зьехалі ў Лёндан у спадзяваньні на свой час... Калі прадстаўнікі маёй генэрацыі і майго інтэлектуальнага кола пакідалі Нямеччыну, гэта не было ні палемічным жэстам, што зьвілася значна пазьней, ні ўцёкамі ад небясьпекі; сапраўдных памераў наступнага сыходу з краіны ў той час ніхто ня мог сабе ўявіць. Гэта былі ня столькі самаабарона, колькі поза, ня столькі акт барацьбы, колькі праява слабасьці. Эміграцыя як фронда правадыру — паняцьце да гэтага моманту зусім нечуванае».

Усё ж Бэну спатрэбілася менш за год, каб добра агледзецца навакол. «Я па-ранейшаму жыў у Бэрліне, працэс перакоўкі нацыі ішоў поўным ходам, а абставіны, вонкавыя і ўнутраныя, мяняліся ў такі спосаб, што мне прыйшлося задумацца над тым, як быць далей». Сумневы Бэна былі заўважаныя пераможнай уладай. Спачатку яго пачалі замоўчваць, потым, у 1935 г., абвясьцілі «культурбальшавіком», прыгадаўшы таксама сяброўства зь пісьменьнікамі-габрэямі, і, нарэшце, у 1938-м выгналі з Пруськай акадэміі мастацтваў і Імпэрскай палаты пісьменнасьці (нешта падобнае на дзяржаўны Саюз пісьменьнікаў) ды забаранілі друкаваць ягоныя творы.

У выніку Бэн, паводле ўласных словаў, абраў «арыстакратычную форму эміграцыі» — унутраную. Ён вярнуўся да сваёй «асноўнай» прафэсіі — стаў ваенным лекарам у Гановэры.

«У літаратуры адбывалася тое ж самае, што і паўсюль. І тут да ўлады прыходзілі людзі, якія альбо ўвогуле ня мелі нічога супольнага зь літаратурай, альбо спакусіліся на новыя магчымасьці ўзбагачэньня. На самым версе нярэдка аказваліся закончаныя падонкі. Не хачу пераходзіць на асобы. Калі сёньня я разважаю на гэтую тэму, я кажу сабе: неабходна валодаць незвычайным характарам і незвычайнаю ўнутранаю загартоўкаю, каб здолець замкнуцца ў самім сабе і трымаць сябе ў руках, калі вакол столькі спакусаў — і ўлада, і ўплыў, і грошы; адным дадзена ўстаяць перад такімі спакусамі, іншым — не».

І ўжо ня толькі сабе, але і нам Бэн кідае пытаньне: «Як магло здарыцца і да гэтага часу працягваецца, што Нямеччына пайшла за так званым урадам, гэтым паўтузінам крыкуноў, якія вось ужо больш дзясятку гадоў у адных і тых жа залях талдычуць адны і тыя самыя глупствы перад аднымі і тымі ж натоўпамі, што равуць, за гэтымі шасьцю паяцамі, якія вераць, што яны лепш за ўсіх ведаюць пра мінулыя стагодзьдзі і будучыя тысячагодзьдзі цэлага сьвету?»

Разважаючы пра вайну і перадваенны пэрыяд, Бэн пісаў, што «нельга не зьвярнуць увагу... на незвычайную экзыстэнцыйную пустэчу сучаснага немца, у якога няма нічога з таго, што напаўняе ўнутранае жыцьцё іншых народаў: сур'ёзны нацыянальны зьмест, грамадзкія інтарэсы, крытыка, грамадзкае жыцьцё, ...сапраўдныя традыцыі, — замест гэтага вакуўм з гістарычнымі недарэчнасьцямі, разбуранай сыстэмай адукацыі, ідыёцкай хлусьнёй урадавай прапаганды і танным спортам».

Затое можна насіць прыгожую форму — яна прыцягвае ўвагу, можна ліха рапартаваць, сур'ёзна схіляцца над мапай і ў суправаджэньні сьвіты зьяўляцца ў казарму ці завод — распараджацца, інспэктаваць, наганяць страху («Два разы я не паўтараю!», «Даведаецеся, калі будзеце чысьціць сарцір»). Усё гэта стварае ўражаньне напоўненасьці быцьця, асабістай значнасьці, далучанасьці да вялікай справы — «адным словам, дапамагае зжыць комплекс сярэдняга чалавека». Мастацтва забаранілі, прэсу зьнішчылі, на слова адказваюць куляй у патыліцу. На сёньня погляды і пераканаўчы хутчэй падобныя на мігрэнь — свайго роду спадчынная хвароба.

Адзін ягоны верш так і пачынаўся:

Leben — niederer Wahn!

Жыцьцё — найпадлейшае трызьненьне!

Бэн перажыў вайну, яму пашчасьціла патрапіць не ў савецкую, а ў заходнюю зону акупацыі. І хоць заходнімі альянтамі на яго таксама была накладзеная забарона на друк, ён працягваў пісаць. З 1948 г. у Швайцарыі, а потым і ў ФРН пачынаюць выходзіць ягоны кнігі. У пасьляваеннай Нямеччыне, на руінах акупаванай дзяржавы, у атмасфэры хаосу, нацыянальнага прыніжэньня і адчуваньня віны за зьдзейсьненыя злачынствы, калі падавалася, што жыцьцё скончылася і няма на што абаперціся, Готфрыд Бэн, са сваім досьведам унутранай эміграцыі, паэт эўрапейскага маштабу, які перажыў жахлівыя гады разам са сваімі суайчыньнікамі і захаваў магутнасьць эўрапейскага духу, аказаўся фігурай, якая была проста неабходнай немцам таго часу.

«Падвойнае жыцьцё, у маім тэарэтычным разуменьні і практычным ажыцьцяўленьні, — гэта ўсьвядомленае расшчапленьне асобы, наўмыснае і мэтаскіраванае».





Спэцыяльны нумар

ARCHE

Вайна без цэнзуры

512 старонак, 500 ілюстрацый, 50 зь іх каляровыя

Унікальны зборнік апошніх дасьледаваньняў пра Другую сусьветную вайну і Беларусь

Гэта мусіць быць у Вашай бібліятэцы

Даведкі праз тэл. 505 39 11, э-пошту knihi@me.by

Падпісацца на ARCHE можна ў любым паштовым аддзяленьні.

Падпісны індэкс 00345

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

### Яна і я

яна ўвойдзе па лытачкі ў мора — і ўвесь пляж галовы паверне
нават хвалі за ёю сьледам паварочваюцца крыху
калі вецер яе сукенку раптам зробіць яшчэ паветраней
і дзяўчаты бойфрэндаў закопваюць у пясок — далей ад граху

і яна разумее, што я разумею, што рухі ветру папраўдзе
адпавядаюць маім, а магчыма, і ейным плянам
і бакланы лятуць, як даішнікі, на сьвятло яе срэбнага «аўдзі»
і, махаючы ёй наўздагон, я сябе адчуваю бакланам

і зьбіраю сны, як каменьчыкі зь дзікіх нудысцкіх пляжаў
і найлепшы растаў у роце, нібы рыская карамелька
і я плаваў да ранку ў ім так, бы ў вадзе нічога ня важыў
а назаўтра крочу танцуючай лёгкай хадою пахмельніка

і фантазія, крылы згарнуўшы, у інвалідны сядае вазок
і зь мяне пачынае сыпацца дробны балтыйскі пясок

*4 жніўня 2008, Вэнтспілс*

## ТАЦЯНА БАРЫСІК

### Песьня

Не дагукацца да белага гаю!
Ночка цьвілая — ніяк не прачнуцца,
стопка ў старым сьліўняку патанае,
шэрыя мышы ў дзежках вядуцца,

Мост земляны ды дубовыя дзьверы,
лоўж ад сьвятла засьцілае вакенца,
кропля вады пахаваная ў цемры
ціха плыве паўз мурзатае шкельца.

Не дагукацца да белага гаю!
Крача каршун па-над восеньскім быльлем.
Як на Вялікдзень сонейка йграе,
песьціць залоціць чорныя крылы…

Скончыўся доўгі дзень нараджэньня,
стала віном вінаградная гронка
ў стопцы, у склепе, у сутарэньнях
Быць немагчыма белым рамонкам.



МІКОЛА БУГАЙ

**Царква Сапегаў у Кодні. XVI ст.**

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

### Ланцуг

Сёньня я быў у Менску. Не люблю гэты горад.
Прыязджаю рэдка, але калі патрапляю,
То заўсёды а першай гадзіне
іду ў Парк Чалюскінцаў,
Сядаю ў цяні дрэваў і слухаю шамаценьне
лістоты,
Заплюшчыўшы вочы, чакаю
На вызваленьне,
На даравальне,
На тое, што ўсё гэта неяк возьме і скончыцца
Раптоўна ці паступова,
Але назаўжды.

А другой падыходзіць Іван,
Мы зь ім нават не вітаемся, ня гутарым.
І ўпасі божа не глядзім адно аднаму ў вочы.
Ён суе мне здымак.
Мне дастаткова аднаго імгненнага позірку,
Каб запомніць твар і адрас.

Позна ноччу вяртаючыся да дому,
Я заўсёды спыняюся за горадам,
Сядаю пад дрэва.
І плачу,
Плачу,
Плачу,
Бы нешта зьменіцца,
Бы мае сьлёзы затопяць гэты чортаў сьвет,
Бы я сам патану ў іх...

Я вяртаюся давідна,
Каб пасьпець завезьці цябе ў школу.

## АЛЯКСЕЙ ЧУБАТ

***

Што кажа лета пачатак
Сьпякотным днём ці лагодным вечарам,
Табе, крывіцкі нашчадак
Пад сонцам, якім ты ўжо трохі
падпечаны?

Напэўна, пра вечнасьць жыцьця,
Пра бяскрайнасьць палёў і
бяздоннасьць неба.
Птушыныя сьпевы ловіш ты не для
багацьця —
Не змарынуеш сьпевы да сьнегу.

Лета — як сёньня,
Якое ўжо не паўторыцца,
Як імгненьне, калі ён і яна
Становяцца творцамі.

Летняя раніца россыпам кропель поіць
нас
З далоняў сваіх,
Як было соладка мроіць нам
І быць кожнаму — за дваіх!

...І перакуліцца чэрвень дагары нагамі,
І беларусы пакрыюцца бронзай.
Летам магчыма пагутарыць з Багамі,
З нашымі, зь іхнымі, з рознымі.



PHOTO.BYMEDIANET

# Дзень дэсантніка

Павал Касьцюкевіч. Апавяданьне.

### 1. Сонечнае прыцьменьне

Яны зьлятаюцца зь недасяжных вышыняў, з тых сьляпучых узвышшаў, якіх нават не сягаюць арлы і сьнягі. Мама, мама, глядзі, яны лятуць, асланяючы сонца на 10, 20, 30 працэнтаў! Нецьвярозымі анёламі мкнуць да нас, неспасьцігальныя, як прыбамбасы Бэтмэна, і, прызямліўшыся на пакрытыя керамінаўскай пліткай ганкі нашых дамарослых супэрмаркетаў, дзіравяць грэшнае паветра гарадоў пяцьцю нябеснымі зыкамі: Сла-Ва-Вэ-Дэ-Вэ! Іх не было тут цэлую вечнасьць, адзін зямны год, яны шмат чаго ня ведаюць пра нас, пра ўтомную зіму і інфляцыю. Яны, нетутэйшыя, па-ранейшаму песьцяць аблудную надзею, што зямныя дочкі будуць біцца галавой у гістэрыцы і рваць валасы на галовах, як толькі зьмецяць вузкую паласку бірузовага бэрэту. Яны яшчэ ў вочы ня бачылі новага дызайну бутэлькі «Алівары-Айс». Таму і купілі пяць скрыняў. Нетрывала ступаюць неакрэплымі анёльскімі нагамі па зямлі. Зрэнкамі блакітнага — аж выліваецца! — колеру зазіраюць мінакам у вочы са сьпіны. Трохі сьмешныя. Спажываюць гарэлку як ваду, а піва як паветра. Хісткай хеўрай ловяць замест таксоўкі аўтобус. Ставяць акардэонныя акорды на гітарным грыфе. Пераканаьныя на ўсе сто, што чалавек — найлепшы сябар дэсантніка.

Дзень Вэдэвэ — сьвята сямейнае, таму ў гэты дзень трэба сядзець дома і нікуды не выходзіць. А ноччу, будзь ласкавы, пастаў сьвечку і літровы слоік «ёршыка» на падваконьне. Гэта для заблукалых бэрэтаў. І ня важна, што ў цябе сёмы паверх. Стропы ў іх доўгія — дацягнуцца.

А ты служыў у войску? І ў нас усё неяк не выходзіла — знаеш, сям'я, саўна ў пятніцы, аўстрыйскія партнёры, праблемы на фірме і пад уласнай чарапной каробкай. У нашай клясе з 15 здаравілаў адслужыў толькі адзін. Хаця не ў дэсантуры.

### 2. Аднаклясьнік

Перастрэць на вуліцы аднаклясьніка і, пачуўшы пра ягонае жыцьцё, пераканацца, што ня такі ўжо кепскі для цябе расклад на гэтым сьвеце. Тэорыя адноснасьці ў дзеяньні. Пасьля першай радасьці, калі ўсё яшчэ цешысься, што ў цябе па-ранейшаму засталіся сякія-такія шанцы падмяць усё пад сябе, пачынаеш зьвяртаць увагу і на самога аднаклясьніка. Зьмячаеш, што разам зь ягонымі такімі чужымі няўдачамі і злыбедамі і ўсё астатняе ягонае жыцьцё таксама іншае, ня так, як у цябе. Ня так і ня так, а вось гэтак. І паралельна з трыюмфальна вернутымі ў галаву думкамі парваць гэты сьвет на андрэеўскі сьцяг, на душу нагортваецца якісь няўцямны сплін. Позіркам абгрызаеш сурамоўцу і табе трошачкі хочацца ягонага, нармальнага: паслужыць у войску, спусьціцца ў салігорскую шахту, паслухаць апошні unplugged «Славянскага базару». Каб стаць, як усе, спадзеючыся, што так, ты, можа быць, пазбудзесься гэтага пачуцьця, калі часам здаецца, што тваё мазгі раскідала па ўсёй Галяктыцы.

Мой аднаклясьнік, Слава Вэдэвэ.

### 3. Антаніна, я твой мужчына

І да таго ж, гэтыя іхныя цяльняшкі. Няйначай, найвышэйшая, нечалавечая, фантазія прыдумала іх. У беспрасьветнай імгле колеру хакі і сярод плямістага хаосу стылю «мілітары», пэўна, вярхоўнае вэдэвэшнае божышча выпрадукавала, вылімаўшы з уласнага калена, гэтае блакітнабелае чаргаваньне, промнікі сьвятла ў цёмным царстве.

Божышча было абкуранае, зьедліва сказка маладое крыло. Можа быць. Хаця думаю, нешта-нейкае ўсё ж ёсьць у гэтым дні. Штосьці ад моцы і немачы бразыльскага карнавалу-аднадзёнкі. Штосьці ад бесшабашнай пагулянкі казакоў у «запарожцы». Штосьці ад колішняга неспадзяванага прыезду шатляндзкіх футбольных заўзятараў у Менск. І яшчэ трошкі — ад зборнай Харватыі.

Зборнай Харватыі? Ну, гэтая іхная адметная клятчастая форма. Калі Харватыя атрымала незалежнасьць, на кірмашы барваў астатнія краіны збольшага разабралі ўсе каляровыя камбінацыі. Да таго ж, харватам дзяды падкінулі ў спадчыну чырвона-бела-сіні сьцяг. Банальную палітру, якую прысабечыў амаль увесь славянскі сьвет з прымкнулымі да яго французамі і галяндцамі. І тады камусьці з харвацкіх дызайнэраў прыйшоў да галавы нестандартны ход канём: форма ў чырвоныя і белыя клеткі. І значыць, звоніць мне неяк летнім дзянькам адна Антаніна: «Паша, прыязджай — у мяне зноў праблемы ў асабістым жыцьці, трэба параіцца, любоўная дылема: футбаліст або таксіст. І абодва харошыя хлопцы». І я мчуся да Антаніны. Першай справай зьдзіраю сваю глупую кашулю, што замінае і хавае маю футбольную маечку ў клетку і потым, як сьлед прадэманстраваўшы свае нацэльныя шашачкі, крычу на ўсе застаўкі: «Антаніна! Не яны, а я, я — твой мужчына! Два ў адным, не — тры ў адным. Ты нават можаш разьлічваць на мяне, нават калі табе раптам удумаецца ўзбуйніць гэты твой любоўны, футбольна-таксісцкі, трохкутнік яшчэ і шахматыстам».

Пакрыўдзілася Антаніна. Так, я не люблю, калі мяне, мужчыну, перарабляюць на жанчыну з правам дарадчага голасу.

Дарэчы, яшчэ адна дата праляцела над намі, як фанэра над Парыжам — Дзень шахматаў, 20 ліпеня! Наступны год абавязкова сьвяткуйце, і так, каб чэрці вылі. Уяўляю орды крыважэрных людзей у прыталеным гарнітуры і клятчастым, а ля клоўн Папоў, капелюшы, якія чэпяцца на вуліцы да жалю годных хлопчыкаў у цельніках: «Чаму, е-два-т-тваю-е-чатыры, без акуляраў?», «Чаму цельнік ня ў клетачку?»

### 4. Носік вышэй!

Лета хутка скончыцца. Гэта навукова даказаны факт. І як лета — маленькае жыцьцё, дык у верасьні нас чакаюць маленькая сьмерць і маленькі страшны суд. Не схавацца. І Дзень дэсантніка, які выпадкова (невыпадкова?!) супадае з днём грымотнага Ільлі-прарока — першая ластаўка. Жнівень — гэта слухаць у аўтобусе, як напалеонаўскія пляны пра трыюмфальныя захоп турэцкага берага пакрысе зьяжджаюць на старэчае буркатаньне, што ад чалавека ў гэтым сьвеце нічога не залежыць, а пагатоў — выкананьне ягоных плянаў на лета, і што ўсе мы, па сутнасьці, на далонях у Івана Купалы, гэтага змрочнага летняга бажка, які тры месяцы навылёт прымушае нас паліць чорныя шыны недаробленых за зіму справаў ды скакаць праз вогнішчы скоразьвялых раманаў, пасьля чаго мы робімся п'яныя і дурныя, і забываемся пра самае элемэнтарнае, пра Крым.

Клясыка жанру. Лета, мікрараён, дзе прэвалюе другое пакаленьне «сена на асфальце» (такое можна сказаць пра ўсе менскія мікраёны). Ля гастраному ідзе невысоканькая, інтэлігентна апранутая бабулька, якая крыху так выбіваецца з агульнай моды. Раптам чуецца трохі зьвераваты крык: «Носік вышэй! Носік, ё......., вышэй!» Нос кабеты міжволі ўздымаецца. Але голас не задаволіўся і гне сваё: «Яшчэ вышэй!» Бабчын нос бязвольна лезе ўгару. Але на трэцім выкрыку ўжо схамянулася: «Што ж гэта я?», апусьціла галаў і азірнулася. На лужку перад гастраномам мужчына косіць траву касой. А на ганку магазіну згуртавалася грамада, якая сочыць за рухамі касца і дзе трэба папраўляе яго словам. Гэтым летам людзям ёсьць што сказаць.

Так што хапайце, хапайце высалапленым языком гэтыя летнія пэрліны. Бо неўзабаве, празь які месяц, сьвет скурчыцца да невялічкай амбразуры, празь якую мы будзем атрымліваць толькі канвэрты ад працадаўцы і радасьці скупыя тэлеграмы — ад жыцьця, а ўзамен смаліць узахлёб па псыхічнай атацы белых.

## Створым музей разам!

У Лагойску ствараецца гісторыка–краязнаўчы музэй імя Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў. Некалькі стагодзьдзяў, ад 1528 году, Тышкевічы валодалі Лагойскам. Яны праявілі сябе руплівцамі па захаваньні гістарычнай спадчыны народа. Зьбіралі зьвесткі пра сваю мясцовасьць з гістарычных крыніц, геаграфіі, тапанімікі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтва, археалёгіі, вывучалася народная творчасьць. У выніку гэтай падзьвіжніцкай працы Лагойск стаў цэнтрам гістарычнай і археалягічнай навукі. Стараньнямі братоў Тышкевічаў ствараліся арыгінальныя экспазыцыі, а адкрыты ў 1842 г. першы ў Беларусі гісторыка–археалягічны музэй быў сярод лепшых беларускіх прыватных музэяў. Захоўвалася тут зброя, кальчугі, мундзіры часоў вайны 1812 году. У аддзеле мастацтваў экспанавалася вялікая колькасьць карцін і эскізаў беларускіх, расейскіх, літоўскіх і польскіх мастакоў. У музэі Тышкевічаў было сабрана каля 3 тыс. унікальных старажытных помнікаў айчыннага кнігадрукаваньня, каштоўныя рукапісы, старажытныя геаграфічныя мапы.

Пазьней Я.Тышкевіч захапіўся ідэяй адкрыцьця агульнадаступнага музэя ў Вільні. Віленскі музэй праіснаваў нядоўга і быў зачынены царскімі ўладамі ў 1864 г. Пазьней, дзякуючы стараньням нашаніўца Івана Луцкевіча, частка збораў Тышкевічаў была адшуканая і ўвайшла ў фонд Беларускага музэя ў Вільні. Аднак і гэты музэй хутка быў таксама расфармаваны.

Таму можна гаварыць ня проста аб адкрыцьці новага музэя ў Лагойску. Ставіцца задача ўзнавіць першы на Беларусі музэй.

Пры стварэньні першай экспазыцыі свае калекцыі Віленскаму музэю старажытнасьцяў перадалі акрамя братоў Тышкевічаў і У.Сыракомля, А.Кіркор, Ф.Багушэвіч, І.Кулакоўскі, К.Буйніцкі і інш. Экспанаты паступалі з усіх куткоў Беларусі — Мінска, Магілёва, Віцебска, Оршы, Навагрудка, Крэва, Ліды, Гродна і інш. Таму і зараз пытаньне аб узнаўленьні першага беларускага музэя павінна стаць абавязкам і гонарам усёй Беларусі.

**Усіх жадаючых дапамагчы Лагойскаму гісторыка-краязнаўчаму музэю імя К. і Я. Тышкевічаў просім зьвяртацца па адрасе: г. Лагойск, вул.Харчанкі, 31. Тэл.: (8-01774) 53-8-42, GSM: (8029) 503-58-29, 926-28-15. E-mail: logmuseum@mail.by.**

**Жыгунова Святлана**
**дырэктар Лагойскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Тышкевічаў**

# Не ўлавіць той птушкі

Марыя Роўда. Апавяданьне.

У маленстве мне вельмі карцела ўлавіць птушку. Птушкі былі паўсюль — дражнілі мяне, заахвочвалі, вабілі да сябе й порстка ўцякалі, варта было наблізіцца й працягнуць руку. Але аднойчы ўдача мне *амаль* ўсьміхнулася.

Здаецца, была раньняя вясна. Гарод у вёсцы быў не засеяны, і па барознах павольна дзёўбаліся тугадумныя куры. Цоп — і зьдзейсьніцца мара, хоць гуляцца з курыцай, вядома, ня тое самае, што з маленечкім вераб'ём. Асабліва, калі тая курыца табе па калена. Скок за скокам — і даверлівая, небачлівая птушка апынецца ў тваіх абдымках. Узрадаваная, я кінулася да курэй. Яны, незадаволеныя й зьдзіўленыя, адбеглі далей. Я за імі — а яны ледзьве не ляцяць.

Скончыўся гарод, сад, пачалося поле. Расставіўшы рукі, я бегла й бегла, каб дамагчыся свайго й завяршыць справу. Прыціснуць да сябе жывую трапяткую птушку, зажыць з пачуцьцём зьдзейсьненай мары. Толькі, відаць, куры ўжо даўна пайшлі ўрассыпную, бо ў пэўны момант я ўсьвядоміла, што стаю адна ў чыстым полі й наўкола няма ні хатаў, ні людзей, ні тых запаветных курэй.

Неба ў нашай вёсцы з аўчынку — згубіцца цяжка, але ў сваім дзіцячым ўяўленьні я дайшла да краю. Да таго ж тады яшчэ было неасушанае балота. Яно было паўсюль, і тысяча таемных сьцежак зьмяілія да яго ад паселішча. Думаю, было страшна й сьлёзы ліліся як мае быць. Але вочы глядзелі наперад, і ногі вялі да «кулісаў». Гэтак у нас называлі маліньнік, які цягнуўся ўздоўж самай багны, утвараючы мяжу паміж гэтым сьветам і гэным. Ня ведаю, ці атрымала б я за «кулісамі» кампэнсацыю ў выглядзе няспрытнай птушкі, але мяне своечасова перанялa суседка — баба Волька.

Добрая баба Волька распытала, хто я, чыя й куды іду, а я, млеючы ад радасьці, паведаміла ёй, што зблудзіла. Дахаты мы вярнуліся разам, і я ня бачыла бабы Волькі некалькі гадоў, пакуль не дарасла да таго, каб памятаць ня толькі выключныя здарэньні. Самае цікавае, што баба Волька не магла потым узгадаць гэты эпізод і ніколі ня ведала прычыны маёй асаблівай прыязнасьці да яе. Я ж, падросшы й выправіўшыся ў цэнтар вёскі «на сяло», адразу пазнала сваю выратавальніцу сярод іншых кабетаў і шчыра дэманстравала ёй сваю прыхільнасьць праз усё жыцьцё.

З тае пары мінула трыццаць гадоў. Птушку я гэтак і не ўлавіла. Праўда, у клетцы ў мяне жыве канарэйка — зноў жа стварэньне дзікае, якое ня надта даецца ў рукі. Бабе Вольцы ўжо добра за восемдзесят, і ўсё гэтак жа зьбіраюцца каля ейнай хаты «на сяло» цяпер ужо нешматлікія суседкі.

Я прыяжджаю ў вёску летам, і мы любім пасядзець з бабай Волькай на лаўцы ў яе пад хатай і пагаманіць. У астатні час я тэлефаную ёй па мабіле. Можна сказаць, што мы сябруем. Баба Волька шануе мяне за тое, што я ўмею пагаварыць, ды яшчэ «панаську», а я сплачваю свой доўг за шчасьлівае пачуцьцё «знойдзенасьці».

Вось і сёньня мы сядзім з бабай Волькай перад хатай. Сьвежаваты вечар пасьля вільготнай сьпякоты. Баба Волька задуменна кажа: «Нікога ўжо няма. Нікога няма…» Я сьціскаю кулакі, але разумею, што часу ня ўхопіш у жменю, як і той птушкі.

Усё ж мы дзьве яшчэ ёсьць. Вось я — гляджу на брук, а баба Волька ўзіраецца ў неба. Мы яшчэ тут і шкадуем свае то хоць як, то з сэнсам пражытыя гады. Насамрэч у гэтую хвіліну мы там, дзе й нас ужо няма. Цяпер мы абедзьве памерлі.

А заўтра мы пойдзем у ягады. Баба Волька здасьць іх маладэчанскаму прадпрымальніку, а я навару варэньня, каб есьці яго ўзімку з тостамі перад ненавіснай працай. І бабы Вольчын унук, і я пакінем па сабе дзяцей. Магчыма, аднойчы на тым самым месцы нехта зь іх вымавіць: «Нікога ўжо няма. Нікога няма...» Але сёньня ж во мы сядзім на лаўцы каля бабы Вольчынай хаты. І я гляджу на брук, а баба Волька ўзіраецца ў неба.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Некалькі пушчанскіх гісторый, запісаных у Івянцы

Піша Алесь Белы.

### Чарамша

Доўгі час лінія фронту Першай сусьветнай вайны заставалася стабільнай. Недзе з 1915 па 1917 год яна амаль ня рухалася, дакладна, як у «1984», — што, дарэчы, і справакавала рэвалюцыю ў Расеі. Калі б рэкрутаваныя зь сялянаў войскі адступалі або наступалі — быў бы хоць нейкі занятак, які б апраўдваў адсутнасьць у родных хатах. А так — гній у акопах, незразумела, дзеля чаго. Тым больш — вошы, цынга, авітаміноз... Часам яшчэ і страляюць, могуць забіць. Пазыцыйная вайна, з рэдкімі Георгіямі.

Дык хто гніў, а хто не. Расквартараваныя ў Сярэдняй Літве нямецкія жаўнеры (а лінія фронту больш-менш супадала зь мяжой Рыскай дамовы) часта нават жаніліся зь мясцовымі беларускамі, настолькі камфортна ў нас пачуваліся. І пра дабрабыт славутыя нямецкія інтэнданты дбалі лепш — на тое і орднунг. Каб пазьбегнуць авітамінозу, завялі пасадкі чарамшы. І калі немцы сышлі, культура чарамшы на тым беразе Заходняй Бярэзіны так і засталася, і дажыла да нашых дзён. Кажуць, што ў вёсках на самым паўночным захадзе пушчы — Бакшты, Паташня, Рум — дагэтуль традыцыйна чарамшу і вырошчваюць. А салату зь яе, звычайна з варанымі яйкамі і маянэзам, так і называюць — «нямецкай салатай».

Цікава было б тое праверыць па іншых мясцовасьцях.

### Кладка

«Ой у полі рэчка, цераз рэчку — кладка». Старая песьня прыгадалася, калі пачуў пра кладку праз івянецкую сажалку ў цэнтры мястэчка, на Волме. Недзе да 1970-х яе рэгулярна рамантавалі пасьля кожнага крыгаходу. Падпраўлялі пахіленыя слупкі, замянялі падгнілыя дошкі. Рабілася гэта стагодзьдзямі, паводле нейкай вельмі даўняй «нізавой дамоўленасьці». Магчыма, некалі яе ўбіў у галаву нейкі мясцовы пан, у часы валочнай памеры, і ці ня тое самае адбылося па ўсёй краіне. А магчыма, гэтаму звычаю не адна тысяча гадоў: дамоўленасьць на міжсуседзкім узроўні, хто за што адказвае і ў якой чарговасьці. Аднак ужо гадоў 20 ці 30 кладкі той няма. Людцы глядзяць ТВ, штораз усё цікавейшае, і зь яго даведваюцца — якое Яно, Жыцьцё.

* * *

Прыгадалася апавяданьне аднаго этнографа-аматара (г.зн. на свае грошы этнографа), які казаў мне пра зьнікненьне традыцыйных вячорак і іншых «мясцовых імпрэзаў» у Заходняй Беларусі ў 1950-я. Стагодзьдзямі ў кожнай вёсцы была нейкая большая хата, а мо і не адна, дзе ў складчыну зьбіралася мясцовая моладзь патанчыць, пагутарыць, пазнаёміцца. Ці ня большасьць сем'яў склалася на такіх вечарынах. Тут і функцыянавала традыцыйная культура; гэтак мілыя рамантычнаму сэрцу сучаснага гарадзкога патрыёта дуда і батлейка існавалі арганічна дзякуючы такім вось сталым вясковым кліентам, якія заахвочвалі музыкаў пачастункам і медным шэлегам. Аднак у 1950-я аддзелы культуры выканкамаў канкрэтна ўзяліся за такія «расаднікі». Гвалтам пазаганялі ўсіх у вясковыя клюбы, часта — з забраных цэркваў і касьцёлаў перабобленыя. Ліквідавалі ў зародку патэнцыйныя асяродкі іншадумства, і аднparam — падрыхтавалі пераможнае прышэсьце DJ'яў, кіслаты, рэйву, шаставога стрыптызу, сьвінг-вечарынаў. Відаць, у архівах захаваліся канкрэтныя сьляды той вялікай культурнай кампаніі, была яна арганізаванай, пераможнай (што відавочна назіраем) і наўрад ці доўгай. Ці дачакаецца яна свайго гісторыка?

* * *

Даўно ўжо думаю і так дагэтуль не магу вырашыць канчаткова: трыюмф глямуру — гэта вынік мэтаскіраванай працы сацыяльных інжынэраў ці прадвызначаная наканаванасьць, закладзеная ў мэханізм эвалюцыі яшчэ ў момант Вялікага Выбуху? Што мы зможам абараніць з тых рэштак самастойнасьці, якія яшчэ ацалелі? І ці не ахвяруюць імі нашыя дзеці дзеля радасьці калектыўнага сэксу?

### Хімдым

Смалакурня ў Троках (ня ў тых вялікіх, некалі сталічных, але ў пушчанскіх, каля Івянцу, хоць ня так даўно яшчэ жыў і там, і тут той самы народ, мусіць, яшчэ 200 гадоў таму размаўлялі дома па-літоўску, на рынку па-беларуску, у касьцёле, хто ўмеў, — па-польску), мясцовага лясхімгасу, называлася на тутэйшым жаргоне «Хімдым». Рыхтык як гарадзенцы называюць свой улюбёны камбінат «Азот». Законы моўнай стыхіі ці сьвядомае пазычаньне? Шкада, што не фіксуе таго слова ніводны слоўнік (як для мяне, дык вельмі падобнае на ангельска-навамоўнае hazchem — hazardous chemicals).

Тыя індустрыяльна-савецкія смалакурні ўвабралі ў сябе традыцыйны, дробны, прыватны, праз стагодзьдзі, пушчанскі промысел: буды. Смала, дзёгаць, паташ — чым славілася некалі пушча. Гэтаксама, як у «Мастацкую кераміку» ўвагналі гвалтам дзясяткі прыватных ганчарных майстэрняў і сотні надомніцаў-вышывальшчыцаў.

Што капіталізм, што сацыялізм. Што нябачная рука рынку, што арганізаваны гвалт. А вынік адзін. Татальны глямур. Любы прыватны высілак ня можа дагадзіць людцам, нават невялікай групцы, менавіта таму, што няма болей невялікай групы. Або — Шмат-для-Ўсіх, або нічога нікому. Курым бамбук. Хімдым.

# Глямур Туры Бэргэр

Франц Сіўко. Запісы.

### Унук Тодара Кляшторнага

Сустракаю яго калі-нікалі ў горадзе падчас прагулянак. Часам вітаемся, часам — не, у залежнасьці ад мэтражу між намі на ходніку і ступені звыклай, спароджанай штодзённымі клопатамі зацятасьці. Ня ўпэўнены, ці заўсёды ён мяне пазнае: бачыліся зблізку толькі аднойчы, з нагоды сьвяткаваньня 100-гадовага юбілею яго-нага дзеда, Тодара Кляшторнага. Дзіўна, але кожнага разу, спатыкаючы гэтага ўраўнаважанага і, па ўсім відаць, далёкага ад літаратурных справаў чалавека, чамусьці адчуваю перад ім няўцямна-вусьцішнаватую няёмкасьць. Быццам у нечым правініўся перад ім, а ў чым дакладна палягае тая правіна — не знайсьці адказу. І вось, здаецца, ці не знайшоў — у вачах вязьня Тодара на турэмным здымку ў кніжцы «Сьляды дарог», выдадзенай, дарэчы, у 2003 г. на той самай менскай вуліцы Валадарскага, дзе паэта трымалі ў 1937-м. У вачах «здрадніка радзімы», чый паэтычны ды грамадзянскі дар так шмат каштаваў яму самому і ягоным блізкім і чый замглёны праявамі людзкое лютасьці пагляд так і не страціў дарэшты першароднага свайго наіву, узрошчанага шчадротамі зацішнае парэчанска-лепельскае зямлі. Гэтак зьнябожаных празь няпэўнасьць будучыні і катаваньні, што і празь дзесяцігодзьдзі засталіся здольнымі агаломшыць дакорам ад згадкі пра найвышэйшую тую, якую толькі можа ўявіць сабе чалавек, несправядлівасьць. Якая, нібыта, і не датычыць цябе наўпрост, а вось жа, ускалыхнутая неспадзеўным спатканьнем з нашчадкам рэпрэсаванага, кальне стрэмкаю ды нагоніць рабізны сумневу на ціхамірную плынь твайго штодзённага існаваньня.

### Глямур Туры Бэргэр

Што ў кадры, што па-за кадрам — біятляністцы Туры Бэргэр залішні, ды, відаць, і збольшага памяркоўны глямур падчас спаборніцтваў, бадай, не пагражае. Лоб і шчокі ў кропельках поту, абсіверанья вусны з камяком прымерзлае сьліны понізу, няправільныя абрысы твару — ці ж пра такое марыць сьпешчаны размаітасьцю праяваў жаночага харАства топ-мэнэджар «Плэйбою»?

Зацятаю ўпартасьцю ды несучаснасьцю хады на трасе Тура Бэргэр нагадвае мне колішнюю суседку, вясковую дзеўку Тарэсу Ц. Як для сялянскай дачкі Тарэсы натуральным было зацятае пераадоленьне стомы ў памкненьні ўсё пасьпець па гаспадарцы, так для спадкаеміцы вікінгаў Туры пераадоленьне непамыснотаў спартовага жыцьця — звыклыя экзыстэнцыйныя варункі з каранямі ўсё ў тым жа вясковым, гэтак імпэтна ўзьнесеным аднымі ледзь не да ўзроўню горняга і гэтак жа імпэтна зрынутага другімі ў бездань саромнага, побыце.

Гарт, узрослы на глебе сялянскай рупнасьці — харАство будзённага, што і праз пакаленьні пра сябе нагадае, агаломшыць адценьнямі фарбаў натуральнага.

### Цягнік жыцьця

«Як мы можам вось гэтак разлучыцца?» — сказала абражаная часовым ад'ездам каханага гераіня фільму «Цягнік Чжоў Ю» і ступіла насустрач здрадзе. Скуль было ёй, асьлепленай першым у жыцьці пачуцьцём, ведаць, што няўменьне стачыць у адно *сёньня* і *заўтра* неміноўна прывядзе яе да згубы. Што *заўтра*, якім бы яно ні выдавала далёкім-недасяжным, непазьбежна пераліваецца ў *сёньня* і што быць здатным стрываць павольнасьць гэткае мэтамарфозы можа толькі той, у каго ёсьць хоць які-кольвек, хай сабе і найкуртаты, досьвед ад *учора*. Хто дасканала ведае і прымае як належнае, што быць *сёньня* — гэта таксама і быць *заўтра* з валізаю ад *учора*.

Цягнік жыцьця, хісткі спадзеў на мяжы явы і ўяўленьня.

### АДАМ ГЛОБУС

**Зялёнае**

Схадзіў у сквер, паслухаў салаўя
Схаванага ў сьветла–зялёных шатах.
Вярнуўся, павячэраў, п'ю гарбату
Зялёную. Амаль шчаслівы я…



# Час паміж ваўком і сабакаю

Вольга Бабкова.

* * *

Дэвіз Давыда Гарадзенскага — «Нас мала, не чакайце літасьці!». Цікавы сэнс, калі зьмяніць гледзішча. Да каго зьвяртаўся Давыд — да сваіх воінаў ці да ворагаў? І ці не зварот гэта па-караткевіцку да тых, хто выбраў сабе асаблівы шлях?

* * *

Дзіўна глядзець на манашку, якая бяжыць за аўтобусам. Здаецца, ёй бегчы забаронена, бо бег — гатунак жарсьці. (Бяжы, Лола, бяжы!)

* * *

Глядзець у вокны прабягаючых на хуткасьці машынаў — тое самае, што зазіраць у асьветленыя вокны дамоў. Канфігурацыі чужога жыцьця вабяць і адштурхоўваюць адначасова.

* * *

Рабін на беларуска-ўкраінскай мяжы. Пэрсанаж Фэліні. Аўтэнтычны, бы зь Зінгера ці Сівелы. Пэйсы — усім пэйсам на сьвеце. Шырыня цела неахопная. Пульхны, круглы, малады, патыхае жарам пад чорнай апранахай. А побач сынок. Худы, таксама ў чорным. З пэйсамі. Паменшаная ў шмат разоў копія бацькі. Такі сухарык, умацаваны верай і традыцыяй. Іх дарагое запыленае аўто дашчэнту запоўненае трантамі. Здаецца, у ім скранулася зь месца ўся сям'я рабіна. Гэткі птушыны дом на колах. Жыдоўскі дом дзівосных істотаў.

* * *

Чарнаўцы — горад мары. Нібы выцінанка з горнага рэльефу. Горад-казка. Горад-прывід. Вечнасьць блукае па яго вулках. Як нідзе людзі выдаюць тут на часовых падарожнікаў. Ажурная ляпніна на фасадах дамоў, кованка гаўбцоў і карнізаў. Шчыльны, убіты па макаўку брук. Адна карцінка зьмяняецца на другую. Бы нейкі адвечны катрыншчык дастае на імгненьне з глыбокай кішэні паштоўкі і тут жа зноў хавае іх у бяздонных апранахах.

* * *

…ад чырвонага і зялёнага мільгаціць у вачох. Недарэчная агрэсія.

* * *

У Ізраілі, як аказалася, няма сутоньня. Там пераход ад сьветлага дня да цемры начы імгненны, без памежжа, бяз шэрай гадзіны. На гэта скардзілася Фаня, жыхарка колішняга Менску, цяперашняя ерусалімка. Вось, які яшчэ ты маеш скарб, радзіма! А я люблю зьмярканьне. Час паміж ваўком і сабакам.

* * *

Цяпер ведаю, як і чым пахне ў пекле, бо патэльня, пакінутая на агні на цэлы дзень, яскравая згадка пра тое, на што забываецца ня варта. Тлусты пах распаленага, струшчанага жалезьзя, гаркавы, папялісты, іржавы, сьпечаны, які імгненна зьбівае дыханьне, а гартань напампоўвае горыччу, прасочваецца ва ўсе шчыліны і закануркі дому, і сьцены пасьля ўсё адно застаюцца бы запэцканыя лоем.

* * *

Злавіла сябе на думцы, што страшэнна хочацца пацерціся шчакой аб патыліцу бялёсага хлопчыка гадоў дзевяці. Валасы кароткія, амаль вожыкам тырчаць, адзін у адзін. Чысьціня неймаверная. Пэўна, сапраўды пахне вераб'ямі гэтае месца на хлапчуковай галаве.

* * *

А яшчэ згадала старога чалавека на ровары з-пад Пінску. Ехаў, круціў пэдалі, шчасьліва ўсьміхаўся насустрач вечароваму сонцу, і цёплы вецер кранаў ягоны твар, разьдзімаючы даўгую сівую бараду на дзьве роўныя белыя паловы. Калі ровар праехаў, па-за сьпінай чалавека засьвяціліся ў промнях часткі ягонай белай-белай барады, якія ляцелі над плячамі, падхопленыя праймай, амаль паралельна зямлі.

* * *

У сярэдзіне адной сям'і сьняцца сны, якія бы ланцужком зьвязваюць сямейнікаў. Гэтак, мая цётка Галя з засьнежанага мястэчка на захадзе Беларусі паскардзілася маёй маці, што ніяк ня прыйдзе да яе мой ліст зь летнімі фатаздымкамі. Даведаўшыся пра гэта, я тут жа сасьніла сон, у якім выразна пабачыла драўляную паштовую скрынку ля дому, а праз шчыліны ў яе скалелым нутры канвэрт са сваім лістом, які туліўся ў цеснай прасторы паміж заінелых сьценак. На другую ж ноч ужо мая маці сасьніла тую самую паштовую скрынку пасярод сумётаў у садзе, з задзьмутай сьнегам сярэдзіны якой старанна вызваляла капэрту зь менскім адрасам, саскрэбваючы пальцамі сьнег, каб адчыніць дзьверкі. На трэці дзень цётка Галя насамрэч атрымала той ліст. І гэта ўжо ня сон. Як праўда і тое, што мой дзед, іхны бацька, зьніклы ў сьнягах Магадану 64 гады таму, служыў у заходнебеларускім мястэчку паштальёнам.

# Сьвет у ланцугах

Апошняя прэм'ера сэзону — як кропка, якую тэатар ставіць у сваім дыялёгу з публікай. Такая лёгіка ўсякага дыялёгу: рана ці позна ён мае скончыцца. Купалаўскі паставіў «кропку» новай п'есай Аляксея Дударава — містычна-гістарычным дэтэктывам «Ядвіга». З тэатральным праектам разьвітваецца Аляксандар Фядута.

Улюбёны анэкдот я калісь пераняў у мэмуарах Эльдара Разанава. Уваходзячы ў кіназалю, глядач прайшоў паўз кантралёра і ня даў яму «на чай». Той дагнаў жмінду і, ласкава паторгаўшы за рукаво, папярэдзіў яго:

— Не хвалюйцеся. Забойца — бухгальтар…

Ведама ж, вечар быў безнадзейна сапсаваны. Які кайф можна атрымаць ад дэтэктыву, ведаючы, чым усё скончыцца? Менавіта таму ня будзем пераказваць сюжэту новае п'есы галоўнага драматурга Беларусі. Толькі скажам, што спадар Аляксей Дудараў, на наш погляд, трохі перамудраваў, бо ў гэтым разе ня тое каб забойца (ды яшчэ і сэрыйны) аказаўся бухгальтарам, але проста ўся гісторыя, расказаная аўтарам п'есы, на наш погляд, ня ўтрымлівала ў сабе ніякіх такіх апорных пунктаў, якія хоць неяк падводзілі б да разгадкі таямніцы. Ад таго глядач пазбаўляецца магчымасьці прасочваць ход думак менскага судзьдзі Вальковіча — сьледчага, які і закліканы пакараць зло. Але ж акурат такая магчымасьць — паралельнага разгадваньня таямніцы — і стварае прывабнасьць дэтэктыву як жанру.

Але я — не Вальковіч, вялікакняскага мэдальёну ў кішэні ня маю, ня мне судзіць і выносіць вырак, таму і засяроджу ўвагу шаноўнага чытача не на фабуле п'есы (схадзеце самі ў Купалаўскі і рабеце свае высновы!), а на спэктаклі, на тым сынкрэтычным відовішчы, дзеля якога, уласна кажучы, усе мы і купляем квіткі.

Да ігры з рэальнасьцю на тэатральнай сцэне прывыкнуць можна, імаверна, — але няма патрэбы. Калі ў «Эрыку» дзеці пускаюць караблікі па вадзе, чуецца плёск праўдзівага вадаспаду, ты ўсё адно разумееш, што ўсё гэта — рэальна і ўмоўна адначасова. У «Ядвізе» Барыс Герлаван, галоўны мастак тэатру, нават намінкі на рэальнасьць не пакідае. Агромністую чорную пустату сцэны ён закоўвае ў ланцугі, якія зьвісаюць са столі. І — усё.

Гэты адзіны элемэнт дэкарацыі аказваецца настолькі багатым і красамоўным, што гледачу выпадае толькі сачыць за мэтамарфозамі гэтых каваных кавалкаў жалеза. То герлаванаўскія ланцугі — струмяні залевы, якая сьцяной закрывае змрочны сьвет сярэднявечнай Ашмяншчыны (яны нават шапацяць, як дождж, і ў шапаценьне гэтае дакладна ўвіваецца музыка Віктара Капыцькі). То — заслона, адмысловыя жалюзі таго часу, якія прыкрываюць уваход у пакой, дзе спыніўся судзьдзя. Яны мяняюць колер — залатымі робяцца ў вялікакняскім палацы, чорнымі — у лесе. Залежна да асьвятленьня плынь ланцугоў то празрыстая, то глуха непранікальная (дзякуй асьвятляльнікам — другі раз пасьля «Дзікага паляваньня» я проста ў захапленьні ад працы гэтага цэху Купалаўскага).

У гэтым сьвеце, жорстка абмежаваным ланцугамі, усе героі — нявольнікі свайго становішча. Вялікі князь (вельмі трапны стрэл Мікалая Кірычэнкі) заклапочаны сваім рэйтынгам сярод насельніцтва. Гетман (традыцыйна скупы ў выбары фарбаў, але вельмі пазнавальны і зразумелы Георгі Маляўскі), як усякі чыноўнік, баіцца страціць пасаду і робіцца яе закладнікам. Галоўныя героі — судзьдзя Вальковіч (Мікалай Прылуцкі ўпершыню на маёй памяці грае не ўвасабленьне грубай жывёльнай сілы і жарсьці, а інтэлект) і Ядвіга Русіноўская (пра Вікторыю Чаўлытку пагаворым далей) — ад самай першай сустрэчы ведаюць, што каханьне немагчымае — ланцугі сацыяльнага статусу скоўваюць іх, не даючы ім злучыцца.

Найбольш удала драматургам выпісаны, на наш погляд, вобразы трох сёстраў Русіноўскіх. Разрысаванай квадратамі падлогай бацькаўскай сядзібы яны рухаюцца, як шахматныя каралевы. Глядач запамінае і мяккія рухі і ласкавую гаворку Марты (Яўгенія Кульбачная): «Нялюбага мужа палюбіш, калі народзіш яму трэцяе дзіця…», — і палымяныя ад нянавісьці да тых, хто можа вольна распараджацца сваім пачуцьцём, вочы Марылі (Сьвятлана Анікей), якая з сваёй волі сышла ў манастыр, — і халодна разьмеркаваную гаворку галоўнай гераіні — Ядвігі, якая ў нейкі момант атрымлівае ў рукі нават садысцкі бізун — усё з тых самых ланцугоў. Тры варыянты жаночага лёсу — роўна страшныя, роўна гаротныя, роўна балючыя.

Чацьвертага варыянту глядач не пабачыць — ён адчуе яго, пачуе пра яго з прамоваў карчмара Давыдкі (Гарбук ёсьць Гарбук, што тут можна дадаць?). Стары мудры габрэй тужыць па Цылі, якая пакінула яго, і сьвята верыць пры гэтым, што Цыля жывая, што яна бачыць яго, сочыць за ім, памятае пра яго і накіроўвае ягоныя дзеяньні. Ня будзем паглыбляцца ў дэталі і спрачацца, наколькі гэта адпавядае догмам юдаізму, але па-хрысьціянску менавіта так з каханкамі, калі яны заўчасна разлучаюцца ў гэтым сьвеце, так, відаць, і мусіць адбывацца.

Аднак жа вернемся да галоўнай гераіні.

Пані Ядвіга Русіноўская (праўда, незразумела, чаму гэтую маладую ўдаву так упарта мянуюць дзявочым прозьвішчам — яна ж пані Глябовічава, калі не памыляюся?) — маладая, прыгожая, прывабная настолькі, што перад яе чарамі роўна безабаронныя і вялікі князь, і сьціплы менскі судзьдзя. Інтанацыі яе гаворкі роўныя і спакойныя, пра каханьне і сьмерць Вікторыя Чаўлытка ў гэтай ролі гаворыць аднолькава стрымана. І ад гэтай стрыманасьці акурат і робіцца вусьцішна. Гэты спакой ахвярнага ягняці, асуджанага на сьмерць у імя нейкай высокай мэты, высокай ісьціны? Якой мэты? Перамогі справядлівасьці.

Але што ёсьць справядлівасьць? Дзеля якой такой справядлівасьці можна растаптаць лёс юнай дзяўчыны, згвалтаваць маладую жанчыну, адняць у яе прыйшоўшае да яе нарэшце пачуцьцё? Якая справядлівасьць патрабуе сьмерці — замест каханьня? Няма такой справядлівасьці. Няма і быць ня можа.

Менавіта таму галоўным героем — і для драматурга, і для тэатру — ня робіцца раб гэтай самай справядлівасьці Вальковіч. Якімі б фарбамі ні маляваў яго зычлівы да яго Мікалай Прылуцкі (ён верна кіруецца пастулятам клясыка: свайго героя трэба любіць), з спэктаклю ўсё адно сыходзіш не даруючы яму ягонага службовага імпэту, які прыводзіць да гібелі Ядвігі.

Дакладней, чаму — «прыводзіць да гібелі»? Яна і так — мёртвая. Вікторыя Чаўлытка ад самага пачатку бліскуча грае жанчыну з забітымі пачуцьцямі. Нават жарсьць яе Ядвігі — жарсьць мярцьвячкі, асуджанай холадам сваіх абдоймаў губіць тых, каго яна палюбіць. І менавіта гэты холад перадаецца гледачу, авалодвае ім, ад чаго нават на недарэчы вымаўленае імя вялікага князя (яго, аказваецца, клічуць Аляксандар, пра што мы даведваемся толькі ў апошняй сцэне ад самой Ядвігі) заля рэагуе не гамэрычным рогатам, а маўчаньнем (Божа! Яшчэ і гэта — у дадатак да ўсяго).

Прызнаюся, што ў нейкі момант — гэта калі пані Ядвіга зьявілася зь бізуном з ланцугу ў руцэ — я падумаў быў, што Валер Раеўскі зрабіў памылку і паблытаў акторку Чаўлытку з акторкай Зелянкоўскай. Але не — маэстра быў абсалютна дакладны ў сваім выбары. Магчыма, спадарыня Зелянкоўская прадставіла б нам чарговую пякельную жарсьць а la «Чорная панна Нясьвіжу» альбо злачыннае пачуцьцё ў стылі лэдзі Макбэт. Але Вікторыя Чаўлытка паказала сваю гераіню — як нацыю, якая падпарадкавалася выбару, зробленаму калісь за яе, згвалтаваную праз два гады пасьля шлюбу і потым, выпадкова ўзятым у руку падсьвечні…

…і?



І я ўяўляю, як рэдактар гнеўна выкрэсьлівае гэтыя радкі з дасланага мною тэксту:

— Спадар Фядута, Вы ж абяцалі не пераказваць сюжэту! Хай чытач сам сходзіць у Купалаўскі, паглядзіць, зробіць высновы.

І загадае не друкаваць мяне больш на старонках «Нашай Нівы».

А зусім недалёка, на адлегласьці ўсяго адной станцыі мэтро ад рэдакцыі, у Купалаўскім, дырэктар тэатру, па-вялікакняску насупіўшы бровы, возьме ў рукі гэты нумар газэты і гнеўна патрасе ім перад усёй адміністрацыяй тэатру:

— Вось да чаго апусьцілася гэтая апазыцыя! Выглядаюць, вычытваюць тое, чаго ў нас зроду не было! Палітыкан хрэнаў! Не пушчаць яго больш у Купалаўскі! І ніякіх рэцэнзэнтаў — не пушчаць!

І фатаграфіі ўсіх патэнцыйных рэцэнзэнтаў, акрамя шаноўнага прафэсара Смольскага, зьявяцца ў кожнай тэатральнай касе Менску з пазнакай: «Квіткоў не прадаваць!». І гэта — яшчэ нічога. У маім улюбёным дзевятнаццатым стагодзьдзі небарак-рэцэнзэнтаў маглі саджаць на гаўптвахту, а гледачоў, якія асьвістваюць пастаноўку, дык і ўвогуле высылалі з сталіцы на рашэньне генэрал-губэрнатара! Так што час у нас ня самы людажэрскі.

Праўда, тады ўсе тэатры былі імпэратарскія. Цяпер тэатры, дзякаваць Богу, не прэзыдэнцкія. Тэатар належыць нам, гледачам! І нават калі фантастычны загад не прадаваць квіткоў зьявіцца, я буду па-ранейшаму прыходзіць у тэатар. Я «падсеў» на Купалаўскі. Так, відаць, заядлы курэц, задыхаючыся ад кашлю, цішком займае ў прыяцеля цыгарку — каб зацягнуцца, хай нават коштам лішняга дня жыцьця.

Я буду прыходзіць да галоўнай касы тэатру — і ўслухоўвацца ў гаворку пажылой жанчыны, якая прадае квіткі. Яна нават інтанацыямі нагадвае вялікую Галіну Макараву. Я буду вітацца з адміністратарамі, якія цалкам пасямейнаму сустракаюць гледача, дапамагаюць яму знайсьці сваё месца ў паўзмроку залі. Буду радасна пазнаваць актораў, якія прыйшлі на прэм'еру і сядзяць у залі, ня ведаючы мяне, — але я іх пазнаю — і радуюся гэтаму пазнаваньню. Вось ідзе калідорам ахутаны ўсенароднай любоўю Генадзь Аўсянікаў. Вось камусь тлумачыць нешта не заняты ў гэтай прэм'еры Сяргей Краўчанка. Вось крохкі цуд з двума гладкімі хвосьцікамі, перахопленымі рызінкамі, — Ганна Хітрык зь вялізнымі дзіцячымі вачыма. Вось ціха ўваходзіць у залю і сядае перада мной, запазьніўшыся, у шосты шэраг, Мікалай Кучыц: ён грае, але ў іншым складзе.

І мы ўсе разам глядзім спэктакль.

Як і сотні іншых гледачоў.

І мы ведаем дакладна, што, хоць заслона і апусьціцца, спэктакль нашага жыцьця будзе працягвацца. Таму што, канец канцоў, увесь сьвет на самай справе — тэатар. І ўся Беларусь — Купалаўскі тэатар. І тое, што адбываецца на сцэне, адбываецца і ў жыцьці. Кожны дзень. То камэдыя, то трагедыя, то містычны дэтэктыў у гістарычным касьцюме. Галоўнае — зразумець гэта, пазнаць саміх сябе — каб пасьмяяцца ці паплакаць над уласнымі лёсамі…

Але вось у залі запалілася сьвятло. Акторы выйшлі на паклон. У дырэктарскай лёжы ўзьняўся драматург, пляскаючы акторам, якія гралі прэм'еру. Глядачкі нясуць на сцэну кветкі. Публіка не сьпяшаецца пакідаць залю…

Сэзон скончаны, панове. А разам зь ім — і наш праект. Сустрэнемся ў залі!

**Аляксандар Фядута, глядач**

# «Аўтарадыё»: Праблема толькі ў музыках

Станцыя, што аддае перавагу беларускай музыцы, дасягнула ў сталіцы рэйтнгу 12% аўдыторыі.

Калі хто ня ведае: «Аўтарадыё» можна слухаць у Менску і Менскай вобласьці на хвалях 67,7 і 105,1. Гэта адзіная FM-станцыя, дзе вы не пачуеце бясконцых пераліваньняў з пустога ў парожняе проста таму, што дыджэяў тут няма як такіх. Гэта прынцыповая пазыцыя радыёстанцыі. Толькі музыка і аўтарскія тэматычныя праграмы.

Прычым музыка, якая рэалізуе яшчэ адзін прынцып: яна павінна быць жывой. Ладная частка гэтай жывой музыкі — плён творчасьці найлепшых беларускіх музыкаў: тут можна пачуць і «Краму», і «Палац», і Вайцюшкевіча, і Вольскага, і шмат каго яшчэ.

З гендырэктарам «Аўтарадыё» Юр'ем Базаном і праграмным дырэктарам Ірынай Львовай **(на фота)** — стомленымі пры канцы працоўнага дня, але на дзіва вясёлымі — гутарыць Наталка Бабіна.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Для каго гучыць «Аўтарадыё»?

**Наталка Бабіна: Як узьнікла ідэя фармату, у якім працуе «Аўтарадыё»?**

**Юры Базан:** Калі радыё будуецца паводле праграмнага, дыджэйскага прынцыпу, то часта дыджэй настолькі выматваецца, што пачынае вярзьці нейкую лухту, папросту каб запоўніць эфір. Ведаючы ФМ-эфір — беларускі, расейскі, эўрапейскі — мы прыйшлі да высновы, што трэба рабіць або вузкастылёвую станцыю, або паспрабаваць нейкім чынам зьвязваць розныя жанры. Калі вузкастылёвую, то якую? Першае, што прыходзіць на розум, — папсовую. Але папса настолькі замыленая, што чалавеку хоць зь нейкім розумам папросту нецікавая. Зьвязаць у розных праграмах розныя жанры вельмі складана — трэба мець калясальны досьвед і інтуіцыю. Таму мы вырашылі пабудаваць фармат на прынцыпе музычных блёкаў.

Ёсьць мэдычны тэрмін — час утрымваньня ўвагі. Чалавек можа быць зацікаўленым пэўнай тэмай на працягу нейкага часу, потым увага рассейваецца, і тэму трэба мяняць. Час утрыманьня ўвагі сучаснага чалавека — 20 хвілінаў. Вось зыходзячы з гэтага мы і вынайшлі свой фармат: 20 хвілінаў. У нас блёчная канструкцыя эфіру: кожныя 20 хвілінаў мяняецца жанр або праграма. Урэшце, калі вам гэта не падабаецца, то праз 20 хвілінаў будзе новая праграма.

З самага пачатку мы арыентаваліся на беларускіх выканаўцаў, то бок выканаўцаў, якія не капіююць расейскую папсу, а нейкім чынам разьвіваюць менавіта нашую культуру.

**Ірына Львова:** Была патрэба ў тым, каб стварыць станцыю для аўтааматараў, а таксама іншых людзей, якім музыка дапамагала б працаваць і адпачываць. Лічылася, што для радыйнага эфіру падыходзіць толькі папулярная музыка. Я б не называла яе папсовай, бо ў гэтым слове крыецца нейкае нэгатыўнае адценьне. Але вось аматарам іншых жанраў беларускі радыёэфір чамусьці нічога не прапаноўваў. Вось мы і занялі гэтую нішу. Мы працуем для людзей з добрым густам, для тых, хто цэніць музыку. Ва ўсім сьвеце лічыцца, што рокавую музыку слухае 7% слухачоў. Мы маем рэйтынг 12%, і гэта вельмі добры паказчык.

**НБ: А хто ваш слухач?**

**ІЛ:** Па выніках сацыялягічных апытаньняў, наш сярэднестатыстычны слухач — мужчына, старэйшы за 25 год, з вышэйшай адукацыяй і досыць высокім культурным узроўнем.

Таму ў нас і няма ні навінаў, ні дыджэяў, якія забаўляюць публіку. Наш слухач дастаткова адукаваны для таго, каб знайсьці патрэбную яму інфармацыю самастойна. Мы хочам проста даць магчымасьць яму паслухаць музыку: рок, блюз, флямэнка, аргентынскае танга — ды што заўгодна. Даць альтэрнатыву таму, што гучыць на іншых станцыях.

## «Аўтарадыё» плянуе пашырыцца на рэгіёны

**НБ: Як вы адчуваеце сябе сярод канкурэнтаў?**

**ЮБ:** Нармальна адчуваем (сьмяецца). Па некаторых паказчыках мы ў першай пяцёрцы радыёстанцыяў.

**НБ: Ці плянуеце нейкім чынам адбіваць у іх слухачоў ды пашыраць сваю слухацкую аўдыторыю?**

**ЮБ:** Пра пашырэньне аўдыторыі гаварыць складана. Заўсёды ў грамадзтве ёсьць катэгорыя людзей — я ні ў якім разе не хачу нікога пакрыўдзіць — але ў кожным грамадзтве ёсьць катэгорыя людзей зь невысокім, ніжэй сярэдняга, узроўнем інтэлекту. Вось ім патрэбныя каналы з папсой. Іх многа, каля 30% насельніцтва.

**НБ: Вас гэта не палохае?**

**ЮБ:** Гэта нармальна, гэта ўсюды так, ня толькі ў нас. Дай ім папсу, атрымаеш адразу высокі рэйтынг. Гэта і выкарыстоўваюць некаторыя радыёстанцыі, якія маюць высокі рэйтынг, але насамрэч уся іх аўдыторыя — гэта менавіта людзі з гэтай катэгорыі, і нічога, акрамя папсы, ім не патрэбна.

**НБ: Чаму ж так адбываецца? У час нашых бабуль і дзядуль іхняй «папсой» было тое, што мы цяпер ведаем як народныя песьні, а цяпер, выходзіць, людзі атупелі?**

**ЮБ:** Вы ня маеце рацыі, народныя песьні — гэта ніякая не папса і ніколі не былі ёю. Тыя старыя песьні гучаць і цяпер. Папса — гэта вынаходніцтва сучаснага сьвету, магчыма, вынаходніцтва нейкіх псыхатэхналёгій. Тут выкарыстоўваюцца пэўныя рытмы, гэтыя «бумц-бумц», якія сапраўды пэўным чынам атупляюць. Але няправільна сказаць, што менавіта папса атупляе народ. Атупляе яго ўсё ж нешта іншае (сьмяецца). Бываюць жа і нармальныя добрыя папсовыя песьні. Уся Пугачова — гэта папса.

Але я хачу сказаць, што на той тэрыторыі, дзе мы вяшчаем, — а гэта Менск і Менская вобласьць — мы сваю аўдыторыю атрымалі. Павелічэньне аўдыторыі магчыма за кошт пашырэньня вяшчаньня на іншыя рэгіёны Беларусі, што мы маем у плянах.

Калі мы павысім колькасьць папсы, для таго каб завалодаць аўдыторыяй зь нізкім музычным густам, то страцім нашую сёньняшнюю аўдыторыю. А нашай сёньняшняй аўдыторыі не патрэбная балбатня. Яны хочуць чуць добрую, грунтоўна падабраную музыку.

## Прыносьце песьні — мы іх паставім

**НБ: Каго вы рацыруеце?**

**ІЛ:** Мы — мультыфарматная станцыя. Мы рацыруем самыя розныя жанры. Аддаем перавагу жывой музыцы. Ставім у эфір якасны прадукт.

**НБ: А як вы вырашаеце, якасны гэта прадукт ці не?**

**ІЛ:** Музычная кампазыцыя павінна быць запісанай і зьведзенай прафэсіянальна. І гэта, бадай, усё. Наш прынцып — ня мець фаварытаў. Мы хочам, каб у эфіры было ўсё, што цікава слухачу.

**ЮБ:** Прыносяць шмат музыкі, але асноўная маса — зноў-такі тая папса. Тыя, хто робіць нешта лепшае, ня могуць прадукаваць столькі ўсяго, каб мы маглі запоўніць эфір. Таму папса прасочваецца. Магчыма, паслухаўшы сябе ў эфіры, яны зробяць нешта лепшае (сьмяецца).

## 75%

**НБ: Патрабаваньне пра гучаньне ў эфіры 75% беларускіх выканаўцаў прыносіць больш шкоды ці карысьці?**

**ЮБ:** Я не магу сказаць, наколькі гэтае патрабаваньне выконваецца іншымі радыёстанцыямі. Бывае, што слухаеш-слухаеш — і нічога беларускага не пачуеш. Хіба што лічыць, што бабуля ў таго ці іншага выканаўцы была зь Беларусі... Але карысьць яно прынесла, хаця б таму, што прымусіла варушыцца нашых выканаўцаў. Але ў нас і да гэтага было 50—60% беларускай музыкі.

**НБ: Чаму?**

**ЮБ:** Што за пытаньне? Жывем мы тут! Не ў Нямеччыне, не ў Расеі — тут. У нас свая культура.

**НБ: Тады чаму, па-вашаму, многія іншыя станцыі нават у рамках патрабаваньня 75 працэнтаў беларускай музыкі находзяць бабуль-беларусак у якой-небудзь Лады Дэнс, але слова беларускага ў іх эфіры не пачуеш?**

**ІЛ:** Складана сказаць. Беларускамоўныя калектывы ў нас у асноўным рокавыя. На іншых станцыях року проста не ставяць. Беларуская мова — мова інтэлігентаў, а гэтыя станцыі арыентуюцца на іншую аўдыторыю.

**ЮБ:** Я так разумею, што калі ў гэтых станцыяў ёсьць нейкія заснавальніцкія ці фінансавыя расейскія крыніцы, то ім беларуская музыка ўвогуле непатрэбная. Гэта палітыка станцыяў. На расейскіх станцыях беларускай музыкі не пачуеш. І яшчэ, магчыма, гэта тлумачыцца тым, што на раскручаных расейскіх выканаўцаў зарабляюць грошы. Мы на сваіх выканаўцах грошы не зарабляем (сьмяецца).

**НБ: А чым вы зарабляеце?**

**ЮБ:** Крыніца адна — рэкляма.

**НБ: Рэклямадаўцаў многа?**

**ЮБ:** Мы іх шукаем у горадзе, у полі, у лесе, з лупай, ліхтарыкам — дзе толькі можна. У нас сфармаваўся рынак рэклямы, але пакуль у нас няма разуменьня ў рэклямных агенстваў і саміх рэклямадаўцаў, што розныя радыёстанцыі — гэта розны слухач, з рознымі патрэбамі. Многія настроеныя так: у якой радыёстанцыі рэйтынг больш — туды і піхай, не асабліва задумваючыся пра тое, з каго складаецца слухацкая аўдыторыя. Але патроху сытуацыя мяняецца. Ёсьць у нас і пастаянныя кліенты, зь якімі мы супрацоўнічаем даўно. Радыёрэкляма — яна недарагая, многа не патраціш. На тэлевізіі зусім іншыя расцэнкі. Галоўнае — не памыліцца радыёстанцыяй.

**ІЛ:** Рэклямадаўцаў многа не бывае! Але апошні час іх большае. Яны нарэшце зьвярнулі на нас увагу, зразумелі, што рэйтынг 12% — гэта шмат.

**НБ: Якая праблема сёньняшняга дня для «Аўтарадыё»?**

**ЮБ:** Праблема сёньняшняга дня — у беларускіх музыкантах. Хочацца ім пажадаць, каб яны больш тварылі. Я не кажу пра папсу — яе якраз досыць. А вось сапраўдным творцам хочацца пажадаць больш шчасьця ў жыцьці, або, наадварот, больш дробных праблемаў, — каб іх прабівала на творчасьць. Каб страсянуліся — ух! — і выдавалі больш шэдэўраў.


зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»



**Васіль Быкаў. Сьцяна.**



**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.**



**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.**



**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца**



**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**

## У Менску хуліган абстраляў аўтобус

Аўтобус рухаўся па праспэкце Незалежнасьці. У салёне было чалавек пяць Адзін пасажыр задрамаў, а калі прачнуўся, пабачыў, што прапусьціў свой прыпынак. Відавочна нецьвярозы, ён рынуўся да кабіны кіроўцы з патрабаваньнямі затармазіць. Той не пагаджаўся. Пасажыр дастаў пісталет. Кіроўца спыніў аўтобус. Пад пагрозамі ўзброенага парушальніка пасажыры выйшлі на вуліцу. Кіроўца — сьледам.

У нейкі момант ён скарыстаўся замяшаньнем, ускочыў у аўтобус і націснуў на газ. Буян страляў усьлед. Чатыры кулі прабілі заднюю шыбу. Ніхто не пацярпеў. Затрымалі парушальніка ў той самы дзень. Усчатая крымінальная справа.

## Выйшлі пакурыць — і абваліліся

У Менску ў хрушчоўцы абрынулася бальконная агароджа. Зь пятага паверху зваліліся тры мужчыны. У іх — шматлікія пераломы. У Менску сёньня каля двух тысяч балконаў, штто патэнцыйна небясьпечныя й патрабуюць рамонту.

## У Барысаве дзяўчына без майткоў абкрадала ўнівэрмаг

Дзяўчына прыходзіла ў краму бяз споднягa, а выходзіла ў новай бялізьне, прычым у двух станіках адразу. Аддзел жаночага адзеньня ўнівэрмагу «Веста» страціў тавараў на пяць мільёнаў рублёў. Прадаўцы затрымалі яе, калі яна спрабавала вынесьці дзьве блюзкі й споднюю бялізну. Яна прыйшла ў краму ў такой самай куртцы, якая прапала з аддзелу некалькі дзён таму.

## Шаршні закусалі да сьмерці

У лесе паблізу вёскі Скачок, што ў Кіраўскім раёне, пасьля ўкусаў шаршнёў памёр 50-гадовы жыхар Масквы. Расеец з жонкай прыехаў у госьці да цешчы. Хадзіў па грыбах і вырашыў залезьці на наглядальную паляўнічую вышку. Там шаршні, якія парабілі на верхатуры свае гнёзды, яго і пакусалі. Пачалася алергічная рэакцыя, небарака памёр на месцы.

## Лунінецкі Эдып

13-гадовы хлопчык сякерай ён расправіўся зь нецьвярозым сужыцелем сваёй маці за грубае стаўленьне да яго. У Лунінецкім сельсавеце сям'ю характарызуюць як непасьпяховую: маці неаднаразова выклікалі на камісію па барацьбе з п'янствам. Дзеці знаходзяцца ў сацыяльным прытулку.

Для ўсёй школы гэта быў шок, расказалі настаўнікі. Сем клясаў хлопчык скончыў нармальна, заўжды акуратны, паважлівы, зычлівы й паслухмяны, прыглядаў за меншымі сястрой і братам. Якую меру пакараньня вызначыць суд — невядома.

## У Пінску дзік тараніў легкавік

Ноччу ў мікраараёне, які прымыкае да лесапарку, на дарогу выбег дзік. Разьюшаны сьвятлом фараў і сыгналамі, ён кінуўся на першы-лепшы легкавік. Жывёліна вагой 150 кіляграмаў пратараніла машыну і загінула. Людзі ў аўто не пацярпелі.




**У Гомелі на чыгуначным Клёнкаўскім мосьце прайшоў штогадовы фэстываль па скачках з мосту ці па-прафэсійнаму — роўп-джампе. З мосту да вады — 20 мэтраў палёту, а калі ўзьлезьці на фэрмы — усе 30.**

## У Менску чалавек зваліўся зь дзявятага паверху

У Менску на будоўлі дому па Лагойскім тракце 50-гадовы муляр упаў зь дзявятага паверху і забіўся. Паводле папярэдніх зьвестак, прычынай здарэньня стала парушэньне тэхнікі бясьпекі.

## На Ігналіне не туды націснулі

Няпланавае спыненьне ўсяго другога блёку станцыі 28 ліпеня а 22.30 адбылося па віне работніка АЭС. Апэратар няправільна скарыстаўся пультам.

## У Аўстрыі наш дальнабойшчык паставіў рэкорд па выпітым алькаголі

Супрацоўнікі дарожнай паліцыі параўналі ўбачаную імі беларускую фуру з бомбай на колах. Поўная грузу машына рабіла на трасе «васьмёркі». Як паказаў тэст, 47-гадовы кіроўца меў амаль 3 праміле алькаголю ў крыві, што адпавядае прыкладна 600 грамам гарэлкі. Дапушчальная ў Аўстрыі норма 0,5 праміле. Колькасьць алькаголю ў крыві беларуса — абсалютны рэкорд для дарогаў Аўстрыі. Кіроўцу аштрафавалі на 1500 эўра і пазбавілі правоў.

## У Індыі ля храму загінулі 140 паломнікаў

Сама меней 140 чалавек загінулі й 50 атрымалі раненьні ў цісканіне ля храму Найна Дэві на поўначы Індыі. Сярод загiблых — дзясяткі дзяцей. Паломнікі кіраваліся да храму, каб адзначыць сьвята Шраван Наўратрас. Храм месьціцца на вяршыні гары ў Гімалаях. Да храму вядзе вузкая дарога. У момант трагедыі на ёй стоўпіліся каля 50 тысячаў вернікаў.

## У Нарвэгіі шаравая маланка ўдарыла па заўзятарах

Інцыдэнт адбыўся ў нядзелю ў паселішчы Фліса ля мяжы з Швэцыяй. Маланка ўдарыла ва ўзгорак, на якім стоўпіліся заўзятары, што прыйшлі паглядзець аўтаралі. Вакол тых людзей, у каго ў руках былі мэталічныя прадметы, пачалі сыпацца іскры. Іскрыліся нават парасоны. На шчасьце, абышлося без сьмяротных ахвяраў.

## У Бэльгіі моўныя спрэчкі

Улады разьмешчанай у бэльгійскай правінцыі Фламандзкі Брабант камуны Завэнтэм патрабуюць ад усіх асобаў, якія не валодаюць у дастатковай ступені нідэрляндзкай мовай, прыходзіць на прыём зь перакладчыкам. Адпаведную аб'яву ўлады камуны вывесілі ў будынку раённай адміністрацыі.

## У ЗША сьвятар гвалціў уласных дочак

У паліцыю зьвярнулася 19-гадовая дачка прапаведніка Энтані Хопкінса з Алабамы. Яна расказала, што ейны бацька гвалціў яе з 11 гадоў. У 2004 г. жонка Хопкінса засьпела за гэтым мужа. Усчалася сварка, Арлета выставіла мужа з дому, але Хопкінс прабраўся цераз акно і ў той жа вечар расправіўся з жонкай. На раніцу ён папрасіў дзіця дапамагчы яму «схаваць матульку ў лядоўню». «Ейнае цела дагэтуль у маразільнай камэры», — распавяла дзяўчына ў паліцыі. Сьвятар-эвангеліст быў затрыманы ў адной зь мясцовых цэркваў падчас пропаведзі пра дараваньне і справядлівы суд.

## Антычны кампутар абслугоўваў Алімпіяду

Знойдзены больш як стагодзьдзе таму «атыкітэрскі мэханізм» працягвае прыносіць сюрпрызы. Цяпер на ім знойдзеныя прыстасаваньні для адсочваньня алімпійскіх цыкляў. Гэты першы ў гісторыі чалавецтва кампутар уяўляў зь сябе драўляную шафу з складанай сыстэмай бронзавых шасьцяронак і прызначаўся для разьліку руху нябесных целаў. Мэханізм быў знойдзены ў моры дужа спарахнелым, і цяпер вядуцца працы па яго сканаваньні, каб уявіць першапачатковы стан. У прыватнасьці, ужо знойдзены 199-гадовы каляндар з фазамі Сонца і Месяца, а таксама 18-гадовы цыклічны паказьнік сонечных зацьменьняў.

І вось цяпер на ім знайшлі цыкль, зьвязаны з Алімпійскімі гульнямі, пра што сьведчыць прачытанае слова «Алімпія» і кругавая шкала для разьліку часу правядзеньня ўсіх Панэлінскіх гульняў.

Яшчэ адной знаходкай навукоўцаў сталі назвы месяцаў, якія выкарыстоўваліся ў антычнасьці жыхарамі заходніх грэцкіх калёній, найперш Сыцыліі. А менавіта ж там жыў Архімэд, адзін з «падазраваных» у стварэньні антыкітэрскага мэханізму. Згадка пра якуюсьці «машыну для разьліку руху плянэтаў», змайстраваную Архімэдам, ёсьць у Цыцэрона.

## Рудая мыш п'е — і хоць бы што

Дрэўная рудая мыш, якая жыве ў Малайзіі, чакае прыцемкаў, тады залазіць на пальму й п'е з кветак забрадзілы нэктар, які ўтрымлівае 3,8% алькаголю. Штодня яна спажывае столькі алькаголю прапарцыйна да сваёй масы цела, што ў выпадку з чалавекам гэта магло б прывесьці да сур'ёзных наступстваў для здароўя. За 55 млн гадоў эвалюцыі рудыя мышы здолелі прыстасавацца да такога ладу жыцьця, таму ад выпітага цяпер зусім не п'янеюць.

## Лішняя вага заразная

На чалавека падсьвядома ўплывае вага людзей, якія яго атачаюць, і таму тлустыя людзі могуць стаць прычынай лішніх кіляграмаў у сваіх сябрукоў, сьцьвярджаюць навукоўцы. Гэтую зьяву называюць «імітацыйным атлусьценьнем». Чалавек міжволі параўноўвае сябе зь іншымі людзьмі пры тым, што ўяўленьні пра норму зьмяніліся й працягваюць мяняцца.

## 19% стогадовых карыстаюцца мабільнікам

Большасьць стогадовых, выглядае, спакойнга абыходзяцца бяз цудаў тэхнікі, але 19% зь іх карыстаюцца мабільным тэлефонам. Такія вынікі дасьледаваньня, праведзенага ў ЗША. З асваеньнем SMS справа йдзе марудней: толькі адзін з ста апытаных калі-небудзь набіраў на тэлефоне кароткія паведамленьні. Агулам 12 адсоткам асоб у веку ад 100 гадоў даводзілася карыстацца інтэрнэтам.

## Шкода есьці

Каманда пекараў вырашыла пакпіць з аўтамабілебудаўніцтва й стварыла свой варыянт новай «Шкоды Фабіі» — ядомы. На гэты «Шкода-торт» ў кандытараў пайшло 100 кіляграмаў мукі й столькі сама цукровай пудры, 180 яек, 30 кг міндалю, 65 кг цукатаў і гара шакаляду.

**Паводле радыё «Свабода», БелаПАН, «Эўрарадыё», «Звязда», «Электронны Барысаў», Бі-Бі-Сі, National Geographic**


Паветраныя піраты
частка першая
Далёка ў акіяне, недзе паміж Афрыкай і Індыяй, пагойдваўся на хвалях карабель “Волат”.
ВОЛАТ
Нешта ў мяне ў жываце з голаду бурчыць!
Нічога, зараз наловім рыбкі!
Я злавіў дзіравы бот!
А я - старое кола!
Адно сьмецьце замест рыбы!
Але сябры не гублялі надзеі...
Бярэцца!
Зараз я вам дапамагу!
Трымайма мацней!
Нішто сабе, рыбка!
Напэўна, гэта кіт!
працяг будзе...
Капітан Танака ©

## ВЫСТАВЫ

### Гравюры ван Дэйка ў Горадні

Выстаўка «Ван Дэйк і ягоная эпоха» працуе **ў Авальнай залі Гарадзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалягічнага музэю**. У экспазыцыі прадстаўленыя 30 гравюраў знакамітага флямандзкага мастака Антоніса ван Дэйка (1599—1641). Вучань Рубэнса, галоўны прыдворны жывапісец ангельскага караля Карла I, ван Дэйк, які хутка зрабіў кар’еру і здабыў славу перш за ўсё сваімі жывапісныміараднымі партрэтамі, спрабаваў сябе і ў гравюры. Можна пабачыць гравюры-партрэты, на якіх адлюстраваныя сучасныя ван Дэйку мастакі, гравёры, скульптары, мэцэнаты, работы мастака на рэлігійную тэму. Дапоўняць выставу арыгінальныя кнігі XVII ст. і прадметы інтэр’еру той эпохі.

### Сум і чароўнасьць правінцыі

**У галерэі «Сьвет фота» (пр.Прытыцкага, 10)** працуе фотавыстава Ежы Пёнтэка «Сум і чароўнасьць правінцыі». Ежы Пёнтэк на працягу многіх гадоў фатаграфаваў правінцыю каля г.Кельцэ. Зварот да памяці — важная рыса фатаграфіі. І менавіта фатаздымкі Е.Пёнтэка дазваляюць адчуць аўру мінулых гадоў, затрымаць у кадры «дух часу».

### Шкло і мэтал

**У Палацы мастацтваў да 17 жніўня** працуе мастацкая выстава Жанэты Шыдлоўскай. Сярод яе працаў — вітражы, мазаікі…

### Творы Валянціны Сьвентахоўскай

**У Палацы мастацтва да 17 жніўня** працуе выстава твораў Валянціны Сьвентахоўскай.

### Залаты фонд

**З 6 да 31 жніўня ў Палацы мастацва** працуе выстава «Залаты фонд беларускага саюзу мастакоў. На выставе будуць прадстаўленыя больш за 200 твораў беларускіх майстроў, якія сталі клясыкамі беларускай школы жывапісу.

### «Жыцьцё праз колер»

**У Мастацкім музэі (Леніна, 20) да 18 жніўня** працуе выстава твораў Міколы Бушчыка. Сёлета Міколу Бушчыку споўнілася 60 гадоў. Карціны мастака прадстаўленыя ў мастацкіх калекцыях Беларусі, ЗША, Італіі, Канады, Латвіі, Нямеччыны, Расеі, Францыі і іншых краінаў сьвету. Створаныя мастаком знакі ў жывапісных творах жывуць самастойным жыцьцём, лёгка і вольна нараджаючы ў сьвядомасьці гледача новыя сымбалі і вобразы.

### Схавалі ад рэвалюцыі

**Музэй гісторыі і культуры (Маркса, 12)** упершыню паказаў гледачу «менскі скарб» — унікальны збор срэбных прадметаў чатырох стагодзьдзяў. Місы імпэратараў, скрыначка князёўны, георгіеўскія крыжы, ажурныя вазы і падсьвечнікі — усяго 547 рэчаў, створаных майстрамі заходнеэўрапейскай і расейскай школаў. Скарб быў знойдзены пры правядзеньні будаўнічых работаў на скрыжаваньні вул.Валадарскага і Ўрыцкага ў сталіцы 4 жніўня 1988 г. Хутчэй за ўсё, скарбы былі закапаныя пасьля рэвалюцыйных падзеяў 1917 г.

### Чэпік у Шчамялёва

Выстава твораў беларускага мастака Міхала Чэпіка называецца «Мой Менск». На выставе **ў галерэі Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49)** сабрана каля 30 пастэляў. На гэтых працах можна пабачыць Менск 50—70-х XX ст. Міхал Чэпік нарадзіўся ў вёсцы Залесьсе на Лепельшчыне ў 1925 г. У 1951—1985 гадах ён быў мастаком-дэкаратарам Опэрнага тэатру. Ён тварыў у розных жанрах станковага жывапісу, а таксама ў акварэлі, графіцы ды плякаце.




## ЛЕТНІК

### Летнік на Мядзельшчыне

**Да 18 жніўня** ў рамках праграмы па захаваньні Эўрапейскай гісторыка-культурнай спадчыны пройдзе летнік, арганізаваны Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў. У праграме — прывядзеньне ў парадак падмуркаў сядзібнага дома Скірмунтаў у Шэметаве, добраўпарадкаваньне нямецкіх ваенных могілак Першай сусьветнай у Карабанах, усталяваньне ў памяць пра разбураныя помнікі крыжоў і іх асьвячэньне. Прадугледжаны і цыкль лекцыяў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, фотавыстава, канцэрты, конкурсы. Ахвотныя ўзяць удзел могуць патэлефанаваць арганізатарам: (029) 111-73-32 альбо даслаць ліст на мэйл: astant@tut.by

### Летняя школа для асьпірантаў у Вільні

**21—28 верасьня ўнівэрсытэт імя Мікалая Ромэра** запрашае студэнтаў-дактарантаў, якія спэцыялізуюцца ў галіне сацыяльных навук, на летнюю школу, прысьвечаную праблемам дэмакратыі ў пост-камуністычнай Эўропе. Працоўная мова — ангельская. Арганізатары забясьпечваюць удзельнікаў жыльлём і харчаваньнем на пэрыяд тыднёвага курсу. Кандыдатам для ўдзелу неабходна даслаць CV, кароткае апісаньне тэзаў па тэме спатканьня і заяўку на адрас: summer_school@mruni.eu.

## КАНЦЭРТЫ

### Крама

**8 жніўня ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт «Крамы». Пачатак а 20-й. Т.: (029) 671-58-65, (029) 254-49-09

### Be Free

**9—10 жніўня ў Львове (Украіна)** — фэст Be Free. Хэдлайнэры фэстывалю: **«Крама»**, **ULIS**, **Neuro Dubel**, **T-Love** (Польшча), **«Тартак»** (Украіна).

### Be2gether

**14—17 жніўня ў Нарвілішках (Літва)** — фэсты Be2gether. Выступаюць: **Groove Armada**, **Fool’s Garden**, **Infected Mushroom**, **OSIMIRA**, **Mauzer** і іншыя.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Каму выгадна варушыць мумії?

**Мумія: грабніца імпэратара цмокаў** (The Mummy: Tomb of the Dragon Emperor)
ЗША — Нямеччына — Канада, 2008, каляровы, 112 хв.
**Рэжысёр:** Роб Коэн
**Ролі выконваюць:** Брэндан Фрэйзэр, Джэт Лі, Марыя Бэла, Джон Ганна, Люк Форд, Ізабэла Лян
**Жанр:** Прыгоды
**Адзнака:** 5 (з 10)

Уладалюбны кітайскі імпэратар, які прагнуў неўміручасьці, быў разам з арміяй зачараваны пакрыўджанай ведзьмай. Праз тысячагодзьдзі няўрымсьлівая сямейка Конэлаў абудзіла мумію імпэратара і ягоных гліняных ваяроў. Цяпер імпэратар прагне заваяваць увесь сьвет — і толькі дасьведчаныя змагары з муміямі здольныя яго спыніць…

Першы раз парэшткі муміі былі патрывожаныя ў 1932 г., калі Барыс Карлаф сыграў бесьсьмяротнага фараона. Да сярэдзіны саракавых студыя «Юнівэрсал» стрыгла купоны са сьвежай кашмарнай тэмы. Пад канец 1950-х на муміях зарабляла грошы брытанская кампанія «Хамэр» — але і яе імпэт ня быў вечным.

У 1999 г. галівудзкі рэжысёр Стывэн Сомэрз вярнуў мумію ў шырокі пракат. Страхалюдная істота мела ашаламляльны посьпех дзякуючы выбітным спэцэфэктам і дасьціпнаму гумару, які рабіў стужку прыдатнай для ўсёй сям’і.

«Мумія: грабніца імпэратара цмокаў» — трэцяя сэрыя апошніх прыгодаў (у 2002 г. «Мумія вярталася»).

Як і мае быць са стомленымі гандлёвымі працягамі — кітайская мумія адрозьніваецца ад папярэдніцаў у горшы бок. Кудысьці зьнік фірмовы гумар. Адмысловыя эфэкты — звычайныя, галівудзкія — гэта значыць з маштабам, але без аганьку (калі не лічыць падпаленага азадку аднаго недарэкі). Б’юцца арміі мерцьвякоў, археолягі на машынах ганяюцца за жывымі муміямі. Імпэратар кідаецца шаравымі маланкамі і пераўтвараецца ў трохгаловага цмока, ласага да маладзенькіх дзяўчатаў.

Мужныя героі пад аховай калматых сьнежных людзей расстрэльваюць ворага, заводзяць амуры зь бесьсьмяротнымі фэямі і ванітуюць у самалёце, які ледзьве не развальваецца ў паветры.

Для кітайцаў карціна — абраза, бо амэрыканцы зьдзекуюцца зь першага тамтэйшага імпэратара Цынь Шы Хуандзі. Для сусьветнай папкорнавай публікі — лёгкая забаўка ў сьпякотны жнівеньскі дзень.

Брэнд муміі мусіць быць скарыстаны напоўніцу.

**Андрэй Расінскі**

# Як лавіць сабаку Баскервіляў

**ЛЕВЫМ ВОКАМ**



Толькі праз месяц пасьля выбуху ў ноч на 4 ліпеня да мяне дайшла лёгіка сьледчых, якія вядуць пошукі злачынцы. Вось як выглядала б славутая гісторыя пра сабаку Баскервіляў, калі б мэтадам Навумава скарыстаўся дэтэктыў з Бэйкер Стрыт. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

На інспэктара Лестрада было проста шкада глядзець.

— Холмс, у мяне мара абысьці возера Лох-Нэс пешшу. Толькі сабраўся ў паход, а тут гэты дурны сабака. Дзе яго лавіць, як? Дапамажыце!

Шэрлак Холмс перастаў кратаць скрыпку. Павісла мёртвая цішыня: было нават чутно, як у будынку насупраць прафэсар Марыярці валэндаецца з духавым ружжом.

— Я гатовы заняцца гэтай справай пры адной умове — вы, містэр Лестрад, падпарадкоўваецеся маім загадам.

— О'кей.

— Тады за справу, — Холмс энэргічна прайшоўся па пакоі. Ватсан, хто ў нас цяпер у апазыцыі да Яго Вялікасьці?

— Ну, раз кабінэт утварылі торы, то ў апазыцыі цяпер лібэральная шушамець: гэты, як яго, — Чэмбэрлен…

— Цудоўна! Лестрад, дапытайце ўсіх лідэраў апазыцыі — што рабілі ў ноч, калі сабака Баскервіляў пагрыз сэра Чарлза. Усіх, у каго няма алібі, у Таўэр на 13 сутак.

Я і Лестрад афігелі.

— Холмс, гэта ж поўная дурка!

— Вы пагадзіліся падпарадкоўвацца, — адрэзаў дэтэктыў, зьнікаючы за дзьвярыма свайго кабінэту.

Я пабачыў яго толькі зранку, калі ён спусьціўся да брэкфасту.

— Што сёньня пішуць у «Таймз», Ватсан?

Я прабегся вачыма па загалоўках:

— Лестрад заявіў, што ён проста прасеяў лібэралаў; расейскія сацыял-дэмакраты зладзілі ў Лёндане зьезд, на якім пацапаліся з бальшавікамі і меншавікамі; «Чэлсі» зьліў «Эвэртану»…

— Цудоўна! Перадайце Лестраду новы загад: арыштаваць усіх уладальнікаў сабак дэкаратыўнай пароды стэдфардзкі тэр'ер і дапытаць — што іх пупсікі рабілі ў ноч, калі сабака Баскервіляў пакусаў сэра Чарлза.

Такой шызы я не чакаў. Аднак выславіць скепсіс не пасьпеў: Шэрлак ужо схаваўся ў сваім кабінэце.

Я пабачыў яго толькі наступнай раніцай за брэкфастам.

— О! Ватсан! — закрычаў Холмс пры маім зьяўленьні, што там пішуць у «Таймз»?

— Інспэктар Лестрад распрагае, што ёсьць усе падставы, каб казаць, што справа будзе раскрытая; капітан карабля «Тытанік» забіў пары, што ягоная пасудзіна вытрымае сутыкненьне з айсбэргам; «Чэлсі» зьліў «Манчэстэру»…

Холмс быў задаволены.

— «Лівэрпуль» абавязкова стане чэмпіёнам. Дарэчы, перадайце загад Лестраду — сфотаць Бэрымара, слугу, які знайшоў труп сэра Чарлза, і расклеіць плякаты з выявай ягонай пысы па Лёндане. Нам патрэбны галоўны сьведка злачынства ў маёнтку Баскервіляў.

— Холмс, на якога ражна?

— Аднак, якія цудоўныя беляшы гатуе місіс Хадсан, — сказаў суразмоўца, відавочна саскокваючы з тэмы.

Я пабачыў Холмса толькі наступнай раніцай за брэкфастам.

— Што пішуць газэты, Ватсан? — традыцыйна запытаў ён.

Я разгарнуў «Таймз».

— Значыцца, Лестрад кажа, што шукае сабаку ў кантакце з спэцслужбамі пяці дзяржаваў і аднаго вольнага гораду — Трыест; у псыхушку «Бэдлам» дастаўлены новы пацыент, які ўвесь час сьмяецца; «Чэлсі» зьліў «Арсэналу»…

Холмс падскочыў:

— Тэрмінова інфармуйце Лестрада, каб ён арыштаваў халерыка, зрабіце ў ягоператрус. Гарантую, сабака там!

Праз пару гадзінаў Лестрад і я вярнуліся на Бэйкер Стрыт.

— Холмс, вы геній! — з парогу зароў я. — Усё, як вы казалі! Як вы здагадаліся, што сэра Чарлза забіў менавіта гэты шыз?

Холмс пацепаў плячыма:

— Элемэнтарна, Ватсан! Задача сьледзтва заключалася ў тым, каб увесь час рабіць нейкія ідыёцкія хады. Кожны з такіх крокаў выклікаў у злачынцы прыступ сьмеху і паступовы псыхічны разлад. Як толькі на базе пэрманэнтнага хі-хі ў яго канчаткова паехаў дах — ён сябе выдаў. Усё, што нам заставалася, — толькі ўзяць яго. Дарэчы, ніхто ня бачыў маёй скрыпкі?

## КАЛІ Б…

**…было зразуметае літаральна паведамленьне «Саўбелкі», што спаборніцтвы камбайнёраў набываюць сапраўдны спартовы дух.**




**Крык з галаўной машыны:**
Ёлуп! Не забудзься тэкст,
які трэба напісаць, —
«Саўгас «Гарадзец» —
усім супернікам капец».

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Аляксея Шэіна** віншуем зь вясельлем! З самымі найлепшымі зычэньнямі. Сябры і паплечнікі.

### КАНТАКТЫ

**Штосуботу** беларускамоўная грамада зьбіраецца піць піва ад 18 гадзіны ў піўбары «Аліварыя», што на вуліцы Багдановіча

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Марока.** На поўдзень ад нашай Эўропы ляжыць вялікі край — Афрыка. Гэту Афрыку эўрапейскія гасударствы даўно разьдзялілі між сабою па кавалку. Буры, каторых Англія нядаўна заваявала, жывуць на самым поўдні Афрыкі. У Афрыцы жывуць найбольш негры (чорныя людзі), арабы і іншыя народы. Прыродныя афрыканскія людзі маюць усяго два гасударствы, яшчэ не забраныя эўрапейцамі: Абісінію і Марока.

У Марока робяцца ўсё розныя разрухі. Францыя, Гішпанія, Італія, Германія даўно прыцэльваюцца на гэты багаты край. Гадоў два таму чуць вайна не паднялася меж гэтымі царствамі. Тагды яны згаварыліся меж сабой, каторому гасударству можна далей лапу засунуць у Марока. Але арабы — народ вольны і дзікі, ды яшчэ часта ў іх бываюць бунты ўсялякія. Усе яны ня любяць эўрапейцаў, што залезьлі ў іх край і гаспадарыць там, дый часам нападаюць на эўрапейцаў. А яшчэ султан (цар тамтэйшы) сілы ня мае і дае свой саглас на ўсё, чаго ў яго эўрапейскія гасударствы трэбуюць. І за гэта народ ідзе і проці султана. Вось неякі разбойнік, Райсулі, сабраў пад сабой усіх недавольных з султана, і нядаўна яны напалі на эўрапейцаў у гор. Казанбланка, перабілі трохі і зрабавалі дабро. Францыя і Гішпанія прыслалі ваенныя караблі з гарматамі і салдатаў: стрэламі з гарматаў разгрocc… 

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бляку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

## Дзякуй!

**Уладзімеру Л., Пятру Б., Тамары Ф., Валер'ю Б., Мікалаю Б.** зь Берасьця.
**Андрэю С., Г.А., Анатолю Б., Алене С., Віктару А., Вячаславу Р., А.К., А.К.** з Магілёва.
**Сяргею С.** зь Мёрскага раёну.
**Сяргею І., Мікалаю Х., Алене Б., Анатолю Л., З.Ж.** з Гомеля.
**Леаніду Я., Іне П., Натальлі І.** з Пухавіцкага раёну.
**Аксане Д., Аляксандру А.** зь Пінскага раёну.

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.08.2008.
Замова № 4263.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.